Ф.Д. КЛІМЧУК

ПА ВОРКІ

заходняга

ПА ЛЕСЯ

АКАДЭМІЯ НАВУК БЕЛАРУСКАЙ ССР
Інстытут мовазнаўства імя Якуба Коласа

Ф. Д. КЛІМЧУК

ГАВОРКІ ЗАХОДНЯГА ПАЛЕССЯ

ФАНЕТЫЧНЫ НАРЫС

Мінск
«Навука і тэхніка»
1983

ББК 81.2 Бел
К49

Рэдактар

М. І. Талстой, доктар філалагічных навук

Рэцэнзенты:

А. І. Жураўскі, доктар філалагічных навук,
М. В. Піканчук, доктар філалагічных навук,
В. Б. Хацкевіч, кандыдат філалагічных навук

Клімчук Ф. Д.

К 49 Гаворкі Заходняга Палесся: Фанетычны нарыс.— Мн.: Навука і тэхніка, 1983.— 128 с.

80 к.

У манаграфіі разглядаецца групоўка гаворак Брэсцка-Пінскага Палесся. Аналізуецца фанетычная структура гаворак чатырох асноўных тыпаў, распаўсюджаных у гэтай зоне. Разглядаюцца таксама некаторыя пытанні фарміравання асобных груп брэсцка-пінскіх (загародскіх) гаворак і іх сувязей з іншымі славянскімі дыялектамі.

Разлічана на лінгвістаў, гісторыкаў, этнографаў, настаўнікаў сярэдніх школ.

К $\frac{4602010000-096}{М316-83}$ 112—83 ББК 81.2 Бел

© Выдавецтва «Навука і тэхніка», 1983.

УСТУП

Асноўная мэта працы — даць аналіз фанетыка-фаналагічнай сістэмы гаворак Заходняга Палесся. Гэта назва ў лінгвістычнай і археалагічнай літаратуры ўжываецца прымяняльна да тэрыторыі, якая абмяжоўваецца рэкамі Ясельдай, участкам Прыпяці ад вусця Ясельды да вусця Гарыні і Гарынню. У межах Брэсцкай вобласці гэтай тэрыторыі ў агульных рысах адпавядае арэал дыялектнай групы, якая характарызуецца пэўным адзінствам. Называюць гэту групу розныя даследчыкі па-рознаму: гаворкі палескія (84, *76—82, 100—103;* 67, *181—182,* карты *71—75*), заходнепалескія (65), брэсцка-пінскія (16; 67, *252—259*), брэсцкія (76, *87—102*). Мы будзем карыстацца тэрмінам загародскія гаворкі. Ён мае непасрэдныя адносіны да назваў, якія звязаны з тэрыторыяй пашырэння даследуемых гаворак: Загароддзе — прыўзнятая раўніна паміж Пінскам і Антопалем; загародцы — этнаграфічная група ў Брэсцка-Пінскім Палессі (159); этнаграфічнае Загароддзе — тэрыторыя гэтай групы (паміж Брэстам і пізоўямі Гарыні); Пагост Загародскі — вёска ў Пінскім раёне (былое мястэчка); колішні Загародскі шлях — дарога па лініі Кобрын, Хомск, Моталь, Пінск. Мы аддаем перавагу гэтаму тэрміну і па чыста практычных меркаваннях: ад прыметніка *загародскі* зручна ўтвараць назвы тыпу сярэднезагародскія гаворкі, заходнезагародская дыялектная зона і інш.

Усю палескую частку Брэсцкай вобласці, у тым ліку Заходняе Палессе, уключае ў сябе вобласць, якая ў літаратуры агрымала назву Брэсцка-Пінскае Палессе. На поўначы яно абмяжоўваецца вярхоўямі р. Нарава, Выганаўскім возерам і сярэднім цячэннем р. Лані. У межах Брэсцка-Пінскага Палесся знаходзяцца арэалы загарод-

скіх і паўночнабрэсцкіх гаворак і, акрамя таго, пераходныя паміж імі дыялектныя адзінкі.

У навуковай літаратуры пакуль што адсутнічае агульнапрынятая класіфікацыя гаворак Заходняга Палесся, не вызначаны межы асобных груп. Таму першы раздзел працы прысвечан класіфікацыі гаворак вывучаемай зоны. А паколькі Заходняе Палессе — частка Брэсцка-Пінскага Палесся, то разглядаюцца гаворкі ўсяго Брэсцка-Пінскага Палесся. У наступных двух раздзелах аналізуюцца асобныя групы гаворак толькі Заходняга Палесся. Такім чынам, класіфікацыя гаворак Брэсцка-Пінскага Палесся, з аднаго боку, уяўляе сабой самастойную мэту, а з другога — з'яўляецца зыходным пунктам для далейшых даследаванняў.

Акрамя друкаваных прац, намі выкарыстаны рукапісныя матэрыялы «Дыялекталагічнага атласа беларускай мовы» (ДАБМ), магнітафонныя запісы, зробленыя ў 1971 г. аўтарам і В. М. Чэкманам у вв. Заяленне, Папіна, Сіманавічы і Субаты Драгічынскага раёна, а таксама ўласныя запісы, сабраныя па невялікай праграме, якая ўключае некаторыя рэлевантныя асаблівасці асобных тыпаў і груп даследуемых гаворак, у 50—70-я гады больш чым у 500 населеных пунктах Брэсцка-Пінскага Палесся. У Драгічынскім раёне па гэтай праграме намі было абследавана каля 150 населеных пунктаў, у Пінскім — каля 70, Бярозаўскім — каля 60, Кобрынскім і Столінскім — па 50, Іванаўскім і Камянецкім — па 40, Брэсцкім — каля 30, Жабінкаўскім, Івацэвіцкім і Лунінецкім — па 15, Маларыцкім і Пружанскім — па 5, Ганцавіцкім — 2.

У данай працы карыстаемся транскрыпцыяй, прынятай для ДАБМ, з некаторымі дапаўненнямі ці зменамі. Галосны верхняга пад'ёму пярэдняга рада вузкі, звычайны, і кароткі ненаціскны (в. Субаты) абазначаем праз *і*, звужанае націскное *е* (<*і, ы*) (в. Субаты, у тэкстах вв. Акропна і Парэ) — праз *е*, галосны *а* з адценнем *е* (*е*<*е, ь*) (в. Парэ, тэксты) — праз *а*, ненаціскное *ы* (<*е, ь, ѣ*) з адценнем *е* (в. Папіна, у тэкстах вв. Агароднікі Падбельскія і Відзібар) — праз *ы*, ненаціскное закрытае *о* (вв. Агароднікі Падбельскія і Відзібар, тэксты) — праз *о*, кароткі рэдуцыраваны галосны невыразнага тэмбру — праз *ъ*, губна-губны зычны, які адпавядае гуку *ў* у літаратурнай мове (вв. Папіна, Субаты, у тэкстах вв. Відзібар, Рухча) — праз *в*, змычна-фрыкатыўны пярэднеязычны звонкі — праз *дз*, змычна-фрыкатыўны паднябенны звонкі — праз *дж*, фарынгальны звонкі — праз *г*. Гукі, якія па сваіх артыкуляцыйных і акустычных якасцях займаюць сярэдняе, прамежкавае становішча паміж пэўнымі двума гукамі, абазначаюцца дзвюма адпаведнымі літарамі: *е(і)* — гук сярэдні паміж *е* і *і*, але бліжэйшы да *е*; *а (е)* — гук сярэдні паміж *а* і *е*, бліжэйшы да *а*; *і (ю)* (умлаут) — гук сярэдні паміж *і* і *ю*, але бліжэйшы да *і* і г. д. Факультатыўная мяккасць абазначаецца значком мяккасці ў дужках.

У тэкстах замест спалучэнняў *й* з галоснымі, а таксама для абазначэння мяккасці зычных ужываюцца літары *е, ё, і, ь, ю, я*, а галосны *і* пасля цвёрдых зычных абазначаецца праз *и*.

Лінгвістычнае даследаванне Брэсцка-Пінскага Палесся пачалося ў другой чвэрці XIX ст. З таго часу і да пачатку XX ст. апублікавана значная колькасць сабраных тут фальклорных і этнаграфічных матэрыялаў (12; 13; 15; 24; 30; 31; 41; 58; 99; 100; 125; 137; 138; 143; 145; 175; 176 і інш.). Гэтыя публікацыі даюць багаты дыялектны матэрыял, у некаторых з іх ёсць дадаткі, дзе характарызуюцца мясцовыя гаворкі ці разглядаюцца некаторыя іх асаблівасці. Значны ўклад у лінгвістычнае вывучэнне гаворак Брэсцка-Пінскага Палесся ў другой палавіне XIX—першай чвэрці XX ст. унеслі П. А. Баброўскі (9), К. П. Міхальчук (74), Я. Ф. Карскі (49—55), аўтары Маскоўскай дыялекталагічнай камісіі (МДК) (32). Даследавалі гэтыя гаворкі таксама А. Сабалеўскі (108), М. Карпінскі (48), І. Бычкоў (14). Аднак імі абследавана была невялікая колькасць гаворак па даволі абмежаванай праграме.

У 20—30-я гады XX ст. гаворкі Брэсцка-Пінскага Палесся вывучалі Ю. Тарнацкі (170; 171) і Л. Асоўскі (160—164). У аснову прац Л. Асоўскага пакладзена даследаванне фанетычных асаблівасцей. Вучоным абследавана значная колькасць гаворак, пераважна ў паўночна-ўсходняй і ўсходняй частках сучаснай Брэстчыны. Класічнымі з'яўляюцца працы Ю. Тарнацкага, прысвечаныя лінгвагеаграфічнаму даследаванню лексікі гаворак Брэсцка-Пінскага і Валынскага Палесся. Матэрыял збіраўся па даволі густой сетцы (адлегласць паміж абследава-

нымі пунктамі складала прыблізна 20 км) і вялікай праграме.

Шмат увагі надавалася вывучэнню гаворак гэтай зоны пры збіранні матэрыялаў для ДАБМ (абследавана 130 пунктаў), «Агульнаславянскага лінгвістычнага атласа» (АЛА) (11 пунктаў), «Лексічнага атласа беларускіх народных гаворак» (ЛАБНГ) (23 пункты), «Діалектологічного атласу української мови» (ДАУМ) (35 пунктаў), а таксама ў час палескіх экспедыцый 1962—1965 гг., арганізаваных Інстытутам славяназнаўства АН СССР і Інстытутам мовазнаўства імя Якуба Коласа АН БССР (ІМ) (30 пунктаў асноўных і 145 дадатковых).

Матэрыялы экспедыцый яшчэ раз падкрэсліваюць своеасаблівасць гэтай зоны. Спецыфічнасць гаворак асноўнай часткі Брэсцка-Пінскага Палесся (загародскіх гаворак) у адносінах да астатніх гаворак БССР, наяўнасць у іх значнай колькасці агульных асаблівасцей і, з другога боку, вялікую іх разнастайнасць паказаў ДАБМ (33). Існаванне пучка ізаглос, які раздзяляе загародскія і валынска-палескія гаворкі, паказаў другі том ДАУМ (29). Многія даследчыкі адзначылі адрозненні ўнутры загародскага дыялектнага кантыніума (7; 8; 16; 18; 72; 84; 108), выдзелілі ў ім пучкі ізаглос і асобныя дыялектныя групы (21; 67; 74; 80; 112; 170; 171).

Спецыяльнаму вывучэнню гаворак асобных рэгіёнаў даследуемай вобласці прысвечаны працы Д. С. Целянцюка па лунінецкіх гаворках (110; 121) і І. І. Зянько па гаворках пружанскіх (43). Даследаваліся гэтыя гаворкі і ў іншых працах (5; 6; 19; 26; 36; 42; 66; 75; 81—83; 106; 107; 120; 126). Але ў цэлым праблема класіфікацыі (групоўкі) гаворак Брэсцка-Пінскага Палесся заставалася канчаткова не вырашанай. У данай працы на падставе ўсіх наяўных крыніц і з улікам папярэдніх варыянтаў дыялектнага чляненння вывучаемай зоны робіцца спроба агульнай класіфікацыі загародскіх гаворак.

АРЭАЛЬНАЯ ХАРАКТАРЫСТЫКА І ГРУПОЎКА ГАВОРАК БРЭСЦКА-ПІНСКАГА ПАЛЕССЯ

Дзяленне гаворак Брэсцка-Пінскага Палесся на паўночныя і паўднёвыя з'яўляецца традыцыйным (9; 16; 32; 49; 54; 55; 67; 74; 160—164; 170 і інш.). Як асобная група паўднёвая іх частка ўпершыню вылучана аўтарамі «Нарысаў па беларускай дыялекталогіі» (НБД) (84); паўночная — Н. Т. Вайтовіч (16). У паўднёвай частцы распаўсюджаны загародскія гаворкі. Гаворкі паўночнай часткі Брэсцка-Пінскага Палесся ў навуковай літаратуры атрымалі назву паўночнабрэсцкіх (16).

Граніца паўночнабрэсцкіх гаворак на поўначы выразна акрэсліваецца пучком ізаглос (33, карты *1—13, 16, 50, 53, 63, 71, 87, 133, 156, 173, 255* і інш.; 67, карты *8—10, 26, 27, 64* і інш.; 135, карта *123;* 148; 149; 151, *113—115, 130—139*). Існаванне яе пацвярджалася многімі даследчыкамі, якія разглядалі праблему групоўкі гаворак паўднёвага захаду Беларусі. К. П. Міхальчук (74), аўтары МДК (32), М. В. Бірыла (8, *187—189*) праводзілі па ёй участак граніцы ўласна беларускіх гаворак з гаворкамі пераходнымі беларуска-ўкраінскімі, П. М. Гапановіч і Ю. Ф. Мацкевіч (23, карты *2, 4*) — частку граніцы паўднёвай групы паўднёва-заходніх беларускіх гаворак, аўтары працы «Лінгвістычная геаграфія і групоўка беларускіх гаворак» (ЛГГБГ) (67, карты *73, 74, 77, 78*) — часткі граніц, якія акрэсліваюць гаворкі паўночна-заходняй і сярэдняй зон.

Паўднёвая граніца паўночнабрэсцкіх гаворак акрэсліваецца дзвюма фанетычнымі ізаглосамі: паслядоўнай мяккасцю зычных *дз'* (<*д'*), *ц'* (<*т'*), *з'*, *с'*, *н'* перад этымалагічным *е* і паслядоўным пераходам мяккіх (і паўмяккіх) *д'*, *т'*>*дз'*, *ц'* (33, карты *5, 15, 16, 55—57, 86, 150*; матэрыялы ДАБМ; 43, *145—151;* 110, *52—59*).

Усходняя граніца паўночнабрэсцкіх гаворак невыразная. Умоўна яе можна правесці на ўсход ад Лунінца (67, карты *8, 9, 13, 16, 24, 32, 34, 35, 65, 66, 68, 73, 79, 80*). Паўночнабрэсцкія гаворкі па фанетычных асаблівасцях вельмі блізкія да гаворак заходнегомельскіх. Таму небеспадстаўна некаторыя даследчыкі аб'ядноўваюць іх у адну палескую ці паўднёвую групу паўднёва-заходніх беларускіх гаворак (22, *93—95*; 23, *41—44*, карта).

Паўночнабрэсцкія гаворкі распаўсюджаны і ў ПНР (у Белавежскай і Нараўкаўскай гмінах Беластоцкага ваяводства).

Асноўныя фанетычныя асаблівасці паўночнабрэсцкіх гаворак наступныя: 1. Паслядоўнае оканне. Выключэнне складае паўночны захад Пружанскага раёна. 2. Пераважнае захаванне этымалагічнага *е*(<*е, ь*) у ненаціскным становішчы. 3. Пераважае рэфлекс *ѣ*>*е* ў ненаціскным становішчы. 4. Для многіх гаворак характэрны рэфлексы *ѣ*>*а*, *е*(<*е, ь*)>*а* пасля губных у пераднаціскным становішчы з ацвярдзеннем папярэдняга зычнага: *машóк* 'мяшок', *васнá* 'вясна', *вадрó* 'вядро', *бадá* 'бяда'. 5. На месцы *ѣ* ў націскным становішчы пераважна ўжываецца *е* закрытае, радзей *е*, вельмі рэдка *іе*. 6. На месцы *о* ў новых націскных закрытых складах пераважна выступае *о* закрытае, радзей *о*, рэдка *у*, *уо*. У раёне Целяхан у гэтай пазіцыі ўжываецца *е: кен', вел, бек, стел* (134). 7. Паслядоўнае цеканне-дзеканне. 8. Перад этымалагічным *і* зычныя мяккія, акрамя шыпячых, *ц, р*. 9. Спалучэнням *гы, кы, хы* адпавядаюць спалучэнні *г'і, к'і, х'і*, у некаторых гаворках на паўднёвым усходзе Лунінецкага раёна сустракаюцца спалучэнні *гі, кі, хі*. 10. Перад этымалагічным *е* зычныя мяккія, акрамя губных (не ва ўсіх гаворках), шыпячых, *ц, р*. 11. Пратэтычны *в* у займенніках 3-й асобы *вон, вонá, вонó, воны*. 12. Саканне: *наéўса, умыўса, умыласа*. 13. Неазначальная форма дзеяслова на *ц'і: ходз'іц'і, нос'іц'і* (не ва ўсіх гаворках).

Паўночная, усходняя і паўночна-заходняя мяжа загародскіх гаворак таксама акрэсліваецца пучком ізаглос (33, карты *5, 6, 15, 18, 23, 34, 35, 40, 51, 52, 56, 65, 67, 76, 111, 118—120, 127, 128, 141, 170* і інш.; 67, карта *6;* 29, карты *29, 51, 52;* 135, карта *123;* 149; 151, *113—115, 130—139*). Многія ізаглосы набліжаюцца да паўночнай і ўсходняй граніцы гэтага пучка, зрэдку адхіляючыся ад

яго (33, карты *7, 25, 29, 42, 55, 57, 66, 77, 79, 85, 135, 137, 150, 171, 226, 235, 252, 258, 278, 288* і інш.; 67, карты *1, 2, 4, 5, 7, 8, 64* і інш.). Шэраг пучкоў ізаглос праходзіць прыкладна па ўсходняй граніцы загародскіх гаворак (67, карты *13, 24, 32, 34, 68* і інш.). Аднак галоўнымі фанетычнымі рысамі, якія выразна акрэсліваюць загародскія гаворкі з поўначы, усходу і паўночнага захаду, з'яўляюцца наступныя: 1. Рэфлекс націскнога *ѣ*>*і*: *л'іс, с'іно, на ноз'і, поб'іг*. 2. Рэфлекс націскнога *о* ў новых закрытых складах > *і, у, ы, і(ю): в'ін, б'іл'ш, стіл, ніс, вун, бул'ш, стул, нус, вын, был'ш, стыл, ныс, в'і(ю)н, б'і(ю)л'ш, сті(ю)л, ні(ю)с*. 3. Нейтралізацыя пераднаціскных *е*(<*е, ь, ѣ*), *ы*(<*і, ы*) у гуку *ы* або *ы(е): высна́, нымá, быдá, тыпéр, дын'óк, мыдóк, бычóк, дывы́тыс'*. 4. Цвёрдасць губных і пярэднеязычных перад рэфлексамі этымалагічных *е, і: бéрог, вéчор, ден', вызé, ходы́ты, носы́ты, зымá, сы́ла*. 5. Адсутнасць цекання-дзекання: *д'ід, т'іло, хóд'ят', т'áшко*.

Паўночная і ўсходняя граніца загародскіх гаворак праходзіць па паўночных украінах Камянецкага, паўднёвым захадзе Пружанскага (на поўдзень ад Шарашова, на поўнач ад Гарадзечны) раёнаў, затым па мяжы Пружанскага з Кобрынскім, у Бярозаўскім на поўнач ад Борак, Машковіч (на поўнач ад Міжлесся-Лёўкавіч), Перасудавіч, Белаазёрска, Старых Песак, далей па граніцы Іванаўскага раёна з Івацэвіцкім, па паўночных і паўночна-ўсходніх украінах Пінскага (на поўнач ад Лагішына, Пласкіні, Церабені), па паўднёва-заходніх украінах Лунінецкага (на ўсход ад Багданаўкі і Лоўчы), у Столінскім раёне на ўсход ад Дубая, на захад ад г. Століна. Гэта мяжа з нязначнымі адхіленнямі адзначалася Л. Асоўскім як мяжа беларускай і ўкраінскай моў у Заходнім Палессі (179; 180), аўтарамі НБД і ЛГГБГ як граніца паміж палескімі і асноўным масівам беларускіх гаворак (67, карты *71, 75*; 84, *383—386*), Н. Т. Вайтовіч як мяжа брэсцка-пінскіх гаворак (16).

З захаду, у межах ПНР на граніцы з Брэсцкай вобласцю, загародскія гаворкі абмежаваны лініяй Вітова, Клешчэле, Німіраў, Янаў Падляскі, на захад ад Ракітна, Тучны, Ганны і Уладавы. Паўднёвая мяжа загародскіх гаворак будзе разгледжана некалькі ніжэй.

Існуюць гаворкі пераходныя паміж загародскімі і паўночнабрэсцкімі. Умоўна назавём іх сярэднебрэсцкімі.

Яны ўтвараюць некалькі невялікіх груп: гаворкі верхняясельдскія, малецкія, паўднёвацеляханскія, паўночналагішынскія, бобрыкскія, лунінскія, беражноўскія, сярэднепагарынскія. Гэтыя гаворкі Я. Ф. Карскі адносіў да ўкраінскіх (акрамя лунінскіх), Л. Асоўскі — да беларускіх (акрамя малецкіх і паўночналагішынскіх).

Верхняясельдскія гаворкі распаўсюджаны ў цэнтры і на поўначы Бярозаўскага, у цэнтры і на ўсходзе Пружанскага раёнаў. Паводле ДАБМ, яны вызначаюцца вельмі выразна, як асобная дыялектная адзінка (33, карты *5, 16, 19, 34, 35, 52, 55—57, 141, 159, 160, 230, 247, 263, 264, 281* і інш.). Тыповыя асаблівасці верхняясельдскіх гаворак: 1. На месцы націскнога *ѣ* вымаўляецца *іе* (*хліеб, сіено*), у некаторых гаворках — *е* закрытае: *хл'е(і)б, с'е́(і)но*. 2. На месцы націскнога *о* ў новых закрытых складах вымаўляецца *уо*: *вуон, муой, куон'*, у некаторых гаворках — *о* закрытае: *во(у)н, мо(у)й, ко(у)н'*. 3. Перад этымалагічным *е* зычныя *б, в, м, п, д, т, з, с, н* цвёрдыя, *л'* мяккі: *бе́рог, змерз, пе́ршы, ден', те́плы, везе́, село́, нема́, ал'е́*. 4. Перад этымалагічным *і* зычныя губныя, заднеязычныя, *дз', ц', з', с', н', л'* мяккія: *с'ін'і, з'іма́, ходз'іц'і, л'іхо, б'іці, гурк'і*. 5. Мяккія *д', т'* пераходзяць у *дз', ц'*: *ходз'іц'і, несу́ц'*.

Малецкія гаворкі характэрны для населеных пунктаў Малецкага і Сігневіцкага сельсаветаў Бярозаўскага раёна (43, *145—158;* 33, населены пункт *687*). Па класіфікацыі І. І. Зянько — гэта другая група гаворак Пружанскага раёна (раней Малецкі сельсавет уваходзіў у Пружанскі раён). Характэрныя асаблівасці малецкіх гаворак наступныя: 1. На месцы націскнога *ѣ* выступае *іе*, часам *е* закрытае. 2. На месцы націскнога *о* ў новых закрытых складах выступае *уо*, часам *о* закрытае. 3. Зычныя губныя, а таксама *д, т, з, с, н* перад этымалагічным *е*(<*е, ь*), рэфлексам *і*, ненаціскным *е*(<*ѣ*) цвёрдыя, зычны *л'* мяккі: *робы́ты, ходы́ты, косы́ты, зыма́, возы́л'і, гоны́л'і, везе́, село́, ден', ал'е́*. 4. Цеканне-дзеканне адсутнічае: *д'іед, т'іело, несу́т'*.

Паўднёвацеляханскія гаворкі распаўсюджаны на поўдзень і паўднёвы захад ад Целяхан у раёнах Івацэвіцкім (Коланск, Амяльная, Глінная, Гошча, Турная, Краглевічы, Аброва), Пінскім (Азарычы, Клятная), Бярозаўскім (Рэчыца). Некаторыя з іх даследаваліся Г. У. Арашонкавай (2; 134). Характэрныя асаблівасці паўднёвацеляханскіх гаворак наступныя: 1. На месцы націскнога *ѣ* выступае пераважна *е* закрытае. 2. На месцы націскнога *о* ў новых закрытых складах выступае пераважна *е* або *е* закрытае (*вез, стел, кен'*), у асобных гаворках — *о* (Рэчыца) або *о* закрытае (Аброва). 3. Адзначана звужэнне галоснага *ы* або пераход яго ў *і* пасля губных зычных. 4. Перад *е*(<*е, ь*) і ненаціскным *е*(<*ѣ*) губныя, пярэднеязычныя, акрамя *л*, і заднеязычныя вымаўляюцца цвёрда. У гаворцы в. Клятная ў гэтай пазіцыі зычны *л* таксама цвёрды. 5. Перад *і* вымаўляюцца мякка губныя, пярэдне- і заднеязычныя. Зычныя *д, т, з, с, н* у гаворцы в. Клятная перад *і* цвёрдыя і мяккія (*ход'іты, кос'іты, ма́ты, д'е́(і)ты, прывэзы́, воз'і, т'іхо*), у гаворцы в. Аброва цвёрдыя. Зычны *л* пераважна цвёрды перад *ы(і)* з *і* ў гаворцы в. Клятная: *пошлы́(і), зроб'ілы(і), ход'ілы(і), колы́(і)*, але *нал'іў, л'іпа*. Заднеязычныя цвёрдыя перад *ы(і)* у гаворцы в. Аброва. У мове часткі жыхароў в. Клятная перад *і* губныя зычныя цвёрдыя: *зробіты, ста́вілы(і)*. Пасля цвёрдых зычных галосны *і* пераходзіць у *ы* або *ы(і)*; выключэнне складае пазіцыя пасля губных у гаворцы в. Клятная. 6. Цеканне-дзеканне адсутнічае. Некаторыя носьбіты гаворак вв. Краглевічы і Турная мяккія *д', т'* вымаўляюць з прыгукам *дз', ц'*.

Паўночналагішынскія гаворкі бытуюць на паўночных украінах Пінскага (вв. Хварасно, Валішча, Вулька Лаўская) і прылягаючай частцы Івацэвіцкага (вв. Рэчкі, Рудня) раёнаў (1; 73; 127; 128). Іх характэрныя асаблівасці наступныя (за аснову ўзята гаворка в. Рэчкі): 1. Галосныя *і, ы* зліліся ў адным гуку: *ходіті, сін, сіла, ріба, мі, дім*. 2. На месцы націскнога *ѣ* выступае *е* закрытае. 3. На месцы націскнога *о* ў новых закрытых складах выступае *о* закрытае, радзей *о*. 4. Перад галоснымі *і*(<*і, ы*), *е*(<*е, ь*, ненаціскны *ѣ*) усе зычныя, акрамя *л'*, цвёрдыя. 5. Цеканне-дзеканне адсутнічае: *д'е(і)ті, т'е(і)н'*.

Даследчыкі звычайна адносяць паўднёвацеляханскія і паўночналагішынскія гаворкі да брэсцка-пінскіх (1; 2).

Характэрныя рысы гаворкі в. Бобрык і некаторых суседніх з ёю, размешчаных на паўночным усходзе Пінскага раёна: 1. Аканне ў пераднаціскных складах. 2. Цеканне-дзеканне адсутнічае. 3. Перад *е* вымаўляюцца

мякка пярэднеязычныя, перад *і* — пярэднеязычныя, губныя і заднеязычныя.

Лунінскія гаворкі бытуюць у некаторых вёсках на захад ад Лунінца (33, населеныя пункты *766, 767;* 54, *431*; 110; 121). Іх характэрныя асаблівасці: 1. На месцы націскнога *ѣ* выступае *і*. 2. На месцы націскнога *о* ў новых закрытых складах пад націскам выступае пераважна *ы*. 3. Перад *е*(<*е, ь*, ненацісклы *ѣ*) вымаўляюцца мякка пярэдне- і заднеязычныя, перад *і* — губныя, пярэдне- і заднеязычныя. 4. Цеканне-дзеканне або адсутнічае (Лунін), або аслабленае (Вулька І).

Гаворка в. Беражное Столінскага раёна і некаторыя суседнія з ёй адрозніваюцца ад суседніх заходнетураўскіх гаворак адсутнасцю цекання-дзекання (160).

Сярэднепагарынскія гаворкі распаўсюджаны ў наваколлях г. Століна і на поўдзень ад яго. Да іх адносіцца традыцыйная гаворка г. Століна. Характэрныя рысы сярэднепагарынскіх гаворак: 1. На месцы націскнога *ѣ* вымаўляецца *е* закрытае (Столін, Струга, Малыя Вікаравічы, Варані, Бухлічы) або *і* (Рэчыца, Церабяжоў). 2. На месцы націскнога *о* ў новых закрытых складах вымаўляецца *о* закрытае (Столін, Струга, Малыя Вікаравічы, Варані, Бухлічы) або *у* (Рэчыца, Церабяжоў). 3. Націскны *ы* пасля губных перайшоў у *і*, зычныя перад ім мяккія: *пом'іла, п'іл, по грыб'і*. 4. Перад *е*(<*е, ь*), а таксама ненацісклым *е*(<*ѣ*) зычныя губныя, пярэднеязычныя, акрамя *л'*, цвёрдыя: *беда́, тепе́р, везе́, несе́, село́, пе́ршы, день*. 5. Пярэднеязычныя перад *і* мяккія. 6. Губныя перад этымалагічным *і* ў адных гаворках (Столін, Струга, Малыя Вікаравічы, Рэчыца) мяккія, хоць факультатыўна могуць вымаўляцца цвёрда, у другіх гаворках (Церабяжоў, Бухлічы, Варані) пераважна цвёрдыя. 7. Заднеязычныя перад *і* звычайна мяккія, у некаторых гаворках (Церабяжоў, Бухлічы) цвёрдыя. 8. Цеканне-дзеканне адсутнічае, аднак як факультатыўны варыянт гукаў *д', т'* часам ужываюцца сярэднія гукі паміж *д'* і *дз'*, а таксама паміж *т'* і *ц'* (Столін, Струга). Апошнія (г. зн. гукі сярэднія паміж *д'* і *дз'*, паміж *т'* і *ц'*) пераважаюць у некаторых гаворках (Бухлічы, Варані).

Астраўныя ўсходнеславянскія гаворкі, нераходныя ад загародскіх да паўночнабрэсцкіх, уласна беластоцкіх і холмскіх, распаўсюджаны ў Беластоцкім і Бяла-Падляскім ваяводствах ПНР (135, карта *123*; 146; 149; 151, *113—115, 130—139*). У літаратуры яны атрымалі назву падляшскіх. Сярод іх выдзяляюцца тры групы: 1. Заходнепадляшскія гаворкі. Іх паўночная і заходняя граніца праходзіць на ўсход ад Гайнаўкі, на поўнач ад Нарава і Хработаў, на захад ад Бельска і Семятыч, на ўсход ад Міжрэчча Падляскага, на захад ад Вогіня і Парчава. Усходняя граніца праходзіць на захад ад Гайнаўкі, на поўнач ад Чыжоў, на захад ад Орлі, па ўсход ад Мельніка, на захад ад Канстанцінава, на поўнач і ўсход ад Бялай Падляскі, на ўсход ад Ламазоў і Парчава. Характэрнымі рысамі заходнепадляшскіх гаворак з'яўляюцца цвёрдасць пярэднеязычных перад *е*, мяккасць пярэднеязычных перад этымалагічным *і* і яго рэфлексамі, адсутнасць цекання-дзекання. 2. Чыжоўскія гаворкі (Чыжоўская гміна Беластоцкага ваяводства) адрозніваюцца ад заходнепадляшскіх цвёрдасцю *д, т, н*, а некаторыя таксама *з* і *с* перад *і, іе*. 3. Усходнепадляшскія гаворкі знаходзяцца паміж арэаламі заходнепадляшскіх на захадзе і загародскіх на ўсходзе. Гэту групу гаворак адрозніваe: цвёрдасць пярэднеязычных перад рэфлексамі *е, і;* рэфлекс *ѣ*>*іе* пад націскам; адсутнасць цекання-дзекання.

Найбольш рэлевантныя асаблівасці, на аснове якіх выдзяляюцца сярэднебрэсцкія гаворкі,— гэта цвёрдасць або мяккасць зычных перад этымалагічнымі *е, і* ці іх рэфлексамі і наяўнасць або адсутнасць цекання-дзекання. Па характару дыстрыбуцыі адзначаных рыс сярэднебрэсцкія і падляшскія гаворкі падзяляюцца на чатыры групы (табл. 1).

На поўдні загародскія гаворкі мяжуюць з валынска-палескімі.

Пытанне суадносін гэтых дзвюх дыялектных груп патрабуе спецыяльнага даследавання. Як паказаў другі том ДАУМ, іх раздзяляе пучок ізаглос (29, II, карты *45, 51—53, 57, 64, 76, 97, 104, 163, 193, 207, 209, 210, 216, 229, 290, 299, 303—306, 310, 325, 326, 332, 345, 349, 372, 379*). Важнейшыя асаблівасці загародскіх гаворак, якія адмяжоўваюць іх ад валынска-палескіх, наступныя: 1. Захаванне этымалагічнага *о* ў ненацісклым становішчы (на захад ад Любяшова): *голова́, молоко́*. 2. Пераход *е*>*'о* пад націскам пасля мяккіх і паўмяккіх зычных у значнай колькасці выпадкаў: *с'о́стры, зыл'о́ный*. 3. Суфікс

Табліца 1

Рэфлексы *д, т* перад *е, і (> і, ы)* у сярэднебрэсцкіх і падляшскіх гаворках

№ п/п	Групы гаворак	Перад *е*	Перад *і (>і, ы)*
1	Малецкія, паўночналагішынскія, усходнепадляшскія, чыжоўскія, некаторыя паўднёвацеляханскія (Аброва, Клятная)	*д, т* (*ден'*)	*д, т* (*ходыты, ходіті*)
2	Паўднёвацеляханскія, сярэднепагарынскія, заходнепадляшскія	*д, т* (*ден'*)	*д', т'* (*ход'іт'і*)
3	Верхняясельдскія	*д, т* (*ден'*)	*дз', ц'* (*ходз'іц'і*)
4	Бобрыкскія, лунінскія, беражноўскія	*д', т'* (*д'ен'*)	*д', т'* (*ход'іт'і*)

-ск- (на ўсход ад Любяшова). 4. Часціца *-са* (на ўсход ад Любяшова). 5. Указальныя займеннікі *гетой, гетый, гета, гете, геты, гето.*

Карыстаючыся матэрыяламі другога тома ДАУМ, прывядзём іншыя асаблівасці, якія раздзяляюць загародскія і валынска-палескія гаворкі (спачатку ўказваем тыповую форму для загародскіх гаворак, потым — для валынска-палескіх): *е—а* ў слове *дев'ять; в конц'і — в кунц'і;* на Брэстчыне часта ўжываецца форма *па́робок,* у асноўным адсутнічае слова *ковба́ня; па́мет', па́мит' — па́мн'ат', па́мн'іт'; змерко́м — смерко́м; шво́рінь — сво́рінь; л'о́ген'кий — ле́ген'кий; вовки́, парубки́ — вовк'і, парубк'і;* на Брэстчыне шырокая ўжывальнасць формы займенніка *мн'і; йе́йу — не́йу; до́брий, молоди́й, вишне́вий, широ́кий — до́бри, молоди́, вишне́ви, широ́ки; одина́цить — одина́ньцить; настілник — портови́на, настілниця; го́йдалка — го́йдашка; бич, пу́га — батіг; сошни́к — лиміш; поли́ця — закрій; ди́шель — гра́філь; ужо́вка, вуж, ву́жик — капи́ця; гурковиння — хмили́ння; ботви́ння — нати́ня;* для Брэстчыны характэрны назвы *куреня́, (а)ки́ч(а); кос'-кос' — кс'у-кс'у; близори́кий — здракова́тий; судоси́ти — стріти.*

Гаворкі Радастаўскага сельсавета Драгічынскага і Павіцкага сельсавета Кобрынскага раёнаў гістарычна

адносяцца да паўночных валынска-палескіх. Пры сучасным стане іх умоўна можна аднесці да загародскіх. Фактычна яны ўтвараюць асобную Радастаўскую мікразону, пераходную паміж асноўным загародскім і асноўным валынска-палескім арэаламі. Адзначым галоўныя асаблівасці, што адрозніваюць радастаўскія гаворкі ад гаворак асноўнай часткі Драгічынскага раёна, якія адносяцца да тыповых загародскіх (спачатку адзначаем асаблівасці радастаўскія, потым цэнтральнадрагічынскія): 1. Паслядоўнасць пераходу ненаціскнога *о>у (мулуко́, хо́луд)* — адсутнасць такога пераходу (за пэўнымі выключэннямі). Пераход ненаціскнога *о>у* характэрны для многіх гаворак крайняга паўднёвага захаду Брэсцкай вобласці (33, карты *2, 8, 9, 12*). 2. Адсутнасць нейтралізацыі *е—ы* ў ненаціскных складах (*тепло́, весна́, село́, ду мене́*) — тыповасць такой нейтралізацыі. 3. Захаванне націскнога *е* пасля мяккіх, «паўмяккіх» зычных перад цвёрдымі: *весе́ла, муйі, се́стре, деле́ко, зеле́ны, ле́хко* — тыповасць пераходу *е>о* ў гэтай пазіцыі пасля некаторых зычных: *выс'о́ла, мойі с'о́стры, дал'о́ко, зыл'о́ный, л'о́хко.* У гаворках крайняга захаду Брэстчыны (в. Мыкшыцы Камянецкага раёна) адзначаны больш частыя выпадкі захавання *е* ў данай пазіцыі, чым у большасці драгічынскіх гаворак: *выс'о́ла, дал'о́ко, дышове, зыл'о́ный,* але *се́стры, чытве́ртый, уве́с.* 4. Пераход (непаслядоўны) *о>і* ў закрытых складах не пад націскам, а таксама ў закрытых не новых складах: *шк'іл'на́, ід мене́, ідско́чіла, перех'ід, пор'ім, перег'ін, синок'іс, св'ікор* — адсутнасць такога пераходу (за рэдкімі выключэннямі). 5. Адзначаны выпадкі пераходу *о>ы(і)* у ненаціскных адкрытых складах: *ты(і)бі(ы), ты(і)пі(ы)ро* — адсутнасць такога пераходу. 6. Наяўнасць мадэлі «цвёрды губны + націскны *і(ы)<ѣ*» — пераважна адсутнасць такой мадэлі. 7. Пераход *н'>й: мулуде́йка, ране́йко, бі(ы)лейка, козаче́йко, д'івчіно́йка* — адсутнасць такога пераходу. 8. Пераход *т'>к': к'ітка, к'ітра́д', к'істо, к'іл'ко* — адсутнасць такога пераходу. Выпадкі пераходу *т'>к'* заўважаны ў гаворках заходняй часткі Камянецкага раёна (в. Мыкшыцы: *к'ітра́д', т'істо* і *к'істо*). 9. Адсутнасць падваення зычных у флексіях назоўнікаў ніякага роду адпаведна даўняму *-ье: вес'іл'е, нас'ін'е, кло́че* — нетыповасць такой з'явы. 10. Форма назоўнікаў роднага склону множнага ліку на

-ів, -ов: бабі(ы)в, весел'ів, верстóв — адпаведна формы *баб, бабéй, выс'іл'л'éй, в'орст, в'óрстей.* На захадзе Брэстчыны, у в. Мыкшыцы Камянецкага раёна, адзначаны формы: *турб'ів, баб'ів, выс'іл'ів.* 11. Формы прыметнікаў мужчынскага роду назоўнага склону адзіночнага ліку без *-й: залéны(і), дубóвы(і), весéлы(і)* — формы прыметнікаў з канчаткам *-й: зыл'óный, дубóвый, выс'óлый* (у тараканскіх гаворках *зіл'óні(ы), дубóві(ы), ві(ы)с'óлі(ы)).* 12. Указальныя займеннікі *сте, стой, ста, сты(і)* — указальныя займеннікі *гето, гете, гетой, гета, геты* (у тараканскіх гаворках *гáто, гáте, гáтой, гáта, гáте*). На крайнім паўднёвым захадзе Брэстчыны (раён Дамачова, Маларыты, Дывіна) і ў заходняй частцы Камянецкага раёна (раён Высокага) адсутнічаюць указальныя займеннікі *гето, гетой, гета* і інш., адпаведна ім ужываюцца *ц'іто, ц'ітый, ц'іта, ц'іте, ц'іты* або *с'іто, с'ітый, с'іта, с'іте, с'іты,* радзей *с'ой, с'áйа, с'óйе* або *той, тáйа, тóйе, тыйі* (33, карта *49;* матэрыялы ДАБМ і інш.). 13. Ненаціскны *е* пасля *й: пóйезд, ду йейі, пытáйете, выгрывáйец'ц'а* — адпаведна галосны *і: пóйізд, до йійі, пытáйіте, выгрывáйіц'ц'а.* 14. Адзначаны выпадкі пераходу *а>е* ў ненаціскным становішчы пасля цвёрдых зычных: *делéко* — адсутнасць такога пераходу: *дал'óко.* 15. Спарадычны пераход *е>а* не пад націскам: *Стапáн, тапло́, залéны(і)* — адсутнасць такога пераходу. 16. Пераход *й, л>н', н: жеребн'é, дремн'ý, дрéмне* — адсутнасць такога пераходу. 17. Адпадзенне пачатковых галосных або пераход *о>в: краз, дногó, селéнце, дмы(і)нéле, Крайіна, Лекс'ій, вгон', вслеп, вр'іхе* — адпаведна *йакрáз, одногó, осылéнц'і, одмыны́лы, Украйіна, Олыкс'ій, огóн', осл'óп, (г)ор'іхы.* 18. Пераважае пратэтычны *в: вóзеро, вóче, вýлы(і)ц'а* — пераважае пратэтычны *г: гóзыро, гóчы, гýлыц'а* (у тараканскіх гаворках *гóзіро, гóче,* але *вýліца*). 19. Канчатак назоўнікаў жаночага роду адзіночнага ліку ў творным склоне *-ейу: лóшкейу, дурóгейу, хáтейу, вы́(і)шн'ейу* — адпаведна канчаткі *-ыйу, -ійу: лóшкыйу, хáтыйу, вы́шн'ійу.* 20. Канчатак назоўнікаў множнага ліку месцага склону *-ох: у грýд'ох, пры л'ýд'ох* (такі канчатак пашыраны на захадзе Брэстчыны) — адпаведна канчатак *-ух: в грýд'ух, пры л'ýд'ух.* 21. Клічная форма тыпу *Зо* (ад *Зóс'а*), *Ры(і)гó* (ад *Ры(і)г'ір*), *Івá* (ад *Івáн*) — іншы тып клічнай формы. 22. Ненаціскны канчатак прыметнікаў жаночага роду адзіночнага ліку ў родным склоне *-ейі*, у творным склоне *-ейу: бі(ы)лейі, бі(ы)лейу, хурóшейі, хурóшейу*— адпаведна канчаткі *-ыйі, -ыйу: б'ілыйі, б'ілыйу, хорóшыйі, хорóшыйу.* 23. Адпадзенне *-й* у канчатку прыметнікаў жаночага роду адзіночнага ліку ў творным склоне: *в бі(ы)лы(і) йýпце, в нóвы(і) хáте* — захаванне *-й* у данай пазіцыі. 24. Форма на *-ут'* дзеясловаў трэцяй асобы множнага ліку II спражэння: *бул'ýт' зýбе, лежýт' вр'іхе, вунé буйýц'ц'а* — адпаведна формы дзеясловаў на *-ат', -ет': бол'áт' (бол'éт') зýбы, лыжáт' (лыж'áт', лыж'éт') гор'іхы, воны́ бойáц'ц'а (бойéц'ц'а).*

Цяпер адзначым некаторыя лексічныя адрозненні паміж дзвюма даследуемымі дыялектнымі адзінкамі, гаворкамі радастаўскімі (прыклады прыводзім з гаворкі в. Радастава) і цэнтральнадрагічынскімі (прыводзім прыклады з гаворкі в. Сіманавічы): *бýл'ба — картóплл'і; верéтейа — гóстров* 'востраў'; *вкýпы(і) — рáзом* 'разам'; *гýбі(ы) — козлякы́* 'ядомыя грыбы'; *гул'éка — голы́на* 'галіна'; *завéте хýстку — завйазáты хýстку* 'завязаць хустку'; *згадáте — спомытáтыс'* 'успомніць'; *ітсóвате — отсýнуты* 'адсунуць'; *йéдра — гарбýзыкы* 'насенне гарбуза'; *йýпка — кóхта* 'кофта'; *кусáр — косéц'; лепéха — плысн'áк* 'аер'; *л'ітны(і)к' — гандáрак* 'андарак, від спадніцы'; *мак'ітра — вéрт'ага* 'вялікая гліняная міска'; *мóгы(і)лке — мóлыц'і* 'могілкі'; *мулудéц' — жыны́х* 'нежанаты малады чалавек'; *пал'óшке — галушкы́* 'галушкі'; *пéрез — кы́рыз, чы́рыз* 'цераз, праз'; *пудпáлок' — бл'ін, млынец'* 'бліп'; *рабýшок'— швóраб* 'верабей'; *руздвó — кóл'ады; сóсна — хвойіна* 'сасна'; *стéрн'а — пы́жн'а* 'іржышча'; *струлéчны(і)к' — слонéчнык* 'сланечнік'; *стрýпчы(і)к'—ляшóк* 'малая ўкладка снапоў у полі'; *стыдáтыс'—сорóмытыс'; т'éте—вы́т'аты* 'ударыць'; *тукмач'і — товчéн'а* 'бульбяная каша'; *хулуднéк' — квáшылына* 'халадзец'; *шанувáте — частовáты* 'частаваць'; *шпáрко — йóмко, вéл'мы (шпáрко хулуднó, шпáрко т'ев — вéл'мы холоднó, йóмко вы́т'ав)* 'моцна, вельмі'; *шпі(е)рка — сáло* 'сала'. Некаторыя з прыведзеных лексем, характэрных для радастаўскай гаворкі, выяўлены ў гаворцы в. Мыкшыцы Камянецкага раёна: *встыдáтыс', гýбы* 'ядомыя грыбы', *гул'áка* 'галіна', *кусáр, мóг'ілк'і, пал'ух'і, руздвó, суснá, шпы́рка.*

Унутранае чляненне загародскіх гаворак разглядалася ў працах К. П. Міхальчука, Ю. Тарнацкага, аўтараў

ЛГГБГ, Т. В. Назаравай, М. І. Талстога і іншых даследчыкаў. К. П. Міхальчук (74) частку загародскіх гаворак (на поўдзень ад лініі Дывін, Драгічын, Моталь, Пінск) адносіў да пінска-валынскага «разноречия» ўкраінска-палескага «поднаречия», другую іх частку (на поўнач і на ўсход ад Пінска) — да чорна-рускага «поднаречия», а гаворкі на захад ад Драгічына і да польскай моўнай тэрыторыі лічыў асобнай дыялектнай адзінкай, уласна падляшскім «разноречием» падляшскага «поднаречия». Аднак К. П. Міхальчук меў матэрыялы ўсяго з некалькіх пунктаў даследуемага намі рэгіёна. Да таго ж яны ўяўлялі сабой або адказы на спецыяльную праграму, параўнальна абмежаваную, або запісы фальклору. Ю. Тарнацкі (170) на тэрыторыі загародскіх гаворак выдзеліў дзве дыялектныя адзінкі, граніца паміж якімі праводзілася па захаду сучаснага Драгічынскага раёна. У адну з гэтых адзінак (усходнюю) уключаны таксама гаворкі раёнаў Пружан, Бярозы, Дубровіцы, Сарн. Лексічны атлас Ю. Тарнацкага ў межах Брэсцка-Пінскага і Валынскага Палесся ўстанаўлівае некалькі пучкоў ізаглос. 1-ы пучок: на захад ад Лунінца і Давыд-Гарадка. Ён аддзяляе гаворкі загародскія і ўсходнія сярэднебрэсцкія ад гаворак усходняга Прыпяцкага Палесся. 2-і пучок: р. Ясельда, р. Прыпяць ад вусця Ясельды да вусця Гарыні, р. Гарынь. Як паказалі пазнейшыя даследаванні, гэты пучок з'яўляецца вельмі важным пры дыялектным чляненні Палесся. 3-і пучок: на захад ад Пружан, Драгічына, Сарн. 4-ы пучок: прыблізна па граніцы сучасных Брэсцкай і Валынскай абласцей, затым на захад ад Уладзімірца Ровенскай вобласці. Гэты пучок прыблізна аддзяляе загародскія гаворкі ад паўночнавалынскіх. 5-ы пучок: на ўсход ад Гайнаўкі, на захад ад Высокага, г. зн. ён прыблізна праходзіць па паўночна-заходняй граніцы ўласна загародскіх гаворак. У ЛГГБГ паказваецца, што некаторыя пучкі ізаглос на тэрыторыі Загароддзя акрэсліваюць пэўныя арэалы або адасабляюць часткі арэала даследуемай дыялектнай адзінкі, аб'ядноўваючы яе з суседнімі дыялектнымі масівамі (67, карты *1—5, 12, 14, 23, 25, 28, 33*). Т. В. Назарава (80) у загародскіх гаворках на аснове ДАБМ і часткова ДАУМ выдзеліла 4 групы: брэсцка-кобрынскую, пінскую, паўднёва-цэнтральную астраўную і гаворкі заходніх ускраін Брэстчыны.

Аўтары прац, у якіх выкарыстаны матэрыялы палескіх экспедыцый 60-х гадоў, устанаўліваюць дзяленне палескага кантыніума на захад ад Дняпра, у першую чаргу на Заходняе і Усходняе Палессе па лініі р. Ясельда, р. Прыпяць ад вусця Ясельды да вусця Гарыні, р. Гарынь (17; 18; 20; 21; 65; 69; 86; 91; 98; 112; 113). Як паказалі лінгвістычныя і археалагічныя даследаванні, гэта граніца мае глыбокія гістарычныя карэнні (Ю. У. Кухарэнка, М. І. Талстой, В. У. Мартынаў і інш.). Шэраг ізалекс адхіляецца на захад або ўсход ад адзначанай мяжы, утвараючы пры гэтым пучкі. М. І. Талстой устанавіў наяўнасць такіх пучкоў па рр. Лань, Случ, Стыр і Убарць (112, *10—11*). Іншыя даследчыкі выявілі пучкі ізалекс, якія адхіляюцца ад граніцы па рр. Ясельдзе, Прыпяці і Гарыні, на захад ад Драгічына, Іванава і па р. Пціч.

Наяўны дыялектны матэрыял, а таксама вопыт папярэдніх даследчыкаў паказваюць, што групоўку загародскіх гаворак нельга вырашыць адназначна. Таму пры разглядзе гэтай праблемы мы будзем карыстацца трыма катэгорыямі адзінак дыялектнага чляненння: дыялектны тып, дыялектная зона і дыялектная мікразона.

На тэрыторыі загародскіх гаворак выдзяляем наступныя мікразоны:

1. Брэсцка-Кобрынская мікразона (33, карты *25, 47, 139, 166, 196, 223, 225, 230, 238, 244, 265, 275, 306* і інш.; 67, карта *3*). Па К. П. Міхальчуку — гэта падляшскае «разноречие», па Ю. Тарнацкаму — заходняя дыялектная група ў межах Брэсцка-Пінскага Палесся або арэал, які знаходзіцца паміж 3, 4 і 5-м пучкамі ізаглос, па Т. В. Назаравай — Брэсцка-Кобрынская група, па ЛГГБГ — Камянецка-Антопальскі пучок. Аўтары прац, у якіх выкарыстаны матэрыялы палескіх экспедыцый 60-х гадоў, праводзяць пучок ізаглос па ўсходняй мяжы гэтай мікразоны.

2. Заходнія ўскраіны Брэстчыны (33, карты *30, 33, 90, 201, 228, 247, 269, 271, 275, 302, 305, 310* і інш.). Па Т. В. Назаравай — гэта асобная група брэсцкіх гаворак.

3. Камянецка-Высокаўская або паўночна-заходняя мікразона (33, карты *156, 254—256, 264, 265, 307, 315, 331* і інш.).

4. Маларыцка-Дамачоўская або паўднёва-заходняя

мікразона (33, карты *47, 62, 82, 242, 243, 247, 268, 278, 283, 296* і інш.).

5. Раён г. Кобрына (33, карты *44, 171, 228, 232, 235, 242, 250, 288, 317* і інш.).

6. Цэнтральнае Загароддзе або Драгічынска-Янаўская мікразона (33, карты *33, 47, 83, 140, 193, 221, 229, 243, 248, 253, 327* і інш.). Яна абмяжоўваецца р. Ясельдай і Дняпроўска-Бугскім каналам і раздзяляецца на мікраарэалы: усходнекобрынскі, драгічынскі і янаўскі. К. П. Міхальчук абмяжоўвае гэтай зонай паўночную частку арэала пінска-валынскага «разноречия». Па Ю. Тарнацкаму, гэта мікразона знаходзіцца ў цэнтры арэала, размешчанага паміж 2-м і 3-м пучкамі ізаглос, прычым з захаду і паўночнага ўсходу яна прыкладна абмяжоўваецца гэтымі пучкамі. Па Т. В. Назаравай, сярэднюю частку гэтай мікразоны займае паўночная частка паўднёва-цэнтральнай групы брэсцкіх гаворак. Паводле прац, у якіх выкарыстаны матэрыялы палескіх экспедыцый 60-х гадоў, гэта мікразона абмяжоўваецца пучкамі ізаглос па рр. Стыр, Ясельдзе, на захад ад Драгічына і раздзяляецца пучком ізаглос, які праходзіць паміж Іванавам і Драгічынам.

7. Драгічынска-Пінска-Столінскі пучок (33, карты *47, 144, 196, 228, 230, 242, 265, 306*). Па Ю. Тарнацкаму — гэта асноўная частка ўсходняй групы гаворак у межах Брэсцка-Пінскага Палесся ці арэал, які з усходу, паўночнага ўсходу і захаду абмежаваны 2-м і 3-м пучкамі ізаглос. Паводле прац, у якіх выкарыстаны матэрыялы экспедыцый 60-х гадоў, гэты пучок ахоплівае тэрыторыю, абмежаваную па ўсходзе вядомай лініяй — р. Ясельда, р. Прыпяць ад вусця Ясельды да вусця Гарыні, р. Гарынь, а на захадзе адным з пучкоў ізаглос.

8. Раён г. Пінска (33, карты *131, 223, 229, 259, 278, 286, 303* і інш.).

9. Паўднёвыя ўкраіны загародскага дыялектнага арэала (33, карты *31, 32, 64, 103, 259, 267, 277, 286* і інш.). Большасцю адзначаных ізаглос разглядаемая мікразона аб'ядноўваецца з гаворкамі Гомельскага Палесся або паўднёвага ўсходу БССР. У гэтых адносінах заслугоўвае ўвагі думка А. А. Крывіцкага аб магчымасці існавання ў мінулым у заходнім напрамку больш шырокага арэала гаворак тыпу заходнегомельскіх (59, *73*).

10. Заходнестолінская або паўднёва-ўсходняя мікразона (33, карты *24, 84, 86—88, 139, 142, 164, 181, 221, 248, 281, 286, 296, 325* і інш.). Па ЛГГБГ (67, карты *2, 4*), яна аддзяляецца ад асноўнага масіву брэсцка-пінскіх гаворак Камянецка-Бярозаўска-Пінскім і Камянецка-Пружанска-Пінскім пучкамі ізаглос. Паводле прац, у якіх выкарыстаны матэрыялы палескіх экспедыцый 60-х гадоў, гэта мікразона абмежавана пучкамі ізаглос па рр. Гарынь і Стыр.

11. Лагішынская або паўночна-ўсходняя мікразона (33, карты *29, 127, 138, 184, 192, 241, 260, 279—281, 304* і інш.). З поўдня яна абмежавана рр. Ясельдай і Прыпяццю, дзе праходзіць пучок ізаглос. Па Ю. Тарнацкаму, гэта мікразона знаходзіцца паміж 1-м і 2-м пучкамі ізаглос.

12. Лагішынска-заходнестолінская мікразона або ўсходнія ўкраіны Загароддзя (33, карты *25, 35, 51, 71—73, 79, 85, 86, 109, 114, 152, 179, 194, 220, 239, 258, 277, 323* і інш.). Большасць асаблівасцей аб'ядноўвае гэту мікразону з гаворкамі, якія распаўсюджаны далей на ўсход. К. П. Міхальчук гэтай мікразонай абмяжоўваў заходнюю частку чорна-рускага «поднаречия». Паводле ЛГГБГ, ад асноўнага масіву загародскіх гаворак яна аддзяляецца Камянецка-Пружанска-Пінскім пучком (67, карта *4*). Т. В. Назарава Лагішынска-заходнестолінскую мікразону і раён г. Пінска аб'ядноўвала ў пінскую групу брэсцкіх гаворак.

13. Радастаўская мікразона (аб ёй гл. вышэй).

Акрамя мікразон і пучкоў ізаглос у арэале загародскіх гаворак вельмі выразна выдзяляюцца дзве дыялектныя зоны: заходнезагародская і ўсходнезагародская (29, II, карты *217, 248, 303, 313;* 33, карты *48, 165, 178, 286, 296, 301, 327;* матэрыялы ДАБМ). Граніца паміж імі праходзіць па заходніх украінах Іванаўскага раёна (на ўсход ад Опаля, Стрэльны, Оўзіч). Прыводзім асноўныя асаблівасці, якія адрозніваюць гаворкі гэтых зон. (Спачатку адзначаецца рыса, якая характэрна для гаворак заходнезагародскай зоны, потым — адпавядаючая ёй рыса гаворак усходнезагародскай зоны): 1. Часціцы *-с'а, -с'— -са, -с, -со: найівс'а, напывс'а, напывс', вмылас'а, вмылас', платылос'— найівса, напывса, напывс, вмыласа, вмылас, платылосо.* 2. Суфікс *-с'к* — суфікс *-ск: бат'ковс'кый, с'іл'с'кый, Пын'с'к — бат'ковскый,*

с'іл'скый, Пынск. 3. Этымалагічны *ц'* у ненаціскных складах і на канцы слоў пераважна захаваў мяккасць — этымалагічны *ц'* у гэтых пазіцыях дыспалаталізаваўся: *гу́лыц'а, рукавы́ц'а, бйе́ц'ц'а, коне́ц', хло́пец'* — *гу́лыца, рукавы́ца, бйе́цца, коне́ц, хло́пец.* 4. Лічэбнік *с'ім* — лічэбнік *сем.* 5. Форма прыметнікаў тыпу *мало́йе, старо́йе, крыво́йе* — прыметнікавая форма *мале́йе, старе́йе, крыве́йе.*

Для выдзялення асноўных дыялектных тыпаў па фанетычных асаблівасцях у межах усяго загародскага рэгіёна мы карысталіся наступным метадам. Спачатку вызначылі асноўныя фанетычныя асаблівасці, якія адрозніваюць даследуемыя гаворкі ў межах асобна ўзятай мікразоны ці яе часткі. Здавалася, што пры гэтым у кожнай мікразоне выдзеліцца яшчэ па некалькі груп гаворак, а дыялектная стракатасць Брэсцка-Пінскага Палесся павялічыцца. Атрымалася, аднак, іншае. Выявілася, што фанетычныя асаблівасці і нават іх комплексы, якія дыферэнцыруюць гаворкі ў асобных мікразонах, у розных частках загародскага арэала паўтараюцца. Намі выяўлены тры комплексы асаблівасцей такога характару і, акрамя таго, яшчэ адзін комплекс, які з'яўляецца пераходным паміж двума іншымі. Гэтым комплексам адпавядаюць чатыры дыялектныя тыпы: гаворкі сярэднезагародскія, паўночна-ўсходнія загародскія, тараканскія і паўднёвазагародскія (апошнія — пераходныя паміж сярэднезагародскімі і тараканскімі; аснова большасці іх сярэднезагародская).

Разгледзім асноўныя фанетычныя асаблівасці выдзеленых тыпаў загародскіх гаворак і вызначым тэрыторыю іх пашырэння.

Сярэднезагародскія гаворкі. 1. На месцы націскнога *о* ў новых закрытых складах выступае пераважна *і*, у цекаторых гаворках *ы* або *і (ю)*. 2. На месцы *ę, 'а* пасля мяккіх зычных пад націскам выступае *'а: з'ат', йа́ма, гл'а́ну, ш'а́пка.* 3. Захоўваецца націскны *ы (<ы, і): ходыв, сын.* 4. Захоўваецца націскны *е (<е, ь): тыпе́р, день, мед.* Выключэнне складаюць разгледжаныя вышэй пераходы *е>о.* 5. У паслянаціскных складах у назоўным склоне пазоўнікаў і лічэбнікаў адзіночнага ліку на месцы *е, ь, ę* выступае *е: хло́пец', па́лец', ка́мен', д'івер, го́сен', де́вет', де́сет'.* У гаворках паўночнага захаду Загароддзя ў данай пазіцыі выступаюць *ы, і* (33, карты *16, 19*). 6. Галосны *і* пасля цвёрдых зычных ужываецца пераважна толькі на месцы *о* пасля *д, т, з, с, н, л* у новых закрытых складах пад націскам: *стіл, ніс, зірно, лій.* 7. У гаворках заходнезагародскай зоны (за нязначнымі выключэннямі) этымалагічны *ц'* пераважна захаваў мяккасць: *рукавы́ц'а, молоды́ц'а, з молоды́ц'ійу, хло́пц'і, па́л'ц'і, рукавы́ц'і, хло́пц'ам, ц'івка, коне́ц', на конц'і.* У гаворках усходнезагародскай зоны і на паўночным захадзе Кобрынскага раёна (вв. Тэўлі, Мацы і інш.) *ц'* захаваў мяккасць толькі ў націскных складах: *ц'івка, на конц'і.* 8. Этымалагічны *р'* захаваў мяккасць у націскных складах перад *і (<ѣ), 'а: пор'ізав, р'ічка, гр'а́дка, пор'а́док.* Перад *а*, аднак, пярэдка ацвярдзеў, асабліва ў радзе гаворак усходняй часткі арэала. 9. У націскных складах перад *а, і (<ѣ, о)* у большасці гаворак заходнезагародскай зоны і Іванаўскага раёна, у некаторых гаворках Пінскага раёна (напрыклад, в. Маладзельчыцы) шыпячыя захавалі мяккасць перад націскнымі *і (<ѣ), 'а.* У іншых гаворках мяккасць шыпячых у данай пазіцыі праяўляецца спарадычна. 10. У заходнезагародскай зоне і часткова ў Іванаўскім раёне зычны *с'* у суфіксе *-с'к* мяккі: *с'іл'с'кый, ба́т'ковс'кый, Хомс'к, Пын'с'к.* У большасці сярэднезагародскіх гаворак усходнезагародскай зоны выступае пераважна суфікс *-ск.* 11. Даўнія спалучэнні *гы, кы, хы* пераважна захаваліся. Выключэнне складаюць многія гаворкі Камянецкага раёна. 12. Заднеязычныя і фарынгальныя перад *е* звычайна цвёрдыя *(до́вге, коро́тке, ты́хе)*, перад *і<о* ў новых закрытых складах пераважна мяккія *(г'ірко, к'іт, тх'ір).*

Сярэднезагародскія гаворкі пашыраны ад Заходняга Буга да заходняй часткі Столінскага раёна. Яны ўключаюць гаворкі вв. Страдзеч, Навасады, Медна на паўднёвым захадзе, вв. Сушыцк, Беражцы, Стахаў, Кораб'е, Плотніца, Рухча, Радчыцк, Фядоры на ўсходзе. Гэтыя гаворкі ўтвараюць некалькі масіваў. Найбольш значныя з іх — брэсцка-камянецка-кобрынскі і пінска-заходнестолінскі. У масіў сярэднезагародскіх гаворак Драгічынскага раёна ўваходзяць традыцыйная гаворка г. Драгічына, вв. Бездзеж, Броннае, Вулька Сіманаўская, Гошава, Дубавое, Дубраўкі, Закляценне, Застаўе, Заточча, Какорыца, Ліпнікі, Місаўцы, Навікі, Пігасы, Равіны, Салава, Саха, Сёманаўшчына, Сіманавічы, Сірэнеўка,

Чарнаполь. Масіў гэтых гаворак у Іванаўскім і на захадзе Пінскага раёна ўключае традыцыйную гаворку г. Іванава, вв. Дастоева, Дружылавічы, Замошша, Застружжа, Ляскавічы, Магільна, Моладава, Моталь, Парэчча, Сакалоўка, Стрэльна, Трыліскі і інш. Сярэднезагародскія гаворкі вв. Бурмакі, Чарнеевічы, Усходы (часткова), Хідры (Драгічынскі раён), Пешкава, Юхнавічы (Іванаўскі раён), Купяцічы (Пінскі раён), Багданаўка (Лунінецкі раён) адносяцца да астраўных. Масіў перасяленскіх загародскіх гаворак у Лунінецкім раёне ўключае вв. Рэдзігерава, Флярава, Перунова, Манасеева, Чарабасава, Барсукова. У іх пераважаюць носьбіты гаворак сярэднезагародскіх.

Паўночна-ўсходнія загародскія гаворкі. 1. На месцы націскнога *о* ў новых закрытых складах выступае *у: муй, кун', вуз, стул, нус.* 2. На месцы націскных *ę, 'а* пасля мяккіх зычных выступае *а: вз'ав, с'аду.* 3. Захоўваецца націскны *ы* (*<ы, і*). Выключэнне складаюць пераходы *ы>і* ў частцы гаворак. 4. Захоўваецца націскны *е* (акрамя разгледжаных вышэй пераходаў *е>о*). 5. У паслянаціскных закрытых складах у назоўным склоне назоўнікаў і лічэбнікаў адзіночнага ліку на месцы *е, ь, ę* выступае *е.* 6. Галосны *ы* (*<ы, і*) пасля цвёрдых шыпячых *ц, р,* заднеязычных у большасці гаворак вымаўляецца звужана, як *ы (і)*, у некаторых гаворках (напрыклад, у Хомску і наваколлях) — як *і* або *і (ы)*, у частцы гаворак (напрыклад, на захад ад Пінска) не адрозніваецца ад *ы* ў пазіцыі пасля іншых зычных. 7. Мяккія шыпячыя, *ц, р* у большасці гаворак паслядоўна ацвярдзелі. У астраўных гаворках Камянецкага, Маларыцкага, Кобрынскага раёнаў захавалі мяккасць: *ц'* — пераважна, шыпячыя і *р'* — перад націскным *і<ѣ.* 8. Зычны *с* у суфіксу *-ск* цвёрды. Выключэнне складаюць астраўныя гаворкі Камянецкага, Маларыцкага і Кобрынскага раёнаў. 9. Заднеязычныя і фарынгальныя перад галоснымі пярэдняга рада ў адных гаворках цвёрдыя (напрыклад, Ставы Камянецкага, Спорава Бярозаўскага, Каўняцін Пінскага, Відзібар Столінскага раёнаў), у другіх цвёрдыя і мяккія (напрыклад, Міжлессе Бярозаўскага, Малоткавічы Пінскага раёнаў), у трэціх мяккія (напрыклад, Заяленне, Хомск Драгічынскага, Гарадзец Кобрынскага, Сошна Пінскага раёнаў).

Асноўны масіў паўночна-ўсходніх загародскіх гаворак знаходзіцца на паўночны захад і поўнач ад Пінска (вв. Астравічы, Бродніца, Вышавічы, Гарадзішча, Дамашыцы, Дубай, Дубнавічы, Жабчыцы, Камень, Каўняцін, Лоўча, Малоткавічы, Пагост Загародскі, Парахонск, Пінкавічы, Плоскінь, Рудск, Ставок, Сташаны, Сухое, Трасцянка, Церабень, Чухава, г. п. Лагішын і інш.). Іншыя масівы размешчаны: на паўночны захад ад г. Століна (вв. Асавая, Асаўцы, Варсынь, Відзібар, Глінка, Дубай, Церабішча і інш.), на поўдні Бярозаўскага (вв. Боркі, Елянова, Здзітава, Лясковічы, Мастыкі, Машковічы, Міжлессе, Нівы, Ніўкі, Перасудавічы, Пескі, Спорава, Судзілавічы, Чарнякова, Шылінок і інш.) і на поўначы Драгічынскага (вв. Жабер, Заяленне, Старамлыны, Хомск і пераходная да сярэднезагародскіх гаворка в. Пярэспа) раёнаў, на паўднёвым захадзе Пружанскага (в. Сасноўка і інш.) і на паўднёвым захадзе Камянецкага (вв. Агароднікі, Воўчын, Вялічкавічы, Дубавое, Кастары, Крынкі, Мачуліша, Навасёлкі, Орля, Сіўкі, Ставы) раёнаў, на ўсходзе Маларыцкага раёна (вв. Высокас, Горы, Замшаны і інш.). Астраўныя гаворкі паўночна-ўсходняга загародскага тыпу: Селішча (Камянецкі раён), Радзеж (Маларыцкі раён), Хадасы (Жабінкаўскі раён), Акцябр, Гарадзец, Грушава, Старая Цемра (Кобрынскі раён), Першамайск (Драгічынскі раён), Каўбы (Пінскі раён).

Тараканскія гаворкі[1]. 1. На месцы націскнога *о* ў новых закрытых складах выступае *і.* 2. На месцы націскных *ę, 'а* пасля мяккіх зычных выступае *е: з'ет', йе́ма, гл'е́ну, ш'е́пка.* 3. На месцы этымалагічных *ы, і* ў націскных і канцавых адкрытых ненаціскных складах выступае *е* звужанае. 4. На месцы *е* (*<е, ь*) у націскных складах пасля цвёрдых зычных выступае *а: тіпа́р, дан', мад, два́ре* ('цяпер, дзень, мёд, дзверы'). У некаторых гаворках (вв. Ладараж, Парэ Пінскага, Арэхава Маларыцкага раёнаў) рэфлекс *е>а* характэрны і для ненаціскных складоў: *тапа́р, дан'о́к, мадо́к* ('цяпер, дзянёк, мядок'). 5. У паслянаціскных закрытых складах у назоўным склоне назоўнікаў і лічэбнікаў адзіночнага ліку на месцы *е, ь, ę* выступае *і* кароткае: *хло́піц, па́л'іц, да́віт', ка́мін', д'і́вір, го́сін'.* 6. Мадэлі «цвёрды зычны + *ы*», якая ўласціва іншым групам загародскіх гаворак,

[1] Таракань — былая назва в. Імянін Драгічынскага раёна.

у асноўных тараканскіх гаворках адпавядае мадэль «цвёрды зычны + *і*». 7. Мяккі этымалагічны *ц'* захаваў мяккасць галоўным чынам у націскных складах перад галоснымі *і* (<*ѣ*), *е* (<*ę*, *'а*). У асобных гаворках, якія ўяўляюць невялікія астравы, выпадкаў захавання мяккасці больш. 8. Шыпячыя і *р'* захавалі мяккасць у націскных складах перад *і* (<*ѣ*), *е* (<*ę*, *'а*). 9. Мове старэйшых носьбітаў гэтых гаворак уласцівы суфіксы *-с'к* і *-ск*. 10. Заднеязычныя і фарынгальныя перад *е*, *і* звычайна цвёрдыя, перад *і* з *о* ў новых закрытых складах пад націскам і ў ненаціскных канчатках прыметнікаў мяккія. 11. Адпадзенне канечнага *в* у назоўнікаў роднага склону множнага ліку: *німá хлóпцу, пйет' пáл'цу* ('няма хлопцаў, пяць пальцаў'). 12. Для скланенняў назоўнікаў, прыметнікаў, займеннікаў характэрна супадзенне роднага і давальнага склонаў: *Німá* (каго?) *тáйі хорóшійі молодéце.— Оддалá хýстку* (каму?) *тáйі хорóшійі молодéце.* 13. Прыметнікам мужчынскага роду адзіночнага ліку ў пазоўным склоне не пад націскам уласцівы канчатак *-і*, пад націскам — *-ей*. 14. Займеннік 1-й асобы множнага ліку *мо* 'мы'.

У адным мікрарэгіёне (па паўночны захад ад Драгічына) намі выяўлены лексічны пучок ізаглос, які аддзяляе гаворкі тараканскія ад сярэдне- і паўночна-ўсходніх загародскіх. Праходзіць ён паміж вв. Ласінцы, Бялынь Ласінскі і вв. Сіманавічы, Вулька Сіманаўская. Прыводзім лексемы гэтага пучка, узяўшы за аснову гаворкі вв. Заяленне (скарочана Зл, паўночна-ўсходні загародскі тып), Сіманавічы (скарочана См, сярэднезагародскі тып) і Субаты (скарочана Сб, тараканскі тып): *бруслéне* (Сб) — *брусны́ц'і* (См), *брусны́ці* (Зл) 'брусніцы'; *бýкач* (Сб) — *буйлó* (См) 'бугай (птушка)'; *воздáчка* (Сб) — *обры́т'* (См), *обрíт'* (Зл) 'вуздэчка, аброць'; *вýха* (Сб) — *гýшы* (См), *гýші* (Зл) 'вушы'; *доц'агнýте* (Сб) — *достáты* (См, Зл) 'дастаць, дацягнуцца'; *залóга* (Сб) — *облóга* (См, Зл) 'каўнер кажуха'; *кутáс'а* (Сб) — *пудвы́чка* (См, Зл) 'стужка'; *латáт'* (Сб) — *локáт'т'е* (См, Зл) 'жоўты гарлачык'; *нарýчче* (Сб) — *бырэ́мн'е* (См, Зл) 'абярэмак'; *пáсмо* (Сб) — *пырéчынок* (См), *пырéчінок* (Зл) 'пластаваны абярэмак сена'; *пасмовáте* (Сб) — *пырычын'áты* (См), *пырічін'áты* (Зл) 'пластаваць граблямі сена'; *п'ілка* (Сб) — *ч'áшка* (См), *чáшка* (Зл) 'кош, плецены з лазы і саломы'; *повáл* (Сб) — *стéл'а* (См, Зл) 'столь'; *сайéн* (Сб) —*гандарáк* (См, Зл) 'від спадніцы, андарак'; *скл'еп* (Сб) — *л'ох* (См, Зл) 'склеп'; *рушнічóк* (Сб) — *скарáч* (См, Зл) 'вузенькі ручнік'; *хвартýх* (Сб) — *пацыйáтык* (См, Зл) 'ніжняя частка, нахіл у франтоне'; *ц'іха* (Сб) — *раднó* (См, Зл) 'радно'; *ш'éнка* (Сб) — *ны́шка* (См, Зл) 'невялікі мяшок'; *шчіт* (Сб) — *пацыйáт* (См), *паційáт* (Зл) 'франтон', але *шмал'кы́* (См) — *погор'ілце* (Сб), *погорілці* (Зл) 'трошкі падгарэўшая вараная бульба'.

Масівы і астравы тараканскіх гаворак: вв. Арэхава, Драчова, Зеляніца, Перавісь, Перавое Маларыцкага раёна; вв. Лелікава, Замосце Кобрынскага раёна; вв. Аляксеевічы, Брадок, Брашэвічы, Бялынь Ласінскі, Вуліца, Вулька Брашэвіцкая, Гумніщча, Дымск (Шчуры), Завялёўе, Імянін (Таракань), Ласінцы (гаворка пераходная да паўднёвазагародскіх), Пацы, Ператок, Плішчыцы, Субаты, Сычы, Татар'я, Тыневічы, Цыбкі, Шарыевічы Драгічынскага раёна; в. Валавель Драгічынскага раёна; вв. Опаль, Лядавічы, Вартыцк Іванаўскага раёна; вв. Ладарж, Парэ Пінскага раёна.

Паўднёвазагародскія гаворкі. 1. На месцы націскнога *о* ў новых закрытых складах выступае *і*, рэдка *і (ю)* (*і(ю)* адзначаны, напрыклад, у гаворках вв. Стрыганец Жабінкаўскага, Відамля Камянецкага раёнаў). 2. На месцы націскных *ę*, *'а* пасля мяккіх зычных, як і ў тараканскіх гаворках, выступае *е*: *з'ет'*, *йéма*, *гл'éну*, *ш'éпка*. 3. Захоўваецца націскны *ы* (<*ы*, *і*), які, аднак, мае факультатыўны варыянт *ы(е)*. У асобных гаворках (вв. Акропна, Віры Драгічынскага, Амеллянец Камянецкага раёнаў і інш.) націскныя *ы*, *і* перайшлі ў *е* звужанае. 4. Захоўваецца націскны *е* (акрамя разгледжаных вышэй пераходаў *е*>*о*), аднак нярэдка ён мае факультатыўны варыянт *е(а)*. 5. У паслянаціскных закрытых складах у назоўным склоне назоўнікаў і лічэбнікаў адзіночнага ліку на месцы *е*, *ь*, *ę* выступае *ы*: *хлóпыц'*, *хлóпыц*, *пáлыц'*, *пáлыц*, *кáмын'*, *д'івыр*, *гóсын'*, *дéвыт'*, *дéсыт'*. 6. Галосны *і* пасля цвёрдых зычных ужываецца пераважна толькі на месцы *о* ў новых націскных закрытых складах. 7. У большасці гаворак этымалагічны *ц'* пераважна мяккі, аднак у адрозненне ад сярэднезагародскіх гаворак перад рэфлексам *і* ў паслянаціскных адкрытых складах *ц* цвёрды: *пáл'цы*, *хлóпцы*, *рукавы́цы*. У частцы гаворак (гаворкі ўсходнезагародскай зоны, а таксама вв. Акроп-

на, Асаўляны, Дзераўная, Дзеткавічы, Заніўе, Зёлава, Ляснікі, Пагор'е, Пярковічы, Ражок, Рашын, Скрыпялі, Сукачы, Усходы Драгічынскага раёна і інш.) *ц'* захаваў мяккасць толькі ў націскных складах перад *і* (<*ѣ*), *е* (<*ę, 'а*). 8. Мяккія шыпячыя і этымалагічна мяккі *р'* захавалі мяккасць у націскных складах перад *і* (<*ѣ*), *е* (<*ę, 'а*). 9. Для гаворак з пераважна мяккім *ц'* характэрны суфікс *-с'к*, гаворкам, у якіх этымалагічна мяккі *ц'* захаваўся толькі ў націскных складах, уласціва паралельнае ўжыванне суфіксаў *-с'к* і *-ск*. 10. Заднеязычныя і фарынгальныя перад *е, і* звычайна цвёрдыя, перад *і* з *о* ў новых націскных закрытых складах, а ў большасці гаворак перад *і* ў ненаціскных канчатках прыметнікаў мяккія.

Гаворкі паўднёвазагародскага тыпу пашыраны пераважна на поўдні загародскага дыялектнага арэала (ад Заходняга Буга да паўднёвага захаду Пінскага раёна), а таксама на паўночным захадзе (вв. Каленкавічы, Бярозаўка, Амеллянец і інш.) і паўднёвым усходзе Камянецкага, паўночным захадзе Жабінкаўскага (вв. Відамля, Дзяменічы і інш.) раёнаў; на поўнач ад Брэста (в. Казловічы); на поўдні Жабінкаўскага раёна (в. Стрыгапец і інш.); на паўночным захадзе (вв. Акропна, Асаўляны, Віры, Дзераўная, Дзеткавічы, Заніўе, Зёлава, Ляснікі, Маркавічы, Мосткі, Скрыпялі, Сукачы I, Сукачы II, Усходы і інш.) і паўночным усходзе (вв. Агдэмер, Белая, Вавулічы, Гутава, Драбаты, Заверша, Заплессе, Крамно, Мікіцк, Сарацні, Скібічы і інш.) Драгічынскага, паўночным захадзе Іванаўскага (вв. Калілы, Панцавічы, Сычэва, Тышкавічы і інш.) раёнаў.

Такім чынам, па фанетычнай структуры з улікам наслаення спецыфікі заходне- і ўсходнезагародскай дыялектных зон у загародскіх гаворках чатыры дыялектныя тыпы вылучаюцца даволі пэўна. Але такі падзел некалькі ўмоўны з пункту погляду агульнай структуры гэтых гаворак. Наўрад ці агульная структура найбольш усходніх сярэднезагародскіх гаворак бліжэй да структуры сярэднезагародскіх гаворак крайняга захаду Загароддзя, чым да суседніх паўночна-ўсходніх загародскіх гаворак. На тэрыторыі Загароддзя дыялектныя мікразоны і зоны наслойваюцца на часткі розных дыялектных тыпаў, інтэгруюць іх, а з другога боку, дыферэнцыруюць

часткі аднаго тыпу. У той ці іншай зоне або мікразоне пераважаюць гаворкі якога-небудзь дыялектнага тыпу, яны ўплываюць на суседнія гаворкі іншых тыпаў. Апошнія ж успрымаюць гэты ўплыў, набываюць характар пераходнасці. Такі ў значнай меры пераходны характар паміж асноўнымі сярэднезагародскімі і асноўнымі паўночна-ўсходнімі загародскімі гаворкамі маюць гаворкі сярэднезагародскія, якія знаходзяцца ва ўсходнезагародскай зоне, і паўночна-ўсходнія загародскія, размешчаныя ў заходнезагародскай зоне. Прычыны іх пераходнага характару стануць зразумелымі, калі ўлічыць лінгвагеаграфічны і гістарычны аспект. Таму, на наш погляд, выдзяленне ў загародскіх гаворках, з аднаго боку, дыялектных тыпаў, з другога боку, дыялектных зон і мікразон апраўдваецца іх унутранай структурай, якая з'яўляецца вынікам гістарычнага развіцця.

Структура асаблівасцей, якія дыферэнцыруюць загародскія гаворкі, паказана ў табл. 2.

Разгледзім пашырэнне прыведзеных у табліцы асаблівасцей, а таксама тыпалагічна блізкіх да іх рыс у межах славянскага кантыніума (нумарацыя разглядаемых асаблівасцей у тэксце адпавядае нумарацыі ў табліцы). Недыферэнцыраваны разгляд рыс генетычна аднаго паходжання і рыс, блізкіх або аднолькавых тыпалагічна, правамерны, таму што ў многіх выпадках канчаткова не вырашана пытанне, якія рысы блізкія генетычна, а якія толькі тыпалагічна. Да таго ж тыпалагічная блізкасць моўных рыс не абавязкова выпадковая (122, *11—17;* 123; 133, *97*). Асаблівай увагі заслугоўваюць выпадкі, калі такія рысы ахопліваюць суцэльныя тэрыторыі, пашыраючыся на часткі дзвюх ці некалькіх моў, утвараючы пучкі ізаглос. І хоць у кожнай мове ці дыялекце гэтыя рысы маглі ўзнікнуць самастойна, ёсць падставы меркаваць, што раней у тых дыялектах, у якіх яны існуюць цяпер, маглі быць агульныя перадумовы, якія далі потым блізкія рэфлексы. Часам такія рысы могуць быць архаізмамі, але яны захаваліся ў пэўных зонах таксама не выпадкова.

1. Рэфлексацыя *о* ў новых націскных закрытых складах. Рэфлекс *о>у, о* закрытае, *о* вузкае, *уо* (гукі больш задняга і больш высокага ўтварэння, чым *о*): гаворкі паўднёва-заходнія беларускія (33, карта *35*; 76, *88—90*), большасць сярэднепалескіх і многія ўсходнепалескія

Табліца 2

Ідэнтыфікацыя чатырох тыпаў загародскіх гаворак па асноўных асаблівасцях

№ п/п	Асаблівасці	Дыялектныя тыпы			
		паўночна-ўсходні загародскі	сярэднезагародскі	паўднёва-загародскі	тараканскі
1	Рэфлекс націскнога *о* ў новых закрытых складах	*у*	*і*, радзей *і(ю)*, *ы*	*і*	*і*
2	Рэфлекс *'а*, *ę* пад націскам	*'а*	*'а*	*'е*	*'е*
3	Рэфлекс *е*, *ь* пад націскам	*е*	*е*	*е*	*а*
4	Рэфлекс *і*, *ы* пад націскам	*ы*, радзей *і*	*ы*	*ы*	*е*
5	Рэфлекс *ы*	*ы/і*	*ы*	*ы*	*і/е*
6	Рэфлекс *е*, *ь*, *ę* ў паслянаціскных закрытых складах	*е*	*е*	*ы*	*і*
7	Рэфлекс *ѣ* не пад націскам	*ы*, радзей *і*	*ы*, радзей *і*	*ы*	*і*
8	Цвёрдасць-мяккасць зычных перад рэфлексамі націскнога *о* ў новых закрытых складах	Цвёрдыя	Цвёрдыя/мяккія	Цвёрдыя/мяккія	Цвёрдыя/мяккія
9	*ц'*	*ц*	*ц'*	*ц'*	*ц*, радзей *ц'*
10	*р'* перад рэфлексамі націскных *ѣ*, *о* (новыя закрытыя склады), *'а*, *ę*	*р*	*р'*	*р'*	*р'*
11	Шыпячыя перад рэфлексамі націскных *ѣ*, *о* (новыя закрытыя склады), *'а*, *ę*	Цвёрдыя	Мяккія	Мяккія	Мяккія
12	Заднеязычныя і фарынгальныя ў спалучэннях *гы, кы, хы*	Мяккія/цвёрдыя	Цвёрдыя	Цвёрдыя, рэдка мяккія	Цвёрдыя, рэдка мяккія
13	Суфікс *-ск-*	*-ск-*	*-ськ-*	*-ськ-*	*-ськ-/-ск-*
14	Канцавы *-й* у прыметніках мужчынскага роду	*-й*	*-й*	*-й*	—/*-й*

ўкраінскія, большасць закарпацкіх украінскіх (29, I, карты *28, 29, 57—62,* II, карты *25, 51, 52;* 34, *16—21;* 35; 78; 79), польскія (140; 155, V, карты *234, 237—240,* VI, карта *296*), чэшскія (114, *26, 27*), славенскія, некаторыя

сербскахарвацкія (166, *90, 103*), многія славацкія (136, карты *174—177, 180, 182—184, 187, 189*), верхнялужыцкія (157; 169). Рэфлекс *о>у*: большасць польскіх, чэшскіх, закарпацкіх украінскіх гаворак, некаторыя славацкія і палеска-ўкраінскія гаворкі. Рэфлексы *о>і, ы, і(ю)* (гукі больш высокага і больш пярэдняга ўтварэння, чым *о*): гаворкі паўднёваўкраінскія (акрамя значнай часткі закарпацкіх), валынска-палескія, некаторыя іншыя паўночнаўкраінскія. Пераход *о* ў гукі больш пярэдняга, а часам і больш высокага ўтварэння, чым *о* (у тым ліку ў новых закрытых складах): многія гаворкі заходняй (поўнач Сілезіі, Вялікапольшча, Кашубы) і паўднёвай (раён Кельцэ, Тарнава, Тарнабжэга, Новага Сонча) Польшчы (*о>е, ие, иу, і*), ніжнялужыцкія гаворкі (*о>у, уе, е* пасля губных і заднеязычных) (155, VI, карта *296*; 157; 169; 172, *24, 25*). Рэалізацыя галосных задняга рада ў галосныя пярэдняга рада: чэшскія гаворкі (114, *29—31*).

2. Рэфлексацыя *'а, ę* пад націскам. Рэфлекс *ę>е*: заходнеўкраінскія гаворкі на захад ад лініі р. Гарынь, на захад ад Дубровіцы, Луцка, на ўсход ад Львова, на поўнач ад Цярнопаля, на ўсход ад Чарнаўцоў (без гаворак закарпацкіх, бойкаўскіх, лемкаўскіх, большасці надсанскіх) (29, II, карты *41, 44, 47—49*; 39; 40, *87—138*; 93, *24*), гаворкі паўднёваславянскія, чэшскія (3, *282—287*; 109, *53, 55*), ніжнялужыцкія (157; 169), некаторыя славацкія (136, карты *6, 11—18*), некаторыя польскія (155, IV, карты *187—194,* VI, карты *307, 308*), паўночна-ўсходнія велікарускія (87, *17—22*; 92, *152—174*); некаторыя разанскія. Рэфлекс *ę>*гук блізкі да *е* (*ę, е* шырокае): большасць польскіх гаворак, многія славацкія, некаторыя ніжнялужыцкія, македонскія і паўночнавелікарускія. Рэфлекс *'а>е*: большасць гаворак Заходняй Украіны (акрамя бойкаўскіх, закарпацкіх, лемкаўскіх, большасці надсанскіх) і ўсходняй Балгарыі, у пэўных пазіцыях гаворкі Чэхіі, Лужыц, Кашуб, паўночна-ўсходняй Польшчы, паўночнага ўсходу Разанскай вобласці, паўночна-ўсходнія велікарускія гаворкі. Рэфлексацыя *'а, ę>е* ў гаворках Брэстчыны, Заходняй Украіны і Балгарыі генетычна аднаго паходжання (38). Рэфлекс *'а>'а*: большасць гаворак усходнеславянскіх (акрамя часткі ўкраінскіх і рускіх), польскіх, славацкіх, сербскахарвацкіх, славенскіх, усходнебалгарскіх. Рэфлекс *ę>'а*:

большасць гаворак усходнеславянскіх (акрамя часткі ўкраінскіх і рускіх), некаторыя заходнє- і паўднёваславянскія гаворкі.

3. Рэфлексацыя *е, ь>а, а* пярэдняе, *е* шырокае. Рэфлекс *е>а, е* шырокае: некаторыя гаворкі Беласточчыны (54; 135, картатэка, населеныя пункты *6, 26, 36, 46, 56, 62,* слова *гáты* 'гэты' і вытворныя ад яго), многія гаворкі паўночнай і заходняй частак Валынскай вобласці УССР, сярэдненадбужскія і гуцульскія (25, *13—43, 226, 300—352*; 27; 37, *41, 45, 80—87*; 77; 93; 130, *43—48, 170—172;* 131, *20, 21;* картатэка ДАУМ), некаторыя паўночна-ўсходнія велікарускія гаворкі (92), многія сярэднеславацкія (136, карты *20, 21, 23, 32, 36, 38, 39, 42, 47—54, 67, 70, 73*), некаторыя сербскахарвацкія на поўнач ад Бялграда і Заграба (166, *24—31, 36—117; 131*), ніжнялужыцкія гаворкі (157; 167, I, карты *62, 67,* II, карты *5, 21, 44, 53, 72, 105, 111*), палабская мова (153, *39—64*), непаслядоўна ці ў абмежаваных пазіцыях — некаторыя беластоцкія, надсанскія, асобныя наддністроўскія, букавінска-пакуцкія, усходнеславацкія, заходнепольскія (155, VI, карты *328, 329*). Рэфлекс *ь>а, е* шырокае звычайна характэрны для тых жа гаворак, што і рэфлекс *е>а, е* шырокае. Выключэнне складаюць многія славацкія і польскія гаворкі. Акрамя таго, рэфлекс *ь>а* характэрны для сербскахарвацкага і славенскага арэалаў. Астатнім славянскім гаворкам уласцівы рэфлексы *е>е* і *ь>е*.

4—5. Рэфлексацыя *ы, і*. Звужэнне *ы>і, і(ы)* характэрна для двух славянскіх рэгіёнаў: а) паўднёва-заходняга: чэшская, славацкая, паўднёваславянскія мовы і гаворкі; б) палеска-мазавецкага: Украінскае Палессе (шырока) (25, *13—360*; 29, I, карты *18, 20,* II, карты *15—18*), асноўная частка Беларускага Палесся (часцей абмежавана) (16, *47—50, 121;* 33, карты *22, 24, 37—39, 41, 128*), польскія гаворкі на поўнач ад лініі Піла, Быдгашч, Варшава, на поўнач ад Любліна (паслядоўна) (155, V, карта *214,* VI, карты *254, 255*; 172, *19—20*). Гэтыя два рэгіёны злучаюцца паласой заходнеўкраінскіх гаворак, у якіх назіраецца спарадычнае праяўленне такой рысы. Рэфлексы *ы, і>е, ы(е), і(е), еj, ъ(е)*: большасць валынска-палескіх гаворак (акрамя паўднёвага ўсходу), сярэдненадбужскія, гуцульскія, букавінска-пакуцкія, многія наддністроўскія (у некаторых паслядоўна, у іншых толькі пасля заднеязычных, у частцы спарадычна), некаторыя надсанскія (пасля заднеязычных) (25, *13—360*; 35, *54, 84, 90—97, 142, 160, 162, 164;* 40, *10—54*; 90; 93, *7, 15—19*; 130, *51, 52, 157*), большасць чэшскіх (141, *283*; 152, *73, 74, 82, 254*; 173, *54, 63, 172—185*), паўднёвыя славацкія (136; 165, *251*), многія польскія (паўднёвая Малапольшча, астравы і масівы ў цэнтральнай і ўсходняй Польшчы, даліна р. Аравы) (144, *38*; 158, *257*), большасць кашубскіх, некаторыя паўночна-ўсходнія славенскія гаворкі, палабская мова, у асобных пазіцыях гаворкі пераходныя паміж верхня- і ніжнялужыцкімі (3, *274—276*; 11, *109, 110*; 153; 183; 184). Да гэтага масіву фактычна прымыкае (аддзяляючыся паласой паўночна-палескіх і мазавецкіх гаворак) тэрыторыя пашырэння форм назоўнікаў тыпу *баранз, валз, дзяўкé, на мяжз* ў гаворках сярэдняй паласы Беларусі на поўдзень ад лініі Гродна, Мінск, Магілёў (33, карты *41, 95, 96, 99;* запісы аўтара ў в. Тупічын Касцюковіцкага раёна). Адзначаная марфалагічная асаблівасць, магчыма, мае фанетычную падаснову і не выключана, што яна звязана з разглядаемай з'явай. Рэфлекс *ы>у:* гаворкі Беларускага Палесся на ўсход ад Гарыні і Лані (33, карты *22, 24, 37—39, 41*). Захаванне *ы*: большасць усходнеславянскіх, польскіх і лужыцкіх гаворак (акрамя адзначаных вышэй рэфлексацый). Пераход *і>ы* (украінскае *и*): асноўная частка ўкраінскіх гаворак.

6. Рэфлексацыя этымалагічных *е, ь, ę* ў паслянаціскных закрытых складах (16, *138—141*; 25, *13—525*; 29, I, карты *42, 44,* II, карты *30, 31;* 33, карты *16, 19;* 94, *33—35;* 96; 168). Рэфлекс *е, ь>е:* большасць гаворак Беларускага і Украінскага Палесся, асобныя закарпацкія ўкраінскія гаворкі, большасць заходнє- і паўднёваславянскіх гаворак (выключэннем з'яўляецца рэфлекс *ь* у сербскахарвацкіх і славенскіх гаворках), паўночнавелікарускія і некаторыя іншыя велікарускія гаворкі. Рэфлекс *ь>е:* паўднёва-ўсходнія ўкраінскія гаворкі. Рэфлекс *е>е:* значная частка гаворак Беларускага (асабліва на ўсход ад Гарыні) і Украінскага (асабліва на ўсход ад Дняпра) Палесся, паўднёваславянскія і чэшскія гаворкі. У польскай мове часткова захаваўся *ę* (<*ę*), які артыкуляцыйна і акустычна блізкі да *е*. Рэфлекс *е>і, и, ы:* украінскія гаворкі, акрамя асноўнай часткі ўсходнє- і сярэднепалескіх і некаторых валынска-палескіх, у некаторых пазіцыях — рускія і беларускія гавор-

кі з дысімілятыўным аканнем. Рэфлекс *ь>і, и, ы*: гаворкі валынска-палескія, паўднёвавалынскія, сярэднепадбужскія, надсанскія, гуцульскія, букавінска-пакуцкія, спарадычна іншыя ўкраінскія, у асобных пазіцыях рускія і беларускія з дысімілятыўным аканнем. Рэфлекс *ę>і, и, ы*: гаворкі надднястроўскія, гуцульскія, букавінска-пакуцкія, падольскія, спарадычна іншыя паўднёва-ўкраінскія і валынска-палескія, у асобных пазіцыях чэшскія і некаторыя кашубскія.

7. Рэфлекс *ѣ* не пад націскам (25, *13—525*; 29, I, карты *11—13, 15, 16;* II, карты *10, 11, 13, 14*). Рэфлекс *ѣ>е, ы*: большасць паўночнаўкраінскіх гаворак. Рэфлекс *ѣ>і*: гаворкі паўднёваўкраінскія і некаторыя валынска-палескія, у асобных пазіцыях рускія і беларускія з дысімілятыўным аканнем.

8. Цвёрдасць-мяккасць зычных перад рэфлексамі націскнога *о* ў новых закрытых складах. Мяккія зычныя: паўднёваўкраінскія і валынска-палескія гаворкі. Цвёрдыя зычныя: іншыя славянскія гаворкі.

9. Рэфлексацыя *ц'* (3, *301—302;* 25, *13—408;* 29, I, карта *112,* II, карта *98;* 88). Мяккі *ц'* захаваўся ў большасці гаворак украінскіх (да лініі паўночны ўсход Валынскай вобласці, на ўсход ад Луцка, на поўнач ад Роўна, на поўдзень ад Корасценя, Чарнобыля, Ноўгарада Северскага, на поўнач ад Шосткі, на поўнач і ўсход ад Глухава), многіх паўночнавелікарускіх, некаторых балгарскіх. Ужыванне мяккага этымалагічнага *ц'* у абмежаваных пазіцыях: гаворкі валынска-палескія, сярэднепадбужскія, надднястроўскія, надсанскія, гуцульскія, букавінска-пакуцкія, многія падольскія, палескія ў раёне Роўна, на поўдзень ад Корасценя, Ноўгарада Валынскага, у парэччы Дзясны паміж Чарнігавам і Ноўгарадам Северскім, многія паўночнавелікарускія і ўсходнебалгарскія. Шырокая дыстрыбуцыя мяккага этымалагічнага *ц'*: гаворкі паўднёва-ўсходнія ўкраінскія, паўднёвавалынскія, значная частка падольскіх, частка паўночнаўкраінскіх, закарпацкія і бойкаўскія. У астатніх славянскіх гаворках *ц'* дыспалаталізаваўся.

10. Рэфлексацыя *р'* (25, *13—525*; 29, I, карты *126, 128—130,* II, карты *6, 115, 116*; 33, карта *42*; 35; 50, *306—315*; 130; 157; 169). Захаванне мяккага *р'*: гаворкі рускія, мяккаэрыя беларускія, большасць украінскіх (у паўднёвавалынскіх і падольскіх гаворках пазіцыі *р'* вельмі

абмежаваныя), лужыцкія, усходнебалгарскія. Дыспалаталізацыя *р'*: гаворкі цвёрдаэрыя беларускія, некаторыя палескія, валынскія і падольскія ўкраінскія, славацкія, паўднёваславянскія, акрамя ўсходнебалгарскіх. Мяккі *р'* перайшоў у іншыя гукі: гаворкі польскія і чэшскія.

11. Рэфлексацыя шыпячых (25, *13—525*; 29, I, карты *122, 123,* II, карты *112, 113;* 35, *62, 63;* 50, *377—392;* 94, *54—55;* 96, *237;* 157; 169). Поўная дыспалаталізацыя шыпячых: гаворкі беларускія, польскія, ніжнялужыцкія, балгарскія, славенскія, некаторыя палескія ўкраінскія. Астатнія славянскія гаворкі ў той ці іншай меры захавалі мяккія шыпячыя. Адносна шырокая ўжывальнасць мяккіх шыпячых характэрна для некалькіх славянскіх рэгіёнаў: захад валынска-палескіх, сярэднепадбужскія, захад і поўдзень надднястроўскіх, надсанскія, гуцульскія, карпацкія, захад букавінскіх, паўднёвы захад падольскіх гаворак; гаворкі паўночнага захаду Палтаўскай, поўдня Чарнігаўскай, поўдня Сумскай абласцей; многія паўночнавелікарускія гаворкі; чэшскі і славацкі моўны арэалы.

12. Рэфлексацыя заднеязычных у спалучэннях *гы, кы, хы* (25, *13—525*; 29, II, карты *20, 21, 193*; 35, *193, 198, 206*; 96; 139, *124—132,* карта *13*; матэрыялы ДАБМ; карта татэка ДАУМ). Арэалы мяккіх заднеязычных: гаворкі беларускія, большасць рускіх, частка палеска-ўкраінскіх; гаворкі паўднёвавалынскія, надднястроўскія, букавінска-пакуцкія, гуцульскія, некаторыя надсанскія і сярэднепадбужскія, асноўная частка польскіх. Арэалы цвёрдых заднеязычных: паўднёва-ўсходнія, падольскія і многія паўночныя ўкраінскія гаворкі, польскія гаворкі Мазоўша і прылягаючых тэрыторый; паўднёваславянскія, чэшскія, славацкія, польскія сілезскія, украінскія бойкаўскія, закарпацкія, лемкаўскія, многія надсанскія гаворкі; многія рускія гаворкі.

13. Суфікс *-ськ-* характэрны для гаворак украінскіх (абмежавана яго ўжыванне ў гаворках сярэднепадбужскіх, надднястроўскіх, гуцульскіх, букавінскіх, некаторых палескіх), многіх паўночнавелікарускіх, спарадычна для іншых усходнеславянскіх. Для астатніх славянскіх гаворак характэрны суфікс *-ск-*.

14. Канчатак *-й* у прыметніках мужчынскага роду адзіночнага ліку назоўнага склону характэрны для гаворак рускіх, украінскіх, паўночна-ўсходніх і некаторых

паўднёвых беларускіх. Адсутнасць *-й* у гэтай пазіцыі характэрна для гаворак паўднёва- і заходнеславянскіх, а таксама большасці беларускіх. Адзінкавыя выпадкі «адпадзення» *-й* у данай пазіцыі сустракаюцца і ва ўкраінскіх гаворках: валынска-палескіх, надднястроўскіх, букавінскіх (25, населеныя пункты *3, 6, 83, 131*).

Разгледжаныя асаблівасці тыпалагічна блізкіх з'яў даюць падставы для выдзялення ў славянскім кантыніуме (вобласці старога засялення) некалькіх зон.

Заходняя зона: *ы>і* (выхад у Палессе); *ę>е, ę, е* шырокае пад націскам; *ę>е* ў паслянаціскных закрытых складах; дыспалаталізацыя *р'* або пераход *р'* у іншыя гукі; адсутнасць *-й* у прыметніках мужчынскага роду.

Усходняя зона: *ę>'а* пад націскам (выхад у Верхнія Лужыцы); *ы>ы* (выхад у паўднёвую Польшчу і Лужыцы); захаванне *р'* (выхад у Лужыцы); наяўнасць *-й* у прыметніках мужчынскага роду.

Паўночна-заходняя зона (Палессе — Мазоўша і суседнія рэгіёны): *о>у, о* закрытае, *о* вузкае; *ы>і* (выхад на паўднёвы захад); поўная дыспалаталізацыя шыпячых (выхад у Славенію і Балгарыю).

Паўночна-заходняя зона ў шырокім сэнсе: *і>і*; *ę>е, е* шырокае, *ę* пад націскам; *е, ь>е* ў паслянаціскных закрытых складах; адсутнасць пераходу *о>і* ў новых закрытых складах; дыспалаталізацыя *ц'*.

Паўднёва-заходняя зона: *ь>а*; *ę>е* ў паслянаціскных закрытых складах; *ę>е* пад націскам (выхад ва ўсходнюю частку арэала паўночнавелікарускіх гаворак і ў Лужыцы).

Цэнтральна-сярэднезаходняя зона: *'а>е, е* шырокае (выхад ва ўсходнюю Балгарыю, паўночна-ўсходнюю Польшчу, на паўночны ўсход велікарускага моўнага арэала); *ы, і>е, ы(е), ъ(е)* (выхад у Кашубы).

Верхняе Надпрыпяцце — Усходняе Прыкарпацце: *е>а, е* шырокае пад націскам (выхад у Лужыцы і Палабію); *ы, і>е, ы(е)*; *'а>'е* пад націскам; *е, ь, ę>і, ы* ў паслянаціскных закрытых складах; пазіцыі *ц'* абмежаваныя; шырокая дыстрыбуцыя мяккіх шыпячых (выхад у Сярэдняе Прыкарпацце, Сярэдняе Прыдняпроўе, паўночную частку велікарускага моўнага арэала, Славакію, Чэхію). З гэтай зонай збліжаецца тэрыторыя пашырэння такіх лексем, як *скопец, повал(а), зводач, потак* (28, *106, 111*; 68, *43*; 69, *96, 97*).

Паўднёва-ўсходняя зона: *і>ы* (украінскае *и*); *о>і, і(ю), ы*; *ѣ>і* не пад націскам; *е>і, ы* ў паслянаціскных закрытых складах; мяккі *ц'* (выхад у паўночную частку велікарускага моўнага арэала і некаторыя раёны Балгарыі); суфікс *-ськ-* (выхад у паўночную частку велікарускага моўнага арэала).

Паўднёва-ўсходняя зона ў шырокім сэнсе: *ѣ>і* ў ненаціскным становішчы (паслядоўна і спарадычна); *е>і, ы* ў паслянаціскных закрытых складах (паслядоўна і спарадычна) (выхад у Кашубы); *ę>і, ы* ў паслянаціскных закрытых складах (паслядоўна і спарадычна); *ь>і, ы* ў паслянаціскных закрытых складах (паслядоўна і спарадычна); наяўнасць мяккіх шыпячых (выхад у Чэхію, Славакію, Лужыцы).

Паўднёва-ўсходняя зона ў вузкім сэнсе з выхадам у Сярэдняе Прыкарпацце: паслядоўны пераход *і>ы* (украінскае *и*); шырокая дыстрыбуцыя мяккага *ц'*.

Паўднёва-ўсходняя і сярэднезаходняя зона: рэалізацыя галосных задняга рада ў галосныя пярэдняга рада (*о>і*; *у(и)>і* і інш.).

Паўночная зона: захаванне *ы*; мяккасць заднеязычных перад *і, е*.

Паўднёвая зона: пераход *ы>і*; цвёрдасць заднеязычных перад *і, е*.

У сучасным дыялектным ландшафце Брэсцка-Пінскага Палесся, відаць, у нейкай меры знайшло адлюстраванне сутыкненне славянскіх дыялектных адзінак мінулых эпох. Таму можна дапусціць, што выдзеленыя зоны хутчэй за ўсё з'яўляюцца свайго роду сігналамі аб існаванні адпаведных зон у старажытнай Славіі. У гаворках жа некаторых славянскіх абласцей назіраецца канцэнтрацыя асаблівасцей, якія адрозніваюць паміж сабой тыпы загародскіх гаворак. Ніжэй мы прыводзім вобласці і гаворкі, дзе выяўлена канцэнтрацыя пэўных тыпаў.

Паўночна-ўсходні загародскі тып. Найбольшая канцэнтрацыя — гаворкі Палесся на ўсход ад Гарыні (рэфлексы *о>у, о* закрытае, *уо* ў новых націскных закрытых складах, звужэнне *ы>і, і(ы)*, рэфлекс *е, ь, ę>е* ў паслянаціскных закрытых складах, рэфлекс *'а, ę>'а* ў націскных складах, адсутнасць пераходу *ы, і>е*, дыспалаталізацыя шыпячых, *ц', р'* і інш.); значная канцэнтрацыя — гаворкі Мазоўша (рэфлексы *о>и, о* вузкае ў новых



Галоўныя фанетычныя рысы, якія дыферэнцыруюць гаворкі Брэсцка-Пінскага Палесся: *1*—рэфлекс *о>і*, радзей *ы, і(ю)* у новых закрытых складах пад націскам; *2*—рэфлекс *о>у* ў новых закрытых складах пад націскам; *3*—рэфлекс *'а, ç>'е* пад націскам; *4*—рэфлекс *е, ь>а* пад націскам; *5*—рэфлекс *і, ы>е* пад націскам; *6*—оканне; *7*—цвёрдасць *д, т, з, с, н* перад рэфлексамі *е*; *8*—цвёрдасць *д, т, з, с, н* перад рэфлексамі *е*; *9*—цвёрдасць губных перад рэфлексамі *е*; *10*—рэфлексы *д', т'>дз', ц'*; *11*—аканне; *12*—рэфлексы *д', т'>дз', ц'*; *13*—захаванне мяккіх *д', т'*; *14*—межы паміж арэаламі дыялектных тыпаў. Скарачэнні: А—Антопаль, Бл— Белаазёрск, Бр—Бяроза, В—Высокае, Г—Ганцавічы, Дв—Дзівін, Д-Г—Давыд-Гарадок, Дм—Дамачова, Др—Драгічын, Ж—Жабінка, Івн—Іванава, Івц—Івацэвічы Км — Камянец, Лг—Лагішын, Лн—Лунінец, М—Маларыта, Пр—Пружаны, Ст—Столін, Ц—Целяханы, Ш—Шарашова



Гаворкі Брэсцка-Пінскага Палесся. Загародскія гаворкі: *1*—сярэднезагародскія; *2*—паўночна-ўсходнія загародскія; *3*—паўднёвазагародскія; *4*—тараканскія; *5*—межы паміж арэаламі дыялектных груп і тыпаў. Гаворкі паўночнай і ўсходняй часткі Брэсцка-Пінскага Палесся: *I*—паўночнабрэсцкія; *Ia*—тураўскія; *II*—верхнеясельдскія; *III*—малецкія; *IV*—паўднёвацеляханскія; *V*—паўночналагішынскія; *VI*—бобрыкскія; *VII*—лунінскія; *VIII*—беражноўскія; *IX*—сярэднепагарынскія. *660, 675, 946...* — нумарацыя населеных пунктаў па ДАБМ. Скарачэнні: А—Антопаль, Бл—Белаазёрск, Бр—Бяроза, В—Высокае, Г—Ганцавічы, Дв—Дзівін, Д-Г—Давыд-Гарадок, Дм—Дамачова, Др—Драгічын, Ж—Жабінка, З—Заяленне, Івн—Іванава, Івц—Івацэвічы, Км—Камянец, Лг—Лагішын, Лн—Лунінец, М—Маларыта, Пп—Папіна, Пр—Пружаны, Сб—Субаты, См—Сіманавічы, Ст—Столін, Ц—Целяханы, Ш—Шарашова

націскных закрытых складах, звужэнне *у>і* і інш.); некалькі меншая — гаворкі паўночна-заходняй зоны.

Сярэднезагародскі тып. Найбольшая канцэнтрацыя — асобныя раёны Сярэдняга Прыдняпроўя і Сярэдняе Прыкарпацце (бойкаўскія і частка закарпацкіх гаворак) (рэфлексы *о>і, і(ю), ы* ў новых націскных закрытых складах, рэфлексы націскных *'а, ę>'а,* а таксама *е, ь>е,* захаванне *ы(и)*, шырокая дыстрыбуцыя мяккіх шыпячых, *ц', р',* суфікс *-ськ-* і інш.). Значная канцэнтрацыя — іншыя гаворкі Сярэдняга Прыдняпроўя, некаторыя паўднёва-ўсходнія валынскія і падольскія гаворкі. Некалькі меншая — гаворкі паўночна-заходняй часткі велікарускага арэала (рэфлекс *е, ь>е* ў паслянаціскных закрытых складах, шырокая дыстрыбуцыя мяккіх шыпячых і *р',* наяўнасць мяккага *ц'* і інш.). Заўважым, аднак, што ў раёнах найбольшай канцэнтрацыі тыповых сярэднезагародскіх рыс адсутнічае такая характэрная для іх рыса, як рэфлекс *е, ь, ę>е* ў паслянаціскных закрытых складах. Між тым гэта рыса характэрна для гаворак Палесся.

Тараканскі тып. Найбольшая канцэнтрацыя — гаворкі (астравы і масівы) верхняпрыпяцка-ўсходнекарпацкай зоны і Беласточчыны, у якіх назіраецца пераход *е, ь>а, е(а), е* шырокае (у першую чаргу гэта адносіцца да рада гаворак паўночна-заходняй і заходняй Валыні). Значная канцэнтрацыя — некаторыя ўсходнія паўночна-велікарускія гаворкі (дзе назіраецца пераход пад націскам *е>е* шырокае), Сярэдняя Славакія, некаторыя раёны Лужыц, сербскахарвацкі і славенскі арэалы. Меншая канцэнтрацыя — у паўднёва-ўсходняй зоне і многіх раёнах паўночна-ўсходняй часткі велікарускага арэала.

Адзначаныя ў розных славянскіх абласцях выпадкі канцэнтрацыі фанетычных асаблівасцей, якія дэферэнцыруюць загародскія гаворкі, часам могуць быць выпадковымі. Аднак часцей за ўсё яны адлюстроўваюць пэўную сувязь у мінулым гаворак Заходняга Палесся з рознымі славянскімі дыялектнымі адзінкамі. На карысць абгрунтавання верагоднасці такой сувязі прыводзім наступныя аргументы. Некаторыя вобласці, дзе назіраецца адзначаная канцэнтрацыя, непасрэдна прымыкаюць да Брэсцка-Пінскага Палесся (Сярэдне-Усходняе і Валынскае Палессе, Беласточчына). Шэраг зон можа звязвацца з Палессем шляхам своеасаблівай арэальнай бесперапыннасці асобных моўных з'яў (56). Відаць, істотны адбітак на сучасны дыялектны ландшафт Славіі паклалі міграцыйныя рухі, якія адбываліся ў канцы праславянскай эпохі (116) і ў сярэдневякоўе. Заслугоўваюць увагі тыя старадаўнія міграцыйныя напрамкі, якія датычыліся Палесся: Палессе—Карпаты—Балканы (3, *75, 76;* 85, *67, 68, 127*; 62, *64, 65*); нізоўі Віслы—Палессе — паўднёвы ўсход Славіі (62, *64—65, 74—76*); паўднёвы ўсход Славіі—Прыкарпацце—Балканы (116); паўднёвы ўсход Славіі—Карпаты (85, *158—159*); захад—усход Палесся (115, *47—48*); старадаўняе ўсходне-паўднёва-заходнеславянскае пагранічча — Лужыцы (132); Палессе — сярэдняя Беларусь (102); Палессе — поўнач Расіі (85, *166*; 129, *50, 51, 59*). Міграцыі адбываліся і ў адваротным напрамку. Аб міграцыйных рухах, якія маглі адбывацца з іншых абласцей у Заходняе Палессе, магчыма, сведчыць клінападобная канфігурацыя некаторых ізаглос, а таксама межаў этнаграфічных і антрапалагічных арэалаў, калі «клін» пашыраецца ў напрамку да Заходняга Палесся, нярэдка заходзячы ў яго межы (29, II, карты *3, 27*; 61; 71, *31*; 86, *45*). Такога тыпу «кліны» характэрны і для Заходняга Палесся (67, карты *1—3, 15, 23*).

Такім чынам, у дзяленні загародскіх гаворак на чатыры тыпы выяўляюцца глыбокія гістарычныя карэнні і складанасць характару іх фарміравання.

ФАНЕТЫЧНАЯ СІСТЭМА ЧАТЫРОХ ЗАХОДНЕПАЛЕСКІХ ГАВОРАК

Гэты раздзел з'яўляецца тыпалагічным даследаваннем фанетыкі загародскіх гаворак. За аснову ўзяты чатыры гаворкі, кожная з якіх адносіцца да пэўнага дыялектнага тыпу: в. Сіманавічы — сярэднезагародскі, в. Заяленне — паўночна-ўсходні загародскі, в. Папіна— паўднёвазагародскі, в. Субаты — тараканскі дыялектныя тыпы. Усе чатыры вывучаемыя гаворкі знаходзяцца амаль у цэнтры загародскага дыялектнага арэала, ва ўсходняй частцы заходнезагародскай зоны, на тэрыторыі Драгічынскага раёна, дзе лакалізуюцца даволі кампактныя масівы ўсіх чатырох тыпаў загародскіх гаворак. Такі выбар адзначаных пунктаў вызначыўся мэтай — устанавіць найбольш устойлівыя рысы кожнага дыялектнага тыпу, якія захаваліся нават ва ўмовах цесных міждыялектных кантактаў на невялікай тэрыторыі.

Вёска Сіманавічы (мясц. *Сымоновычы*) Вулькаўскага сельсавета знаходзіцца на поўнач ад г. Драгічына. Археалагічны матэрыял дазваляе меркаваць, што як пастаянны населены пункт існуе яна з VI—VIII стст. (57, *190*). У пісьмовых помніках вядома з 1554 г. Вёска Заяленне (мясц. *Залыйе́н'н'е*) Хомскага сельсавета знаходзіцца ў паўночнай частцы Драгічынскага раёна, непадалёку ад месцазнаходжання старажытнарускага г. Здзітава (па М. А. Ткачову), які, паводле археалагічных даных, існуе з XI ст. (111), у пісьмовых помніках вядомы з 1252 г. Вёска Папіна (мясц. *Попы́на*) знаходзіцца на поўдзень ад г. Драгічына. У пісьмовых помніках вядома з 1546 г. Вёска Субаты (мясц. *Су́бот, Малэ́й Торока́нь*) Брашэвіцкага сельсавета знаходзіцца на паўночны захад ад г. Драгічына. У пісьмовых помніках пад назвай Другі Таракань вядома з 1517 г.

Дыялектны матэрыял гаворак вв. Сіманавічы, Заяленне, Папіна і Субаты збіраўся намі часткова ў 50—60-я гады, затым па спецыяльнай праграме ў 1969—1972 гг. У 1971 г. сумесна з В. М. Чэкманам ва ўсіх чатырох вёсках былі зроблены магнітафонныя запісы дыялектнай мовы. Акрамя таго, у сектары эксперыментальнай фанетыкі ІМ у 1970 г. зроблены палатаграмы і лінгваграмы зычных і галосных гукаў гаворкі в. Сіманавічы.

Апісваючы фанетыку чатырох адзначаных гаворак, мы ставілі мэту — выявіць, што іменна іх адрозніваe. Аднак у гэтых гаворках значна больш агульнага, чым розніцы. Таму найбольш дэталёва мы даследуем гаворку в. Сіманавічы. Аналіз гаворак вв. Заяленне, Папіна, Субаты праводзіцца ў наступным плане: агульныя з сіманавіцкай гаворкай асаблівасці гаворак заяленскай, папінскай, субацкай адзначаюцца без падрабязнага аналізу; адрозненні паміж гэтымі гаворкамі аналізуюцца па магчымасці падрабязна і дэталёва.

Пры выбары пазіцый, у якіх разглядаецца дыстрыбуцыя галосных і зычных чатырох даследуемых гаворак, мы абмяжоўваліся тымі з іх, у якіх назіраецца вар'іраванне галосных і зычных. Для галосных: націскное становішча — ненацiскное становішча, пераднаціскныя склады — паслянаціскныя склады, паслянаціскныя неканцавыя склады — паслянаціскныя канцавыя склады, адкрытыя склады — закрытыя склады, становішча пасля цвёрдых зычных — становішча пасля мяккіх зычных, абсалютны пачатак слова — іншыя пазіцыі. Для зычных: становішча перад галоснымі — становішча перад зычнымі, перад звонкімі зычнымі — перад глухімі зычнымі, перад цвёрдымі зычнымі — перад мяккімі зычнымі, перад галоснымі пярэдняга рада — перад галоснымі сярэдняга і задняга рада, у абсалютным пачатку слова — у іншых пазіцыях, у абсалютным канцы слова — у іншых пазіцыях.

ГАВОРКА ВЁСКІ СІМАНАВІЧЫ

Вакалізм

Галосныя фанемы. У гаворцы в. Сіманавічы існуе шэсць асноўных варыянтаў галосных гукаў — *і, ы, е, а, о, у,* фанемны статус якіх вызначаецца пры аналізе бінар-

ных супроцьпастаўленняў на ўзроўні словаформы (мінімальныя пары) або мадэлі (сегменты) у моцнай пазіцыі — пад націскам, пасля цвёрдых зычных. Іменна ў гэтай пазіцыі проціпастаўлены наступныя галосныя фанемы: *а—о: ла́вка—ло́вка; а—у: да́ты—ду́ты, ла́пав—лу́пав* 'лыпаў'; *а—е: гора́—горе́* 'арэ'; *а—ы: ма́ло—мы́ло, ма́ты—мы́ты; о—у: з ро́та—ру́та, вко́сыт'—вку́сыт'; о—е: горо́* (клічная форма) — *горе́, го́нде* 'вось тут' — *ге́нде* 'вось там'; *о—ы: кров—крыв, поло́в—полы́в; у — е: дун'—ден', малу́йу—мале́йу; у—ы: був—быв, крук—крык; е—ы: жыне́—жыны́, нысе́—нысы́.* Для галоснага *і* ў гаворцы в. Сіманавічы склалася своеасаблівая сітуацыя. На сучасным этапе развіцця гэтай гаворкі ў мове пераважнай большасці яе носьбітаў галосны *і* пасля цвёрдых зычных ужываецца як факультатыўны варыянт галоснага *ы*, галоўным чынам у дзвюх пазіцыях: на месцы *о* ў новых закрытых складах і ў спалучэннях *гы, кы, хы.* У другім выпадку такое ўжыванне *і* характэрна пераважна для асоб, якія маюць або мелі цесныя кантакты з носьбітамі гаворак, якім (гаворкам) тыповы спалучэнні *гі, кі, хі.* У пазіцыі на месцы *о* ў новых закрытых складах пад націскам пераважная частка носьбітаў гаворкі ўжывае *ы* як асноўны варыянт гука, а *і* як яго факультатыўны варыянт. Аднак апошні, г. зн. *і*, малодшае і большасць прадстаўнікоў сярэдняга, а таксама частка старэйшага пакалення ўжывае спарадычна, частка людзей старэйшага пакалення — часта. У 60-я — пачатку 70-х гадоў XX ст. частка карэнных жыхароў в. Сіманавічы (у асноўным жанчыны), якія нарадзіліся ў 70—80-я гады XIX ст., у данай пазіцыі ўжывалі пераважна *і*; у гэтай сістэме галосны *ы* з'яўляецца факультатыўным варыянтам галоснага *і (біл'ш—был'ш, він—вын, стіл—стыл).* У другой палавіне XX ст. можна было назіраць паступовы пераход на старую сістэму гаворкі некаторых носьбітаў сіманавіцкай гаворкі пасля таго, як ім споўнілася 60 гадоў. Для старой сістэмы сіманавіцкай гаворкі характэрны бінарныя супроцьпастаўленні *і* з іншымі галоснымі ў націскным становішчы пасля цвёрдых зычных: *і—а: дій—дай, рій* 'рой'—*рай, ніс* 'нос'—*нас, тік* 'ток'—*так; і—о: рій—скрой, тік—вток; і—у: тік—тук* 'тлушч'; *сік* 'сок'—*сук; і—е: дійка* 'сасок каровы'—*дейка* 'чутка', *стіл—стел'а; і—ы: тік—тык* (выклічнік), *мій* (займеннік) — *мый* (дзеяслоўная форма), *рій* (назоўнік) — *рый* (дзеяслоўная форма). Мадэль «цвёрды зычны+*і*» (дзе *і*— асноўны варыянт) не існуе ўжо ў мове многіх карэнных жыхароў в. Сіманавічы, якія нарадзіліся ў канцы XIX ст., у той жа час яна часткова захавалася ў дыялектнай мове часткі школьнікаў (цвёрды *р* перад націскным *і* з *о* ў новых закрытых складах: *ріг, корівка*). Такім чынам, назіраецца з'ява пераходу *і>ы* ў новых закрытых складах пасля цвёрдых зычных. Галосны *і* ў сіманавіцкай гаворцы даволі шырока ўжываецца ў націскным становішчы пасля мяккіх зычных: *б'ілый, д'ід, р'ічка* і г. д.

Такім чынам, паводле прааналізаванага матэрыялу бінарных супроцьпастаўленняў, структура фанемнага складу гаворкі в. Сіманавічы наступная:

а) традыцыйная сіманавіцкая гаворка:



б) сучасная сіманавіцкая гаворка:



У традыцыйнай сіманавіцкай гаворцы галосныя *а, о, е, у, ы, і* з'яўляюцца асобнымі фанемамі. У сучаснай сіманавіцкай гаворцы асобнымі фанемамі, бясспрэчна, з'яўляюцца *а, о, е, у,* а галосныя *ы, і* не варыянты гэтых фанем. Фанематычныя суадносіны паміж галоснымі *і* і *ы* могуць быць больш канкрэтна высветлены пасля разгляду іх дыстрыбуцыі і суадносін з зычнымі.

Націскны вакалізм. Пазіцыя пасля цвёрдых зычных. Пазіцыя пад націскам пасля цвёрдых зычных з'яўляецца моцнай пазіцыяй для галосных у сіманавіцкай гаворцы. У гэтай пазіцыі пасля пераважнай большасці цвёрдых зычных, якія характэрны для гаворкі, ужываюцца галосныя *а, о, у, е, ы,* а ў мове часткі прадстаўнікоў старэйшага пакалення — таксама галосны *і* (на месцы націскнога *о* ў новых закрытых складах): *ба́чу, трава́, ма́ты, спа́ты, дав, там, за́муж, са́ло, наш, пчола́, ра́на, рыка́, ха́та, нога́, робо́та, во́л'а, зымо́вый, до́шка, то́нкый, розо́ра, со́нцэ, но́вый, поло́ла, моро́з, жо́втый, чо́рный, пошо́в, ко́рен', хо́лод, го́ры, бу́ра, плыву́, му́ха, пух, ду́майу, мыту́, зуб, трасу́, засну́, лу́пыт', бырý, скажу́, чу́йу, шум, ходжу́, ку́рыц'а, ху́тко, бе́рог, две́ры, ме́рзлый, пе́ршый, де́рыво, те́плый, вызе́, се́рце,*

нéбо, лéтав, дырé, жéныц'ц'а, вычéра, вышéн', такéйі, тыхéн'ко, гéрцаты, бы́ты, вы́ты, мы́ты, пы́ты, ды́рка, ты, зы́чу, сы́ла, воны́, лыты́, горы́т', жы́то, чы́стый, пошы́ла, гуркы́, лыхы́й, ворогы́; біл'ш, віз, мій, пійдыш, годівл'я, стіл, ніч, зірно, сіл', лій, рів, гужівка, зачіпка, шіпка, кіт, тхір, гіркый і г. д. У гаворцы не выяўлены спалучэнні: «шыпячыя+*а*», «*дз+а, о, е, і*», «*ц+о, у, і*», «*ф+у, ы, і*», «*дж+ы, і*», «*ґ+ы, і*». Пасля наступных зычных некаторыя галосныя ўжываюцца толькі ў асобных лексемах: *а* пасля *ф, ц, ґ* (*фáбрыка, цар, ґáнок*), *о* пасля *ф, ґ, дж* (*фóрточка, ґóнты, суджóный*), *у* пасля *дз, ґ* (*дз'індзýбел', ґýз'ік*), *е* пасля *дж, ф, ц, ґ* (*джéґаты, ґал'іфé, цéрква, цéркаты, ґéрґаты*), *ы* пасля *ц* (*цы́бы* 'доўгія ногі').

Пазіцыя пасля мяккіх зычных. Пасля мяккіх зычных пад націскам у сіманавіцкай гаворцы часта ўжываюцца галосныя *а, і, о*, ужыванне іншых галосных вельмі абмежавана.

Галосны *а* ўжываецца ў вялікай колькасці лексем пасля ўсіх мяккіх зычных, характэрных для гаворкі, акрамя *м', ф', дз', к', х', ґ', г'*, у адзінкавых выпадках пасля *п', дж'*: *чырв'áк, д'áкуваты, т'áшко, з'ат', вс'áкый, помын'áты, йáма, гл'áну, гр'áтка, ц'áц'ка, ж'áба, кач'áло, душ'á, луп'áйка, вырадж'áты* і г. д.

Галосны *і* ўжываецца ў вялікай колькасці лексем пасля ўсіх мяккіх зычных, якія характэрны для гаворкі, акрамя *дж'*, у адзінкавых выпадках пасля *к', х', ґ', г', ф'*: *б'ілый, чолов'ік, с(')м'іх, п'іс(')н'а, д'ід, т'іло, на ноз'і, выс'іл'е, с(')н'іг, пойіхав, хл'іб, гор'іхы, ц'іп, дз'ін'каты, нож'і, на пыч'і, на душ'і, к'іл'о* (і *кы́л'о*), *х'ілыц'ц'а* (і *хы́лыц'ц'а*), *ґ'іл'за, гімн, ф'ірма* і г. д.

Галосны *о* ўжываецца пасля зычных *в', м', д', т', з', с', н', й, л', ц', дз'*, з іх у значнай колькасці лексем толькі пасля *л'* і *с'*, не ўжываецца пасля мяккіх зычных *б', п', ф', р', ж', ч', ш', к', х', ґ', г'*: *с(')в'óкор, с'ім'óх* (і *с'імóх*), *д'óгот', пот'óкы, коз'óл, выс'ёлый, н'óхт'ік* 'дэкаратыўная расліна', *йóмко, зыл'óный, ц'óгла, дз'óвбаты* і г. д.

Галосны *у* ўжываецца пасля зычных *д', т', з', с', н', й, л', дз', ц'*, з іх у значнай колькасці лексем толькі пасля *л'*: *д'ýжыт', мут'ýн, з'ýз'а* (дзіцячае), *вс'ýды, н'ýхаты, вйун, л'ýде, дз'ýрка, коц'ýбнык* і г. д.

Галосны *е* ўжываецца ў абмежаванай колькасці лексем пасля мяккіх зычных *ф', д', т', н', й, л', ц', ж', ч', ш'*: *ф'éрма, сыд'éт', лыт'éт', кон'éм* (і *конéм*), *мойé, гол'л'é, кравц'éм* (і *кравцéм*), *корж'éм* (і *коржéм*), *быч'éм* (і *бычéм*), *душ'éйу* (і *душéйу*) і інш.

Вакалізм першага і другога пераднаціскных складоў. Пазіцыя пасля цвёрдых зычных. У першым і другім пераднаціскных складах пасля цвёрдых зычных ужываюцца галосныя *а, о, у, ы*. Дыстрыбуцыя іх шырокая: *барáн, вары́ты, малы́й, впадý, дал'óко, такы́й, забýвс', сады́ты, налы́ты, ламáты, рабы́й, жар'іты, шасты́т', часýйу, скажý, хавáйу, вгадáв, собачын'á, валовы́тый, змарновáвс', спаровáв, чудаковáтый, вталовáвсь, заробы́в, саночкы́, накладáв, ластовкы́, ратовáты, жартовáты, часнычóк, шановáты, катовáты, схамыны́с', гадын'н'é; бойáтыс', водá, молóты, полóты, дорóга, втомы́вс', зор'á, совá, ногá, ловл'ý, робл'ý, жовтóк, пчолá, шовкы́, кобы́ла, ходы́ты, холóдный, горóх; бочычкы́, ворушý, полы́т'ів, мóтовы́ло, досыд'ів, топоры́шче, зоды́нýла, солоды́в, ночовáты, ложычкы́, розыйшлы́с', жовтовáтый, чолов'ік, шостачóк, корыстáвс', холоднó, головá; будыты, мужы́к, пусты́в, душ'á, туды́, зубóк, сухы́й, лупы́ты, рубáты, журы́тысь, чужы́й, шукáты, чусáты, худы́й, гусáк; буйанá, мухомóр, дубн'ачóк, туповáтый, зухвал'ішый, судосы́ты, луговáйа, рубашкы́, журавéл', чужынá, шул'ачóк, курын'á, хутыр'і, гусачóк; бычóк, выдý, смыйýс', пысóк, дын'óк, тыпéр, зымá, сынóк, нымá, лыж'áты, рыкá, цыбýл'а, жытá, чысáты, вышывáла, кып'іты, хытáты, згынáты, быдовáв, выспывáв, пырыспáв, мышын'á, дырывы́на, тырыбы́ты, зылын'іты, сывовáтый, нымав'істы, лыбыдá, рышытó, цыловáв, жывотóк, чырывы́к, шылысты́т', кылывáтыс', хытровáтый, гыдовáтыс'* і г. д. У гаворцы не выяўлены спалучэнні: «*дз+а, о, у*», «*дж+а, о, у*», «*ц+о, у*», «*в+у*», «*н+у*», «*ф+ы*», «*ґ+ы*». Пасля наступных зычных некаторыя галосныя ўжываюцца толькі ў асобных лексемах: *а* пасля *ф, ц, ґ* (*фантáз'йа, фабрыкáнт, цар'á, цабарáк, ґазны́к, ґазнычóк*), *о* пасля *ф, ґ* (*фонáр, ґорґотáты*), *у* пасля *ф, ґ* (*фудбóл, ґумóвый*), *ы* пасля *дз, дж* (*бадзыґóн, джынджырýха, дзыґоны́т'*).

Пазіцыя пасля мяккіх зычных. У сіманавіцкай гаворцы структура «мяккі зычны+галосны» ў першым і асабліва ў другім пераднаціскных складах характэрна для вельмі абмежаванай колькасці лексем. Таму пры разглядзе вакалізму гэтай пазіцыі мы прыводзім амаль усе выяўленыя лексемы з такой структурай, акрамя часткі вытворных ад іх форм.

Ужыванне асобных галосных пасля мяккіх зычных у першым пераднаціскным складзе. Галосны *а* — пасля *в', д', т', з', с', н', й, л', ц'*: *с(')в'атый, д'ат'кы, т'агну́, вз'ала́, з'ат'ко́, кос'ако́м, з(')н'ала́, в йама́х, л'ал'кы, ц'ац'кы*. Галосны *о* — пасля зычных *в', т', с', й, л', ц'*: *с(')в'окру́ха* (і *свыкру́ха*), *в т'ото́к, выс'оло́, вс'ого́, його́, л'одо́к, пл'ова́ты, ц'оглы́ты*. Галосны *у*—пасля зычных *т', с', н', й, л', ц'*: *нат'уга́калы, с'уды́, н'ухну́в, йуро́к, л'уде́й, ц'уц'кы́*. Галосны *і* пасля зычных *в', м', д', т', з', н', й, л', г'*: *з(')в'іро́к* (і *звыро́к*), *з(')м'ійа́, д'ідо́к* (і *дыдо́к*), *в т'ін'і* (і *в тын'і*), *в т'іто́к, з'іл'л'а́, с(')н'іжо́к, в йійі, л'іса́к* (і *лысо́к*), *г'іта́ра*.

Выяўлены выпадкі ўжывання асобных галосных гукаў пасля мяккіх зычных у другім пераднаціскным складзе: галосны *а*: *л'аскот'іты, л'аоды́чын'н'а, л'асочкы́, мн'ахкова́тый, с(')в'аткова́ты*; галосны *о*: *л'окот'іты, пл'овачо́к, т'оточкы́* (і *т'іточкы́*), *дз'овбачо́к*; галосны *у*: *л'убын'а́*; галосны *і*: *л'ісовы́й* (і *лысовы́й*), *т'іточкы́* (і *т'оточкы́*), *к'іп'ато́к* (і *кыпйато́к*).

Пазіцыя іншых пераднаціскных складоў, акрамя першага і другога, у даследуемай гаворцы абмежавана невялікай колькасцю слоў: *ластовчын'а́, драпачова́ты, собачын'а́, чудакова́тый, затараба́н'у, пырылыт'іты* і інш.

Пазіцыя абсалютнага пачатку слова. Для вакалізму абсалютнага пачатку слова сіманавіцкай гаворкі характэрны наступныя асаблівасці.

1. Наяўнасць пратэтычнага *г* перад галосным у пачатку слова. Пратэтычны *г* паслядоўна ўжываецца людзьмі старэйшага пакалення, у мове людзей малодшага пакалення і сярэдняга ўзросту часта адсутнічае: *гокно́—окно́, го́зыро, го́чы, гове́чка — ове́чка*. Нярэдка ўжываецца *г* як пратэтычны гук у сярэдзіне слова: *нагучы́вс', позагу́шшу*.

2. Адпадзенне пачатковых галосных: *го́лка, гра, мырыка́нец'* 'амерыканец', *д'ікало́н*.

3. Паралельнае ўжыванне *в—у*, у тым ліку прыназоўнікаў *в—у*: *вб'ішты—уб'ішты, вз'а́ты—уз'а́ты, вда́тыс'—уда́тыс', впа́док—упа́док, в ха́ту— у ха́ту*. У разглядаемым становішчы ў межах сказа не ўжываецца толькі *в* або толькі *у*, а адбываецца іх своеасаблівае «чаргаванне», напрыклад: *у його́ була́ вда́ча* або *в його́ була́ уда́ча, влыв воды́ і умы́вс'а* або *улы́в воды́ і вмы́вс'а*.

Галосныя гукі ў абсалютным пачатку слова ўжываюцца наогул рэдка, у невялікай колькасці лексем, часцей за ўсё ў выклічніках, часціцах, словах кніжнага паходжання, словах, якія пачынаюцца з прыставак *об-, о-, од-, от-*, у мове сярэдняга і старэйшага пакалення ў словах, у якіх адпаў пратэтычны *г*. Адзначым выяўленыя выпадкі ўжывання галосных у разглядаемай пазіцыі.

1. Націскное становішча. Галосны *а*: *ах, ай, а́рм'ійа* (і *га́рм'ійа*), *а́н'ол* (і *га́н'ол*). Галосны *о*: *ох, ой, о́цот, о́браз* (часцей *го́браз*). Галосны *у*: *ух, уй, у́гол', у́гол'у* (родны склон), *Ул'а* (і *Гу́л'а*). Галосны *е*: *ех, ей*. Галосны *ы*: *ы́скра* (часцей *гы́скра* або *і́скра*), *ы* (адмоўс ў пэўных сітуацыях), *ых*. Галосны *і*: *іс'ц'іныбо́г* 'далібог', *іс'ц'іна — іст'іна, і́скра* (часцей *гы́скра*, часам *ы́скра*), *і́мынно* (і *гы́мынно*).

2. Ненаціскное становішча. Галосны *а*: *ага́, але́, ану́, ас'у́, аныжже́н', абы́, ал'бы́, ап'ін'ійа, анды́к, анды́чка* (часцей *гандык, гандычка*), *Андр'ій* (і *Гандр'ій*), *Аме́рыка* (і *Гаме́рыка*), *аршы́н* (і *гаршы́н*), *ан'о́лык* (і *ган'о́лык*). Галосны *о*: *об'і́д, обру́ч, ове́чка* (і *гове́чка*), *огу́лом, ожы́на* (і *гожы́на*), *оз'о́ра, окно́* (і *гокно́*), *окул'а́ры, ол'шы́на* (і *гол'шы́на*), *опе́н'кы, осо́т, ос'о́л, отото́, отр'а́д*. Ужываецца таксама ў вялікай колькасці слоў з прыстаўкамі *об-, о-, од-, от-*: *обобра́ты, отсу́нуты, острага́ты, осы́паты* і г. д. Галосны *у*: *углы́, улы́в* (і *влыв*), *умы́вс'а* (і *вмы́вс'а*), *Ул'а́на* (і *Вл'а́на*), *Украйі́на* (і *Вкрайі́на*). Галосны *е*: *егойі́ст* (і *ыгойі́ст*), *егойі́зм* (і *ыгойі́зм*), *еге́* (у гэтым слове склад-гук *е* некалькі працягваецца). Галосны *ы*: *ыкску́рс'ійа, ыґза́мен, ыґза́мынт, ыґзымпля́р, ыкспрэ́с* (і *експре́с*), *ыґы́* 'так'. Галосны *і*: *інвал'і́д, ікра́* (часцей *гыкра́*), *іс'ц'іныбо́г, інжын'е́р* (і *н'іжын'е́р*).

Паказальна, што ў абсалютным пачатку слова ў ненаціскным становішчы ў словах кніжнага паходжання, як і наогул у пераднаціскных складах, адбываецца нейтралізацыя *е—ы* ў галосным *ы*.

Пасляпаціскныя адкрытыя неканцавыя склады. Пазіцыя пасля цвёрдых зычных.

У данай пазіцыі ўжываюцца галосныя *а, о, у, ы*: *вы́бачыв, вы́варыв, вы́мазаты, ту́паты, вы́падала, вы́тахаты, ма́заты, з о́самы, з малы́намы, вы́ламав, вы́радыла, лэ́жачы, ба́чачы, пов'і́шала, пла́каты; но́вого, то́пол'а, вы́молов, вы́дою, жо́втого, твыро́зого, вы́солопыв, вы́косыв, ко́лоса, вы́росывс', ры́жого, ка́ччого, на́шого, ды́кого, дру́гого, ты́хого; вы́була, вы́мутыв, вы́пудыв, вы́думав, вы-*

стукав, вы́зубылос', вы́сунув, гл'а́нуты, вы́лупылос', вы́рубав, вы́жухала, вы́чудыв, вы́шукайу, вы́кочу, вы́гуду, вы́хухав; вы́быты, ста́выла, ко́мына, вы́пытав, гла́дыты, ма́тыра, го́зыро, вы́сыпав, ра́ныло, ко́лысо, па́рыла, ва́жыты, ба́чыла, вы́шыла, ба́нкыйу, ты́хыйу, дру́гыйу і г. д. Не выяўлены спалучэнні: «*ф+а, о, у*», «*дз+а, о, у, ы*», «*дж+а, о, у, ы*», «*в+у*», «*ґ+у*», «*ц+у*». Толькі ў некаторых лексемах ужываюцца *ы* пасля *ф, ґ, ц* (*шо́фыра, шпа́ґыйу, вы́цыдыв*); галосныя *а* пасля *ґ*, *о* пасля *ґ, ц* (*шпа́ґамы, вы́горґотав, о́цоту*). Галосныя *ы, е, і* нейтралізуюцца ў гуку *ы* (*бы́ты—вы́быв, ка́мен'—ка́мын'а, ко́рен'—ко́рын'а, б'і́лый—вы́былыв, д'і́лыт'—вы́дылыв*), гэтым у значнай меры тлумачыцца шырокая дыстрыбуцыя апошняга. Ужыванне галосных *а, о, у* больш абмежавана ў параўнанні з першым і другім пераднаціскнымі складамі.

Структура вакалізму паслянаціскных адкрытых неканцавых складоў пасля цвёрдых зычных супадае з сістэмай вакалізму пераднаціскных складоў пасля цвёрдых зычных (табл. 3).

Пазіцыя пасля мяккіх зычных. У гэтай пазіцыі параўнальна шырокая дыстрыбуцыя галоснага *а*, значна абмежаваная дыстрыбуцыя *і*, галосныя *о, у* ўжываюцца ў невялікай колькасці лексем.

Галосны *а* ўжываецца пасля зычных *д', т', з', с', н', й, л', ц', ж', ч', ш'* у значнай колькасці лексем: *хо́д'ачы, вы́т'аты, ла́з'ачы, м'і́с'ац'а, вы́йн'аты, в'і́йаты, вы́л'акав, па́л'ц'амы, вы́ж'ала* (і *вы́жала*), *вы́ч'авыты* (і *вы́чавыты*), *вы́выш'ала* (і *вы́вышала*) і г. д. Галосны *о* ўжываецца пасля *н'* у асобных лексемах, у канчатках прыметнікаў пасля *д', с', л', ц'*: *кра́йн'ого, л'і́т(')н'ого, жы́т(')н'ого, ґо́д'ова* (*Год'*—прозвішча), *ве́с'оло, Ме́л'ова* (*Ме́л'о*—імя), *грыц'ова* (*Грыц'*— імя). Галосны *у* ўжываецца ў асобных лексемах пасля зычных *й, л'*, зрэдку пасля *д', н', с', ц'*: *ма́йучы, в'і́йучы, ко́л'учы, ме́л'учы, вы́д'ужыв, вы́н'ухав, по́с'уха, ко́ц'убу*. Галосны *і* ўжываецца ў значнай колькасці выпадкаў пасля зычных *н', й, л', ц'*, у асобных лексемах пасля *д', т', з', с'*: *вы́шн'і́йу, чыре́шн'і́йу, скро́йіты, вы́йіхаты, вы́л'л'і́мо, до́л'і́йу, ку́рыц'і́йу, рукавы́ц'і́йу, з На́д'і́йу, з В'і́т'і́йу, ма́з'і́йу* (*ма́з'а*—'капрызнік'), *ко́с'і́йу* (*кос'а* — 'конь, жараб'ё' дзіячае).

Паслянаціскныя закрытыя неканцавыя склады. У паслянаціскных закрытых неканцавых складах ужываюцца тыя ж галосныя, што і ў складах паслянаціскных адкрытых неканцавых (пасля цвёрдых зычных — *а, о, у, ы*; пасля мяккіх — *а, о, у, і*), аднак у вельмі абмежаванай колькасці выпадкаў: *ко́пачка, ла́вочка, вы́пустыв, вы́грыблы, вы́т'агну, нас'і́н(')н'і́чко, кор'і́н(')н'і́чко, по́йізда, вы́л'уд(')н'ав, вы́ц'оглыв, вы́дз'овбав* і інш.

Паслянаціскныя канцавыя склады. Пазіцыя пасля цвёрдых зычных. Структура вакалізму паслянаціскных канцавых складоў у сіманавіцкай гаворцы ў аснове характарызуецца агульнасцю, аднак ёсць пэўныя адрозненні ў дыстрыбуцыі асобных галосных у залежнасці ад закрытасці або адкрытасці канцавога паслянаціскнога складу.

Пасля цвёрдых зычных у адзначанай пазіцыі ў вялікай колькасці лексем ужываюцца галосныя *а, о* (у закрытых складах), *у, е, ы*: *вы́рубав, вы́рвав, сы́пав, ду́май, па́дай, вы́пытай, ма́зав, вы́кусав, вы́гнав, по́плав, вы́брав; ры́ба, коро́ва, вдо́ма, ла́па, ра́да, мн'а́та, во́за, по́йаса, с'і́на, б'і́ла, па́ра, са́жа, хоро́ша, кру́ча, ды́ка, ты́ха, до́вга; вы́бой, вы́мок, гр'а́дом, сы́том, во́зом, но́сом, мы́шечок, вы́йшов, шо́вком, вы́ход, вы́гон; вы́був, в но́вуй, за́муж, вы́пус'ц', вы́дув, вы́пытуй, вы́сун', выр'і́зуй, на́нуч, в б'і́луй, вы́руч, закру́чуй, выгру́жуй, зав'і́шуй, вы́куп, вы́руб, розма́хуй; ры́бу, здоро́ву, соло́му, лы́пу, во́ду, сы́ту, ло́зу, на ро́су, ста́ну, б'і́лу, в по́ру, р'і́жу, на́шу, хо́чу, доро́гу, ды́ку, ты́ху; глы́бей, де́вет', ка́мен', хло́пец', го́родец', рышо́тей, ко́зей, де́сет', ко́ней, па́лец', ко́рен', ры́жец', гро́шей, ко́роччей, р'і́кей, му́хей, кры́гей; вы́грыбе, но́ве, вы́йме, вы́тыпе, пы́йде, то́всте, вы́лызе, вы́нысе, чо́рне, ко́ле, го́ре, со́нце, пор'і́же, хо́че, на́ше, то́нке, до́вге, ты́хе; вы́быв, но́вый, вы́мыв, то́пыт', хо́дыт', сы́тый, ла́зыв, ко́сыт', го́ныт', вы́лыв, хво́рый, вы́жын', ба́чыт', хоро́шый, коро́ткый, ты́хый, до́вгый; ж'а́бы, здоро́вы, лы́пы, са́мы, пого́ды, на моро́зы, спа́ты, гу́сы, чо́рны, на ла́вцы, с(')в'і́жы, сто́йачы, мы́шы, ды́кы, л'а пот'і́хы, но́гы* і г. д. Не выяўлены спалучэнні ў закрытых складах: «*ф+а, е, у, ы*», «*дз+а, е, о, у, ы*», «*дж+ы, о, у*», «*г+у*». Не выяўлены спалучэнні ў адкрытых складах: «*ф+а, о, у, е, ы*», «*дз+а, о, у, е, ы*», «*ц+о, ы*», «*г+е, ы*». Ужываюцца толькі ў асобных лексемах у закрытых складах: *а* пасля шыпячых, заднеязычных, *ґ* (*вы́жав* і *вы́ж'ав, в'і́шай, звы́чай, кры́кав, вы́пхав, б'і́гав, дры́ґав*), *о* пасля *в, п, ф, ц, ж, г* (*двух слы́вок, с'і́м ш'а́пок, фо́рфор, про́цом, о́жог, д'о́-*

гот'), *у* пасля *ц* (*про́цув*), *е* пасля *ґ, ц* (*го́ґер, пша́ґей, ґы́цел'*). Ужываюцца толькі ў асобных лексемах у адкрытых складах: *а* пасля *ґ, ц* (*ґул'і́ґа, ныма про́ца*), *о* пасля *б, в, м, п, д, т, з, с, н, л, р, ж, ч, ш, ґ, г, к, х* (*не́бо, сла́бо, сы́во, такса́мо, с(')в'а́то, ходы́ты бо́со, ра́но, ма́ло, на́шо* 'навошта', *ды́ко, ты́хо, до́вго* і ў клічных формах: *лы́по, коло́до, ґа́зо, па́ро, мо́чо, шпа́го*), *у, ы* пасля *ґ* (*шпа́ґу, ґулі́ґу, шпа́ґы, ґул'і́ґы*).

Пазіцыя пасля мяккіх зычных. Пасля мяккіх зычных у паслянаціскных канцавых складах ужываюцца галосныя *а, о, у, е, і*, з іх галосныя *а, і, е, у* — у адкрытых складах, галосныя *у, е* — у закрытых складах у значнай колькасці лексем, галосныя *а, і* — у закрытых складах даволі абмежавана; вельмі абмежавана ўжыванне *о*, асабліва ў закрытых складах.

Галосны *а* ўжываецца ў адкрытых складах у значнай колькасці лексем пасля зычных *н', й, л', ц'*, у невялікай колькасці выпадкаў пасля *д', т', з', с'*, у адным слове пасля *дз'* (*ныма ґо́з'дз'а*); у закрытых складах ужываецца абмежавана пасля *в', т', н', й, ц', ж', ч', ш'*: *клу́н'а, стара́йа, во́л'а, ро́быц'ц'а, жолы́д'д'а, пла́т'т'а, полы́з'з'а, колы́с'с'а, ґо́з'дз'а, вы́с(')в'ат', вы́т'ав, вы́йн'ав, вы́пйавс', хло́пц'ам, вы́ж'ав* (і *вы́жав*), *вы́ч'ав* (і *вы́чав*), *вы́выш'ай* (і *вы́вышай*). Галосны *о* ўжываецца ў адкрытых складах у клічнай форме, якая для тых аб'ектаў, што не абазначаюць прыналежнасці да чалавека, ужываецца толькі ў асобных сітуацыях, у імёнах пасля зычных *д', т', з', с', н', й, л', ц'*, у закрытых складах — усяго ў некалькіх лексемах пасля *д', т', н', й, ц'*: *Ме́л'о* 'Амелян', *Ка́д'о* 'Аркадзь', клічныя формы: *На́д'о, Ка́т'о, ма́з'о, Ду́с'о, Ма́н'о, шы́йо, га́йц'о; ныго́д'он, в'і́т'ор, вы́т'ор* (і *вы́тер*), *вы́н'ос* (і *вы́ныс*), *ба́йок, Гры́ц'ов*. Галосны *у* ўжываецца ў адкрытых складах у значнай колькасці лексем пасля зычных *н', й, ц'*, у невялікай колькасці выпадкаў пасля *д', з', с', л'*, у закрытых складах у значнай колькасці выпадкаў пасля *н', й, л', ц'*, у асобных лексемах пасля *д', з', с'*: *клу́н'у, ма́йу, полы́ц'у, В'і́т'у, ма́з'у, Ва́с'у, ку́пл'у, ко́н'ум, в жы́т(')н'уй, в'і́йут', ко́л'ут', го́с'ц'ум, л'у́д'ум, ко́з'ум, в ко́с'ух*. Галосны *е* ўжываецца пасля зычных *д', т', з', с', н', л', й, ц'*: *жолы́д'е, пла́т'т'е, полы́з'з'е, колы́с'с'е, кор'і́н'н'е, кы́л'л'е, с'і́йе, шч'а́с'ц'е; жолы́д'е́м, пла́т'т'е́м, полы́з'з'е́м, колы́с'с'е́м, кор'і́н'н'е́м, кы́л'л'е́м, з бо́йе́м, шч'а́с'ц'е́м*, у закрытых складах толькі ў слове *ґо́з'дз'ем* пасля *дз'*. Галосны *і* ўжываецца ў адкрытых складах пасля зычных *н', й, л', ц'* у значнай колькасці лексем, пасля *д', т', з', с', дз'* у адзінкавых выпадках, у закрытых складах вельмі абмежавана пасля тых жа зычных, што і ў адкрытых складах: *в клу́н'і, молоде́йі, во́л'і, травы́ц'і, па́л'ц'і; в жолы́д'д'і, в пла́т'т'і, на полы́з'з'і, на полы́с'с'і, ґо́з'дз'і; пр'а́н'ік, вы́йід', тка́л'л'ін, травы́ц'ін, Воло́д'ік, Ка́т'ін, ма́з'ін, вы́с'ім, ґо́з'дз'ік*.

Трэба адзначыць, што галосныя ў сіманавіцкай гаворцы ў розных пазіцыях адрозніваюцца шырокай або абмежаванай дыстрыбуцыяй. Шырокая дыстрыбуцыя: пасля цвёрдых зычных для ўсіх галосных ва ўсіх пазіцыях, за выключэннем пазіцыі для *о* ў канцавых адкрытых паслянаціскных складах; пасля мяккіх зычных для галосных *і, а* ў націскных складах, а таксама для ўсіх галосных, акрамя *о*, у паслянаціскных канцавых адкрытых складах; у абсалютным пачатку слова не пад націскам для *о*. Абмежаваная дыстрыбуцыя: для большасці пазіцый (акрамя адзначаных для шырокай дыстрыбуцыі) пасля мяккіх зычных і ў абсалютным пачатку слова; для *о* ў канцавых адкрытых ненаціскных складах пасля цвёрдых зычных. Структуры вакалізму гаворкі в. Сіманавічы паказаны ў табл. 3.

Фізічная рэалізацыя галосных. У сіманавіцкай гаворцы галосныя *а, о, у, е, і* па сваіх артыкуляцыйных і акустычных якасцях амаль поўнасцю ці з невялікімі адхіленнямі супадаюць з адпаведнымі гукамі беларускай, рускай і ўкраінскай літаратурных моў. Галосны *ы* ў сіманавіцкай гаворцы адрозніваецца ад *ы* ў беларускай і рускай літаратурных мовах, ён блізкі да галоснага *и* ва ўкраінскай літаратурнай мове. Гэта галосны пярэдняга (пярэдне-сярэдняга) рада верхняга пад'ёму, аднак некалькі паніжаны ў напрамку да сярэдняга пад'ёму. У адрозненне ад *ы* ў беларускай літаратурнай мове галосны *ы* ў сіманавіцкай гаворцы больш пярэдні, некалькі больш вузкі, некалькі паніжаны і вымаўляецца з меншай напружанасцю.

Адным з найбольш важных фактараў, якія ўплываюць на змены галосных у моўным патоку даследуемай гаворкі, з'яўляецца націск. Націскныя галосныя адрозніваюцца ад ненаціскных большай інтэнсіўнасцю і напружанасцю вымаўлення, большай працягласцю, а таму і большай выразнасцю артыкуляцыі і якасці ўласнага

Табліца 3

Агульная структура вакалізму гаворкі в. Сіманавічы

Пазіцыі	Абсалютны пачатак слова	Пасля цвёрдых зычных	Пасля мяккіх зычных
1-ы і 2-і перадна-націскныя склады	*і*** *у*** *ы** *о*** *е*** *о* *а**	*у* *ы* *о* *а*	*і*** *у*** *о*** *а***
Націскныя склады	*і*** *у*** *ы*** *е*** *о*** *а***	*і* *у* *ы* *е* *о* *а* *у* *ы* *е* *о* *а*	*і* *у** *е** *о** *а*
Паслянаціскныя неканцавыя склады	—	*у* *ы* *о* *а*	*і** *у*** *о*** *а*
Паслянаціскныя канцавыя закрытыя склады	—	*у* *ы* *о* *а*	*і** *у* *е* *о*** *а**
Паслянаціскныя канцавыя адкрытыя склады	—	*у* *ы* *е* *о** *а*	*і* *у* *е* *о** *а*

Умоўныя абазначэнні: * — значная абмежаванасць ужывання гука; ** — вялікая абмежаванасць ужывання гука.

тэмбру. Галосныя ў канцавых ненаціскных складах (асабліва ў адкрытых) у гэтых адносінах займаюць прамежкавае становішча паміж галоснымі націскных і астатніх ненаціскных складоў. Нярэдка галосныя націскных і канцавых ненаціскных складоў моцна падаўжаюцца.

У ненаціскных неканцавых складах галосныя заўсёды вымаўляюцца коратка. У гэтай пазіцыі яны адрозніваюцца ад націскных галосных колькасна і якасна. Таму ненаціскным кароткім галосным уласціва тэндэнцыя да якасных змен, да страты ўласнага тэмбру, да ператварэння ў гук невыразнага тэмбру, да набыцця тэмбру артыкуляцыйна і акустычна блізкага гука. У сіманавіцкай гаворцы ў ненаціскных неканцавых складах адзначаныя тэндэнцыі праяўляюцца неаднолькава для розных галосных пасля цвёрдых і мяккіх зычных. Разгледзім спачатку гэтыя тэндэнцыі для ўсіх ненаціскных галосных, характэрных для гаворкі, у пазіцыі пасля цвёрдых зычных.

1. Тэндэнцыя да кароткага вымаўлення, як ужо гаварылася, характэрна для ўсіх галосных. Пры гэтым галосны не губляе свайго ўласнага тэмбру.

2. Пераход у гук вельмі кароткі, рэдуцыраваны, гук нявызначанага тэмбру ъ характэрны для галоснага *ы*, які выходзіць за межы інтанацыйна-лагічнага націску: *тыпéр—тъпéр, высна́—въсна́, бычóк—бъчóк, до мáтыра—до мáтъра, дéрыво—дéръво.* Ужываецца ъ на месцы *ы* даволі часта. Нярэдка таксама *е* ў канцавых закрытых складах рэалізуецца ў гуку ъ: *пáмет'—пáмът', хлóпец'—хлóпъц'.*

3. Набыццё асаблівасцей гука, блізкага артыкуляцыйна і акустычна.

а) *е—ы.* Спарадычна, часцей за ўсё ў мове прадстаўнікоў старэйшага пакалення, у ненаціскных складах назіраецца вымаўленне *ы* з некаторым паніжэннем, г. зн. набыццём якасцей гука *е: забы(е)рé, ты(е)пéр, ды(е)тына, до сы (е)бé.* У канцавых закрытых складах у некаторых лексемах даволі часта галосны *е* набывае якасці галоснага *ы: пáме(ы)т', кóме(ы)н, гýле(ы)й* і г. д.

б) *о—у.* Набыццё гукам *о* якасцей гука *у*, г. зн. змяненне яго артыкуляцыі ў напрамку да больш задняга і больш верхняга становішча і вымаўленне яго больш вузка, характэрна для ўсіх носьбітаў гаворкі, аднак у невялікай колькасці слоў. Часцей за ўсё ўжываюць такі факультатыўны варыянт галоснага *о* прадстаўнікі старэйшага пакалення: *ко(у)вáл', ко(у)вáты, ко(у)мý, го(у)до(у)вáты, ночо(у)вáв, ночо(у)вáты, пожо(у)вáв, жо(у)вáты, ко(у)вáдло.* Як бачым, у прыведзеных прыкладах змена праяўляецца пасля зычных *к, ч, ж, д* перад складам *-ва-*.

Прыкладна такі ж характар набыцця гукам *у* якасцей гука *о* (у некаторых словах пераважна прадстаўнікамі старэйшага пакалення): *ду(о)бóчок, ру(о)сáлка, бу(о)мáга, ку(о)л'тýра, жу(о)рахлы́ны, пу(о)дыйшóв,*

су(о)с'ід, му(о)мрыта́ты, ту(о)потыт', гу(о)ду́, на чу(о)жын'і, жу(о)раве́л', ку(о)па́ла, му(о)ро(у)ва́ты, пу(о)дн'а́в, ку(о)лачо́к, пу(о)хо́вый. Відаць, вынікам змянення якасці гукаў *о, у* з'яўляецца пераход у асобных словах *о>у (кома́р>кума́р), у>о (бубон'іты>бобон'іты).*

в) *ы—о.* Адзінкавыя выпадкі: *спы(о)ва́ты, зо(ы)зу́л'а, жы(о)рло́, або(ы)гна́в, сто(ы)йіт'.* Можна меркаваць, што прычынай тэндэнцыі з'яўляюцца паралелізмы: *зозу́л'а* і *зызу́л'а, жырло́* і *жорло́.*

У наступных парах гукаў, блізкіх артыкуляцыйна і акустычна, набыцця адным членам пары якасцей другога члена той жа пары ў выніку рэдукцыі не выяўлена: *а—о, а—е, ы—у, е—о.*

Галосныя ў націскных складах могуць аказацца не пад інтанацыйна-лагічным націскам, што таксама прыводзіць да іх скарачэння і адпаведных змен. Апошняе датычыцца *ы* ў новых закрытых складах пад націскам, дзе гэты гук можа рэдуцыравацца (*вын—вън* 'ён'), набываць некаторыя якасці гука *о* (*вы́л—вы(о)л* 'вол'). У новых націскных закрытых складах на месцы *о* прадстаўнікі старэйшага пакалення, акрамя *ы*, вымаўляюць часта *і* (таксама *ы(і), і(ы)*), а некаторыя — пераважна *і*. Пры такой варыятыўнасці *і—ы* вымаўляецца доўга як *і*, так і *ы*, аднак пры кароткім вымаўленні часцей вымаўляецца *ы*.

У сіманавіцкай гаворцы захаваліся спалучэнні *гы, кы, хы: дывкы́, гуркы́, хы́трый, но́гы, нымá ш'а́пкы, ты́хый.* Аднак у мове некаторых асоб (звычайна тых, якія знаходзіліся ў цесных кантактах з носьбітамі іншых гаворак) ужываюцца паралельна *гы, кы, хы—гі, кі, хі—г'і, к'і, х'і* або пераважаюць апошнія, асабліва ў націскных складах.

Уплыў артыкуляцыі суседніх мяккіх зычных на галосныя (65) у сіманавіцкай гаворцы праяўляецца галоўным чынам у некаторым змяненні артыкуляцыі галосных у напрамку да іх больш пярэдняга вымаўлення (асабліва выразна гэта праяўляецца для галоснага *а* пасля мяккіх шыпячых). Рэдукцыя галосных пасля мяккіх зычных значна меншая, чым пасля цвёрдых.

Факультатыўныя варыянты галосных сіманавіцкай гаворкі паказаны ў табл. 4.

Табліца 4

Факультатыўныя варыянты галосных даследуемых гаворак*

Вёскі	Асноўныя варыянты галосных	Факультатыўныя варыянты галосных: націскныя склады	Факультатыўныя варыянты галосных: ненацiскныя склады
Сіманавічы	*у*	—	*у(о)*—3, *о(у)*—3
	о	—	*о(у)*—3, *у(о)*—3, *о(ы)*—3
	а	—	—
	е	—	*е(ы)*—1
	ы	*і*—1, *і(ы)*—2, *ы(і)*—2, *ы(о)*—3, *ъ*—3	*ъ*—1, *ы(е)*—2, *ы(і)*—3, *і(ы)*—3, *і*—3, *ы(о)*—3
	і	—	—
Папіна	*у*	—	*у(о)*—3
	о	—	*о(у)*—2, *у(о)*—3, *о(ы)*—3
	а	—	—
	е	*е(а)*—2	—
	ы	*ы(е)*—1, *ы(і)*—3, *і(ы)*—3, *і*—3, *ъ*—3	*ы(е)*—1, *ъ*—1, *і(ы)*—1, *ы(і)*—2, *і*—2, *ы(о)*—3
	і	—	—
Заяленне	*у*	*у(о)*—2	*у(о)*—3
	о	—	*о(у)*—3, *о(ы)*—3
	а	—	—
	е	—	*е(ы)*—3
	ы	*ы(і)*—2, *і(ы)*—2, *і*—3	*ы(і)*—1, *і(ы)*—1, *ъ*—1, *і*—2, *ы(е)*—3
	і	*і(ы)*—2, *ы(і)*—2, *ы*—3	*і(ы)*—1, *ы(і)*—1, *ы*—3
Субаты	*у*	—	*у(о)*—3, *о(у)*—3
	о	—	*о(у)*—2, *у(о)*—3, *ъ*—3, *о(і)*—3
	а	*а(е)*—3	*а(е)*—3
	е	—	—
	і	*і(ы)*—2, *ы(і)*—2, *ы*—3, *ъ*—3	*ъ*—в. ч.**. *і(ы)*—1, *ы(і)*—2, *і(е)*—2, *ы*—3

* Лічбамі абазначана ступень адноснай частотнасці ўжывання факультатыўных варыянтаў гукаў: 1—часта, 2—спарадычна, 3—адзінкавыя выпадкі.

** в. ч. — вельмі часта, амаль у такой ступені, як асноўны варыянт гука.

Кансанантызм

Зычныя фанемы. У сіманавіцкай гаворцы існуе 45 асноўных варыянтаў зычных гукаў: *б, б', в, в', м, м', п, п', ф, ф', д, д', т, т', з, з', с, с', н, н', л, л', р, р', ц, ц', дз, дз', ж, ж', ч, ч', ш, ш', дж, дж', й, к, к', х, х', г, г', ґ, ґ'.*

Фанемны статус зычных гукаў сіманавіцкай гаворкі, як і фанемны статус галосных, вызначаецца пры аналізе бінарных супроцьпастаўленняў на ўзроўні словаформы (мінімальныя пары) або мадэлі (сегменты). Пры наяўнасці 45 асноўных варыянтаў зычных для вызначэння фанемных суадносін кожнага з іх неабходна разгледзець 990 пар. Але для інтэрпрэтацыі пэўнага гука як фанемы пры выкарыстанні фаналагічнай адзінкі поліфанемы (48, *34—37*) дастаткова бінарнага супроцьпастаўлення яго з іншымі гукамі на ўзроўні мадэлі, г. зн. устанаўлення ўжывання гэтых гукаў у ідэнтычных фанетычных умовах. Апошняе для сіманавіцкай гаворкі фактычна праароблена пры аналізе ў ёй дыстрыбуцыі галосных, і такім чынам фактычна даказана наяўнасць у гэтай гаворцы поліфанем *б—б'—п—п'*, *в—в'—ф—ф'*, *д—д'—т—т'*, *н—н'*, *м—м'*, *з—з'—с—с'*, *л—л'*, *р—р'*, *ц—ц'—дз—дз'*, *ж—ж'—ш—ш'*, *ч—ч'—дж—дж'*, *к—к'—ґ—ґ'*, *г—г'—х—х'* і фанемы *й*.

Значыць, для фаналагічнай інтэрпрэтацыі зычных гукаў сіманавіцкай гаворкі дастаткова разгледзець бінарныя супроцьпастаўленні пар па цвёрдасці-мяккасці і звонкасці-глухасці ў тых выпадках, калі зычныя адрозніваюцца паміж сабой канстытутыўнай адзнакай.

Парныя па цвёрдасці-мяккасці. Пярэдне- і сярэднеязычныя. *Д—д'*: *выда́к — д'а́куваты; т—т'*: *пта́шка — т'а́шко; з—з'*: *сказа́в — вз'ав; с—с'*: *быз со́лы — выс'о́лый; н—н'*: *по́вна — по́вн'а; л—л'*: *клав — кл'ав; р—р'*: *раз — бр'а́зну; ц—ц'*: *прыцо́пкавс' — с'ц'о́пка; дз—дз'*: *дз'індэ́убел' — дз'у́рка; ж—ж'*: *же́ныц'ц'а — лыж'е́т'; ч—ч'*: *пыче́мо — быч'е́м; ш—ш'*: *ше́рхне — спыш'е́т'; дж—дж'*: супроцьпастаўленняў не выяўлена.

Заднеязычныя і фарынгальныя. Для пар *к—к'*, *х—х'*, *г—г'*, *ґ—ґ'* супроцьпастаўленняў не выяўлена. Мяккія заднеязычныя і фарынгальныя ўжываюцца толькі ў асобных лексемах перад *і*: *к'іл'о і кы́л'о, к'іра́т* і інш.

Губныя. У мове часткі старэйшых карэнных жыхароў в. Сіманавічы мяккія губныя, акрамя *в'*, ужываюцца толькі перад націскным *і<ѣ*. Яны бінарна супроцьпастаўляюцца цвёрдым губным, таму з'яўляюцца асобнымі фанемамі: *б'ілый — біл'ш; Він б'іг по дорозы.— А біг його знайе.* Зычныя *ф, ф'* некаторыя прадстаўнікі старэйшага пакалення не ўжываюць. У мове пераважнай часткі носьбітаў сіманавіцкай гаворкі непасрэдна бінарна не супроцьпастаўляюцца галосны *і* галоснаму *ы*, а таксама губныя *б', м', п'* адпаведным цвёрдым губным, што не дае непасрэдных падстаў лічыць *і, б', м', п'* асобнымі фанемамі. З другога боку, існуе на ўзроўні словаформы бінарнае супроцьпастаўленне мадэлей «мяккі губны + *і*» і «цвёрды губны + *ы*»: *Вона́ його́ была. В кро́ват'ух высо́кы была.— В мыне́ корова б'іла; Вы́йе вовк.— В'ійе в'іт'ор; Выв воровкы́.— В'ів коро́ву; А быг його́ зна́йе.— Тут за́ре за́йец' б'іг; Оде́жу мы́лы.— Мало м'ілы, ху́тко з'з'ілы; Ныц ны вм'ійу робы́ты.— Вмы́йу дыты́ну; Жы́то в коп'і.— Нымá копы́.* Гэты факт сведчыць аб тым, што як у мадэлі «цвёрды губны + *ы*», так і ў мадэлі «мяккі губны + *і*» заключана фаналагічная значнасць. Застаецца пакуль нявысветленым, як гэта фаналагічная значнасць суадносіцца (размяркоўваецца) з гукамі мяккімі губнымі і галосным *і*.

Мяккі *в'*, акрамя пазіцыі перад націскным *і<ѣ*, ужываецца яшчэ ў некаторых лексемах: *с(')в'а́то, чырв'а́к, ц'в'ах, с(')в'о́кор, с'ім в'орст, з(')в'о́зды, ков'о́р, пырыз(')в'а́не, з(')в'аза́ты, з(')в'агы́каты* і ў вытворных ад іх словах (*с(')в'аты́й, выс(')в'а́чуваты, с(')в'окр'ів, в'о́рсты, з(')в'а́же* і г. д.). Улічваючы наогул слабую супроцьпастаўленасць у сіманавіцкай гаворцы многіх мяккіх фанем адпаведным цвёрдым, інтэрпрэтуем у ёй мяккі *в'* як асобную фанему. Мяккія губныя *м', п'*, акрамя пазіцыі перад націскным *і<ѣ*, выяўлены толькі як паралельна ўжывальныя поруч з цвёрдымі *м, п* у словах: *с'ім'о́х — с'імо́х, вос'м'о́х — вос'мо́х, луп'а́йка — лупйа́йка, с(')п'ет — спйет', тырп'е́т' — тырпйе́т', хрып'е́т' — хрыпйе́т'*. Таму ў мове пераважнай большасці носьбітаў сіманавіцкай гаворкі фаналагічны статус *б', м', п'* адрозніваецца ад фаналагічнага статусу *в'*.

Зычныя *ф, ф'* ужываюцца ў значнай колькасці слоў кніжнага паходжання прадстаўнікамі сярэдняга і малодшага пакалення. Ужыванне *ф'* абмежавана пазіцыяй перад націскным *і* (*ф'із'іка* і інш.), а выпадкаў ужывання *ф* перад націскным *ы* — гукам, блізкім да *і* артыкуляцыйна, акустычна і ў фаналагічным аспекце, не выяўлена. Таму *ф'* інтэрпрэтуем як камбінаторны варыянт фанемы *ф*.

Парныя па звонкасці-глухасці. Выкарыстоўваючы паняцце фаналагічнай адзінкі поліфанемы,

разглядаем пары толькі цвёрдых звонкіх і глухіх зычных (выключэннем з'яўляюцца мяккія *ц', дз'*, якія ўжываюцца значна шырэй, чым адпаведныя цвёрдыя *ц, дз*). *Б—п: бóре—пóре; в—ф: вáра — фáра; д—т: дам — там; з—с: козá — косá; дз—ц: бадзыґóн — цыбáтый; дз'—ц': ґóз'дз'а — гыс'ц'а; ж—ш: жы́ла — шы́ла; дж—ч: сыджý — чýйу; ґ—к: ґáнок — ткáне; г—х: дорóгыйу — стр'іхыйу.*

Іншыя пары зычных, якія адрозніваюцца толькі адной канстытутыўнай адзнакай: *з—ж: позовý — жовáты; с—ш: пáса — пáша; г—ґ: Докопáвс'а до грýнту, вже грунт.— Мын'і ґрунт прывысты́ с'іно, а поношý йогó в клýн'у пóсл'а; т—ц: тыбé — цыбýл'а; д—дз: дуб—дз'індзýбел'; т'—ц': т'іло — ц'іле; д'—дз': под'ін' — дз'ін'каты; ц—ч: йіцé — тычé; дз—дж: дз'індзýбел' — ходжý; ц'—ч': в руц'і — в пыч'і; дз'—дж': супроцьпастаўленняў* не выяўлена; *н—л: вонá — волá; н—р: сын — сыр; л—р: лы́ты — ры́ты; н'—л': н'іс — л'іс; н'—р': н'іс — р'іс; л'—р': л'іс — р'іс.*

Паводле прааналізаванага матэрыялу, зычныя *б, в, в', п, ф, д, д', т, т', з, з', с, с', н, н', й, л, л', р, р', ц, ц', ж, ж', ч, ч', ш, ш', к, х, г, ґ* з'яўляюцца самастойнымі фанемамі. Зычныя *ф', к', х', г', ґ', дж'* — камбінаторныя варыянты адпаведных цвёрдых фанем. Мяккія губныя *б', м', п'* у мове часткі старэйшых носьбітаў гаворкі з'яўляюцца асобнымі фанемамі, у мове пераважнай часткі яе носьбітаў гэтыя гукі ў фаналагічным статусе займаюць асобнае становішча (на гэтым мы больш падрабязна спынімся ніжэй). У мове найбольш старэйшага пакалення адсутнічаюць фанема *ф* і яе камбінаторны варыянт *ф'*.

Зычныя перад галоснымі. Аналізуючы вакалізм сіманавіцкай гаворкі, мы разглядалі ўжывальнасць галосных пасля зычных. Гэты матэрыял адлюстроўвае спалучальнасць зычных з галоснымі ў розных пазіцыях. Таму больш падрабязна спынімся толькі на асобных выпадках ужывання зычных перад галоснымі.

Губна-зубныя *ф, ф'* найбольш старэйшымі носьбітамі гаворкі ўжываюцца толькі як факультатыўныя варыянты спалучэнняў *хв, хв': хвіст — фіст, хватáты — фатáты, хвáйно — фáйно, охв'іра — оф'іра.* У запазычаных словах у мове гэтай часткі насельніцтва замест *ф, ф'* ужываюцца іншыя гукі ці спалучэнне *хв: Хвéдор, Хвыдóра, Пылы́п, Тéкл'а, хвáбрыка, хвáрба, хéрма* 'ферма', *шкап, охвыровáты, Тóдор, хвам'іл'ійа, хамы́л'ійя, хóрма, Прузы́на* і інш. У мове пераважнай большасці носьбітаў гаворкі, асабліва малодшага пакалення, зычныя *ф, ф'* ужываюцца ў значнай колькасці лексем кніжнага паходжання, прычым амаль выключна перад галоснымі ці санантамі: *фам'іл'ійа, фонтáн, фудбóл, ґал'іфé, ф'éрма* і *фéрма, ф'іґýра, фронт.*

У адрозненне ад іншых цвёрдых зычных цвёрды *р* ужываецца перад націскным *і<о* ў мове многіх носьбітаў сярэдняга і малодшага пакалення: *рів, ріг, пыріг, поріг, корівка.* Але ў большасці носьбітаў сіманавіцкай гаворкі ў гэтай пазіцыі ўжываецца мяккі *р'*.

Цвёрдая афрыката *ц* ужываецца перад галоснымі *ы* ў канчатках давальнага склону назоўнікаў жаночага роду адзіночнага ліку на *-ка: в рубáсцы, в йáмцы, на лáвцы* і інш. У іншых выпадках ужыванне цвёрдага *ц* (перад галоснымі *а, е, ы*) абмежавана невялікай колькасцю лексем: *цар, цабарáкнув, йіцé, цéлыты, цéбах, цéбер, цéркнуты, гы́щел', сóнце, окéнце, цы́бы, цыбáтый, цыбýл'а, цыды́ты, цыды́лок* і вытворных ад іх. У некаторых найбольш старэйшых носьбітаў гаворкі назіраецца паралельнае ўжыванне мадэлей «мяккі *ц'+і*» і «цвёрды *ц+ы*» як канчаткаў назоўнікаў на *-ц'а (водыц'а, гулыц'а)* у родным склоне адзіночнага ліку: *водыц'і — водыцы, на гýлыц'і — на гýлыцы, пшаныц'і — пшаныцы.* Значная частка прадстаўнікоў старэйшага пакалення ўжывае цвёрды і мяккі *ц—ц'* у канчатках назоўнікаў мужчынскага роду творнага склону адзіночнага ліку: *кос'ц'éм — косцéм, жынц'éм — жынцéм.*

Мяккая афрыката *ц'* шырока ўжываецца ў націскных і неканцавых паслянаціскных складах перад *а, і*, а таксама ў ненаціскных канцавых складах перад *а, і, е, у*, абмежавана — у націскных і паслянаціскных неканцавых складах перад *о, у, е*, у ненаціскных канцавых перад *о*, у пераднаціскных перад *а, о, у.*

Афрыката *дз'* перад галоснымі (*і, а, о, у, е*) выяўлена ў наступных лексемах: *дз'індзýбел', дз'ýрка, дз'овбáк, дз'óвбаты, кандз'убнýты, ґóз'дз'а, дз'ін'каты, дз'іл'ін'каты, дз'ін'-дз'ін', ходз'áйін* (часцей *хоз'áйін*); афрыката *дз* (перад галоснымі *ы, у*) — у лексемах *дз'індзýбел', Дзыг* (вулічная мянушка), *брындзыл'ійа.*

Цвёрдыя шыпячыя *ж, ч, ш* шырока ўжываюцца ва

ўсіх пазіцыях. Выключэнне складаюць: пазіцыя ў націскных складах перад *а*, дзе цвёрдыя шыпячыя не ўжываюцца; пазіцыя ў канцавых ненаціскных складах перад *о* (акрамя *ч, ш* у закрытых складах): перад націскным *і*<*о* цвёрдыя шыпячыя ўжываюцца толькі часткай прадстаўнікоў старэйшага пакалення.

Мяккія шыпячыя *ж', ч', ш'* шырока ўжываюцца перад націскнымі *і* і асабліва перад *а*, перад *е* — толькі ў наступных выпадках: перад дзеяслоўнымі канчаткамі 2-га спражэння множнага ліку 3-й асобы: *лыж'ёт', тыч'ёт', нагу́ч'ет', вору́ш'ет';* перад канчаткамі назоўнікаў адзіночнага ліку творнага склону (у мове часткі прадстаўнікоў старэйшага пакалення ў даным выпадку пераважаюць цвёрдыя або паралельна ўжываюцца цвёрдыя і мяккія зычныя: *гуж'ём — гужём, корч'ём — корчём*). Перад націскнымі *о, у* зычныя *ж', ч', ш'* не ўжываюцца.

Цвёрды шыпячы *дж* ужываецца ў наступных выпадках: перад дзеяслоўным канчаткам *-у* ў 1-й асобе адзіночнага ліку *(ходжу́ — прыво́джу);* перад націскным *о* ў дзеепрыметніках тыпу *суджо́ный, роджо́ный;* перад ненаціскным *а* ў дзеепрыметніках тыпу *поса́джаный, збу́джаный, нына́джаный;* у асобных лексемах *(джынджыру́ха, на́джа* 'надзея', *ну́джа)*. Мяккі шыпячы *дж'* ужываецца перад націскным *а: садж'а́ты, походж'а́ты, садж'а́йе, походж'а́йе.*

Мяккія *г', к', х'* пераважнай большасцю носьбітаў сіманавіцкай гаворкі ўжываюцца толькі ў асобных лексемах: *г'імн, к'іл'о* (і *кыл'о), сок'іра* (і *сокы́ра), к'іра́т, пух'ір, х'ім'ійа.*

Зычны *ґ* ужываецца ў невялікай колькасці лексем перад галоснымі *а, е, у, о,* зычны *ґ'* — перад галосным *і: ґа́за, газны́к, ґа́нок, заґа́баты, шпа́ґа, шмы́ґа, л'іґа́ра, ґах, штёґав, дры́ґав, ґа́рнец', ґа́ра, ґёл'н'а, ґёрґаты, го́ґер, шва́ґер, шваґёрко, ґерышува́тый, ґёрышка, ґул'іґа, ґуз, ґу́з'ік, ґ'іл'за, ґ'іта́ра, ґ'іра, ґ'інс* і інш.

Цвёрдасць-мяккасць зычных перад галоснымі пярэдняга і пярэдне-сярэдняга рада. Цвёрдыя зычныя ўжываюцца перад этымалагічнымі *е, і, ы: бёрог, бы́ты, бычо́к, дёрыво, дым, ходы́ты, горё, ры́ба, крык, чёреп, чы́стый, но́гы, хы́трый;* перад *ы* з *е: быро́гы, вырш о́к, тыпло́, зымн'а́, рыбро́, чырыпо́к;* перад *ы* з *ѣ: быжы́т', выно́к, дывкы́, сымн'а́, рыка́;* перад *ы* (зрэдку *і*) з *о* ў новых націскных закрытых складах: *быб, выз, стыл, зы́рно, рыг, жы́нка, гы́рко* (і *біб, стіл, зірно, ріг, жінка, гірко).*

Мяккія зычныя ўжываюцца паслядоўна перад *і* з *ѣ* у націскных складах: *б'ілый, с(')м'іх, д'ід, с'іно, йіхаты, л'іто, ц'івка, р'ічка;* рэдка перад *і* з *ѣ* у ненаціскных складах: *д'ідо́к, л'іса́к, л'ісо́вый, с(')н'іжо́к, з(')в'іро́к, в л'іта́х, ц'івкы́* (аднак старэйшае пакаленне ўжывае пераважна формы *дыдо́к, лысовы́й, звыро́к, цывкы́,* але *л'іса́к, сн'іжо́к, в л'іта́х);* перад *е, і* ў некаторых канчатках назоўнікаў: *кон'ём, рубл'ём, зымн'ёйу, дошч'ём, корч'ём, гуж'ём, мыш'ёйу, мыж'ёйу, хло́пц'ем, па́л'ц'ем, скопц'і, жынц'і, хло́пц'і, па́л'ц'і, нымá пшаны́ц'і, воды́ц'і, на гу́лыц'і, нож'і, корч'і, нымá мыш'і* (старэйшае пакаленне ўжывае пераважна формы *конём, рублём, зымнёйу, дошчём, корчём, гужём, мышёйу, хло́пцем, па́лцем, нымá пшаны́цы, воды́цы,* але *скопц'і, жынц'і, па́лц'і, нож'і, корч'і, мыш'і);* непаслядоўна ў многіх словах кніжнага паходжання: *газёта* і *газ'ёта, д'ір'ёктор* і *дырёктор, прыцсыда́т'ел'* і *прыцсыда́тел'.* Зычны *л'* мяккі ў слове *вы́л'ікый.* Ізаглоса мяккага *л'* у гэтым слове праходзіць трохі на поўдзень ад ізаглосы мяккага *л'* перад галоснымі пярэдняга рада, хоць часам з ёю супадае. У Драгічынскім раёне (паўночная і заходняя часткі) гэта ізаглоса клінам апускаецца на поўдзень. У суседніх з Сіманавічамі населеных пунктах (Суткі, Салава) ужываюць форму *вылы́кый.*

Зычныя перад зычнымі. У сіманавіцкай гаворцы адзначаны наступныя спалучэнні зычных з зычнымі: *б—б, б', в, в', м, м', д, д', з, н, н', й, л, л', р, р', дз', ж, ж', г: оббы́ты, обб'ішты, обвы́ты, обв'аза́ты, обмы́ты, обм'ів, обдылы́ты, обд'ілыт', бзыч'а́ты, ры́бный, обн'а́в, обйіхаты, облы́в, обл'ака́тыс', брав, обр'ізав, обдз'о́ввбував, обжылы́с', обж'а́ла, обгор'іло; в — б, б', в, в', м, м', п, п', д, д', т, т', з, з', с, с', н, н', й, л, л', р, р', ц, ц', дз', ж, ж', ч, ч', ш, ш', к, х, г: сывба́, вб'іг, повво́дыты, вв'ів, вмер, вм'ійу, впав, вп'ікс'а, пра́вда, вд'ійу, втычы́, вт'ік, ко́взатыс', вз'ав, говса́, вс'ого́, по́вно, вн'іс, вйа́же, влыв, вл'іхс'а, вра́джу, вр'іжу, на ла́вцы, до кравц'а́, вдз'овбну́ты, вже, вж'а́ты, товчы́, вч'а́выш, вшы́ты, ковш'а́, товкла́, повх, до́вго; м — б, б', п, т, з, з', с, с', н, н', л, л', р, р', ж, ж', ч, ч', ш, к, х: бо́мба, бомб'о́шка, л'а́мпа, га́мтаты, рымза́ты, гомз'іты, камса́, в камс'і, ры́мно, помн'а́в, млос'ц', мл'а́вко, вмру, мр'а́ка, мжыт', мж'іты,*

крамчу́, крамч'а́ты, мшы́ты, солы́мка, чо́мхнуты; п — т, т', с, с', н, н', й, л, л', р, р', ц', ч, ч', ш, ш', к, х: пту́шка, копт'іты, псу́йе, опс'а́дут', пне́ц'ц'а, на пн'і, вы́пйавс', пла́че, пл'а́вка, прач, пр'а́сты, хло́пц'і, пчо́лы, пч'ілка, пшаны́ц'а, пш'іночка, ру́пка, пха́ты; ф — т, л, р: нафтал'ін, флаг, фронт; д — б, б', в, в', м, м', д, д', й, н, н', л, л', р, р', дз', г: одбы́в, одб'іг, одва́жный, одв'ів, одмыка́ты, одм'ірав, одда́в, од(')д'а́чыв, одйіхаты, выдно́, на выд(')н'і, одлы́ты, одл'а́же, выдро́, одр'ізав, оддз'о́вбаты, одгада́в; д' — б, б', в', м, м', д', н': суд'ба́, суд'б'і, д(')в'і, в'ід'ма, в'ід'м'ід', од(')д'а́чыла, на д(')н'і; т — в, в', п, п', ф, т, с, с', н, н', л, л', р, р', ч', к, х, х': пытво́, пры шыт(')в'і, отпол́а, отп'ік, тфу (ф — між'языкавое), оттараба́н', отсы́п, отс'ік, полотно́, жы́т(')н'а, мытла́, на мытл'і, отруйіты, потр'ібно, отч'авы́ты, тка́ты, отхылы́в, отх'іл'уйіц'ц'а; т' — в', м, м', т', н': пры шыт(')в'і, т'ма, т'м'а́но, лока́т(')т'е, л'аскот(')н'а́; з — б, б', в, в', м, м', д, д', з, з', н, н', й, л, л', р, р', г: збыты́, з(')б'ігло́с', звыв, з(')в'ів, змыв, з(')м'ів, зда́ты, позд'іране, зза́ду, з(')з'ів, знов, зн'ав, зйіхав, козла́, зл'із, зра́нку, зр'ізав, згр'іб; з'—б', в', м', дз', н', з': з(')б'ігав, роз(')вів, з(')м'ійа́, поз'дз'іране, пуз(')н'ій, полы́з(')з'е; с—в, в', м, м', п, п', т, т', с, с', н, н', л, л', р, ц, к, к', х, х': сват, с(')в'іт, космачо́к, с(')м'ішно, спа́ты, с(')п'івы, став, ст'агну́в, россы́пав, рос(')с'ійав, сны́лос', с(')н'іг, сла́ты, сл'ід, сро́чно, мн'асце́, скажу́, поск'іпалос', схылы́вс'а, сх'ільыц'ц'а; с'—в', м', п', н', с', ц', к: с(')в'а́то, с(')м'іх, вс(')п'ійу, пос(')н'ідалы, пос(')с'ікав, гыс'ц', ба́т'ковс'кый, бус'ко́; н — б, в, в', п, д, д', т, н, н', дз, дз', ц', ч, ч', к: цынба́лы, канва́, на канв'і, канпу́зыт', го́нде, скупын (')д'а́, кант, ра́нный, нас'ін(')н'е, дз'індзу́бел', кандз'убну́вс'а, до конц'а́, ме́нчый, опанч'а́, з ра́нку; н' — б, м, д', т, с', н', к: га́н'ба, кы́н'мы, ке́н(')д'ух, покы́н'те, кы́н'с'кый, нас'ін(')н'е, мал'е́н'кый; й — б, в, м, м', д, д', т, н, н', л, р, ц', ш, к: йійбо́гу, Йван, пыре́йме, в найм'і, пыре́йде, пырыйд'імо, зна́йте, война́, вы́йн'ав, пы́йло, о́йра, га́йц'а, розго́йшыты, ба́йка; л — б, б', д, д', н, н', к, г, х: лбом, на лб'і, шалда́, шалд'іты, шчы́лно, шчылн'ій, пы́лка, лга́ты, колхо́з; л' — б, б', в, в', м, д, д', т, т', з, з', с, с', н, н', л', ч, ш, к, х, г: хвал'ба́, хвал'б'і, гал'ва́, гал'в'і, ве́л'мы, на л'ду, пал'то́, в пал'т'і, по́л'за, пол'з'іт'іл'но, ре́л'са, напу́л'с'а, гул'ну́ты, гул'н'а́, гол'л'е́, па́л'чык, гол'шы́на, по́л'ка, га́л'ка, гол'хо́вый, кул'га́йе;

р—б, б', в, м, м', п, п', д, д', т, т', з, з', с, н, н', й, л, л', ц, ц', ж, ж', ч, ч', ш, ш', к, х, г: то́рба, на горб'і, рва́ты, да́рма, в т'урм'і, те́рпне, тырп'ів, го́рдый, горд'ій, розго́ртаты, тырт'ілныц'а, рза́ты, корз'іна, заборса́ты, чо́рный, почырн'ів, п'ірйе, жырло́, на жырл'і, ге́рцаты, курц'і, корж, корж'і, корч, корч'і, пе́ршый, пырш'а́к, гуркы́, верх, морга́ты; ц — в, в', м, с, ц, н', л': цва́ный, ц(')в'іт, цма́каты, оцсу́нуты, оццыды́ты, напуцн'іты, гы́цл'і; ц'— в', ц', к: ц(')в'іт, зове́ц'ц'а, ц'а́ц'ка; дз' — дз': одз'дз'о́вбуваты; ж — б, б', в, м, м', д, д', н, н', ж, дж': слу́жба, служб'іст, жва́вый, жме́н'а, жм'ін'ка, жду, пудожд'іте, жну, жн'іте, быздор'іжже, прыйіждж'а́йе; ж'—ж': рож'ж'а́лылас'; ч — в, м, м', н, н', ч, к: чве́ндыты, чмы́ше, чм'іл', почне́, йійе́чна, молы́ччый, ка́чка; ч' — ч': оч'ч'авл'уваты; ш — в, в', м, п, п', т, н, н', л, л', р, ч, ч', ш, к: шво, на шв'і, шмару́йу, шпы́л'ка, шп'ін', штырхаты, стра́шно, вы́шн'а, пошла́, ка́шл'айе, шрам, шчы́ро, шч'а́с'ц'е, шшы́ты, шко́да; дж — ж: оджжыма́ты; дж'— ж': одж'ж'а́ты; г — м, д, н, н', л, л', р, р': л'ігма, вс'ігда́, погна́в, гн'ів, гла́дыты, гл'а́ну, гра́ты, гр'ітыс'; ґ—б, в, д, з, р, ж: йа́ґбы, ґвалт, ны́ґды, ыґза́мен, ґрунт, йа́ґже; к— в, в', м, м', т, т', с, н, н', л, л', р, р', ш, ш': ква́каты, кв'ікнуты, скме́тыв, км'ітыт', жлу́кто, ло́кт'а, ва́кса, гокно́, на окн'і, клав, прокл'а́тый, кра́сты, кр'а́мкаты, л'окш, мн'акш'ій; х — в, в', м, м', т, т', н, н', л, л', р, р', ч, к: хвата́ты, на пахв'і, хма́ра, хм'іл', хто, пухт'іты, сты́хне, пухн'ір, хлбпец', хл'іб, хрыпы́т', хр'ін', ро́хче, л'о́хкый.

Спалучэнні зычных *б', в', м', п', ф', р', дз, ш', г', ґ', к', х'* з іншымі зычнымі не выяўлены.

Такім чынам, сіманавіцкай гаворцы ўласцівы далёка не ўсе магчымыя спалучэнні зычных. Адсутнасць большасці іх звязана са спрадвечнай, характэрнай для агульнарускай эпохі адсутнасцю марфем з гэтымі спалучэннямі. Асобныя спалучэнні (*мб, мс, фр* і інш.) з'явіліся ў гаворцы нядаўна ў выніку запазычанняў з літаратурных моў: *бо́мба, камса́, фронт*. Значная частка абмежаванняў звязана з моўнымі працэсамі, якія адбываліся ў мінулым даследуемай гаворкі ў пасляагульнаславянскі і пасляагульнарускі перыяды. Да абмежаванняў адносяцца асіміляцыі па звонкасці, глухасці і мяккасці, прыпадабненне свісцячых да наступных шыпячых, шыпячых да наступных свісцячых, зычных *д, д', т, т'* да на-

ступных свісцячых або шыпячых (*от+цыдыты — оццыдыты, от+чыпыты — оччыпыты*), ацвярдзенне зычных у радзе пазіцый і г. д. Пры хуткім тэмпе маўлення на стыку слоў адбываюцца такія ж з'явы асіміляцыі зычных, якія адбываліся ў мінулым унутры слова: *тут бы — тýдбы; сныи дóвгый — сныбдовгый; хоч бы й так — ходжбыйтáк; мох зыл'óный — могзыл'óный.* Зычныя *д, т, з, с, н, ц* у мове адных і тых асоб у аднолькавых словах ужываюцца ў пазіцыі перад некаторымі мяккімі зычнымі або прыпадабняюцца да іх па мяккасці (*д* перад *в', д', н'*; *т* перад *в', т', н'*; *з* перад *б', в', м', з', н', д'* з пераходам апошняга ў *дз'*; *ц* перад *в'*; *с* перад *в', п', м', н', с', т'* з пераходам апошняга ў *ц'*; *н* перад *д', т'*), або слаба палаталізуюцца ці захоўваюць цвёрдасць: *д(')в'і, л'іт(')н'ій, пос(')н'ідалы, ц(')в'іт.* Гаворцы ўласціва няпоўная асіміляцыя папярэднімі *с', з'* наступных *т', д'*. У данай пазіцыі ўжываюцца паралельна мадэлі «мяккі *с'+ц'* (*т'*)», часцей «мяккі *з'+дз'* (*д'*)» і мадэлі «цвёрды *с+т'*», радзей «цвёрды *з+д'*»: *кос'ц'аный і кост'аный, гыс'ц'* і *гыст', гоз'дз'* і *гозд'*.

Зычныя ў канцы слова. У сіманавіцкай гаворцы ў канцы слоў ужываюцца зычныя *б, в, м, п, ф, д, д', т, т', з, з', с, с', н, н', й, л, л', р, ц, ц', дз', ж, ч, ш, к, х, г, ґ: дуб, клав, сам, кап, т'іф, р'ід, с'ад', брат, йдут', раз, вылáз', вы́рос, дывы́с', сын, стан', дай, пыл, ж'ал', сыр, ныц, хлóпец', гоз'дз', р'іж, плач, наш, сук, мох, л'іг, дрыґ.* Не ўжываюцца ў канцы слоў зычныя *б', в', м', п', ф', р', ж', ч', ш', дж, дж'*, г. зн. мяккія губныя, мяккія шыпячыя, *р'* (у данай пазіцыі ацвярдзелі), *ф'*, мяккія задненязычныя і фарынгальныя, цвёрдыя *дз, дж.* У некаторых носьбітаў гаворкі назіраецца слабае аглушэнне звонкіх зычных у канцы слоў.

Фізічная рэалізацыя зычных. Зычныя *б, б', в, в', м, м', п, п', д, т, з, с, н, й, л, л', р, ц, дз, ж, ч, ш, к, к', х, х', ґ, ґ'* па сваіх артыкуляцыйных і акустычных якасцях амаль поўнасцю ці з невялікімі адхіленнямі супадаюць з адпаведнымі зычнымі беларускай, рускай і ўкраінскай літаратурных моў.

Зычны *р'* — мяккі палаталізаваны, сапорны, падняебенна-зубны, пярэднеязычны, аналагічны мяккаму *р'* у рускай і ўкраінскай літаратурных мовах. Зычны *ц'* — мяккі палаталізаваны (у адрозненне ад *ц'* мяккага палатальнага ў беларускай літаратурнай мове), шумны, пярэднеязычны, зубны, афрыкатыўны, глухі. Зычны *дз'* — мяккі палаталізаваны (у адрозненне ад *дз'* мяккага палатальнага ў беларускай літаратурнай мове), шумны, пярэднеязычны, зубны, афрыкатыўны, звонкі. Зычны *в* — губна-зубны, у пазіцыі перад глухімі зычнымі пасля галосных, на канцы слоў і як прыназоўнік набывае адценні гукаў *ф* (г. зн. некалькі аглушаецца) або *ѡ* (г. зн. набывае адценні губна-губной артыкуляцыі). Зычны *г* і яго мяккі адпаведнік *г'* — фарынгальныя фрыкатыўныя звонкія гукі. Месцам іх утварэння з'яўляецца глотка, пры іх вымаўленні кадык трохі пасоўваецца ўніз у сувязі з расшырэннем верхняй часткі глоткі. Мяккія *д', т', з', с', н'* — краепалатальныя сярэднеязычныя гукі, пры іх вымаўленні канец языка пасіўна апускаецца ўніз, *з'* і *с'* маюць слабае свісцячае адценне. Зычны *й* — сярэднеязычны, палатальны, фрыкатыўны, шумны, мяккі. Мяккія шыпячыя (*ж', ч', ш', дж'*) акустычна больш мяккія, чым у рускай і ўкраінскай літаратурных мовах, і набліжаюцца да мяккіх шыпячых літоўскай мовы (154, *79, 85—86*), пры іх вымаўленні сярэдняя спінка языка значна пасоўваецца ў палатальную зону.

Сярод некаторых прадстаўнікоў сярэдняга і малодшага пакалення, якія знаходзіліся ў цесных кантактах з прадстаўнікамі іншых гаворак, назіраюцца адменнасці ў галіне кансанантызму: ацвярдзенне (не заўсёды паслядоўна) шыпячых і *р'* перад *а, і* (з пераходам пры гэтым *і>ы*): *порáдок, горы́хы, корчы́, жар;* замена мадэлі «цвёрды заднеязычны або фарынгальны + *ы*» мадэлямі «цвёрды заднеязычны або фарынгальны + *і*», «мяккі заднеязычны або фарынгальны + *і*», зрэдку «паўмяккі» (слаба палаталізаваны) заднеязычны або фарынгальны + *і*»: *дывкы́ — дывкі́ — дывк·і — дывк'і.*

Асаблівасці велярызацыі зычных. Велярызацыя (дадатковая артыкуляцыя задняй часткі спінкі языка ў напрамку да мяккага паднябення) выклікае павелічэнне цвёрдасці зычных, г. зн. больш рэзкае паніжэнне іх тону і шуму. Прыкладам велярызацыі цвёрдых зычных з'яўляецца вымаўленне пасля іх галоснага *ы*. На наш погляд, у сіманавіцкай гаворцы для большасці цвёрдых зычных характэрна некалькі аслабленая велярызацыя. Аб гэтым сведчыць той факт, што пры артыкуляцыі вельмі пашыранага ў аналізуемай гаворцы галоснага, які мы абазначаем праз *ы*, задняя частка

спінкі языка некалькі менш прасоўваецца да мяккага падняцьця, чым пры артыкуляцыі «звычайнага» *ы*. Велярызацыя цвёрдых шыпячых у мове адных і тых асоб у аднолькавых словах бывае «моцнай», «слабай», зрэдку (прычым не толькі перад *і*) адсутнічае наогул. Перад *і* ўсе цвёрдыя зычныя невелярызаваныя.

«Паўмяккія» (слаба палаталізаваныя) зычныя ў сіманавіцкай гаворцы ўжываюцца спарадычна перад мяккімі зычнымі (зычныя *д, т, г, с, н, ж, ч, ш, ц, дз*), а ў мове некаторых носьбітаў гаворкі таксама перад *і* (зычныя *г, к, х, р*): *до д·н'а, жыт·н'ій, з·в'ір, с·п'ік, кéн·д'ух, рож·ж'áлытыс', оч·ч'áвыш, рош·ш'іптуйіц'ц'а, оц·ц'іджуваты, одз·дз'óвбуваты, дóвг·ій, дывк·і, х·ітрый.*

Заключныя вывады аб фанемным складзе сіманавіцкай гаворкі. Пры высвятленні пытання аб фанемным складзе сучаснай сіманавіцкай гаворкі намі не быў канчаткова вызначан фанематычны статус галосных *ы* і *і*, а таксама мяккіх губных зычных *б', м', п'*. У суадносінах галосных *ы* і *і* перавага ў фанематычным статусе належыць *ы*. 1. Галосны *ы* шырокаўжывальны ў націскных, першым і другім пераднаціскных, а таксама ў паслянаціскных складах; галосны *і* шырокаўжывальны ў націскных і канцавых адкрытых паслянаціскных складах, у астатніх пазіцыях ужыванне *і* абмежавана. 2. У пераднаціскных і неканцавых паслянаціскных складах *е* пераважна нейтралізуецца з *ы*. 3. У апошні час адбылося расшырэнне дыстрыбуцыі *ы* за кошт звужэння дыстрыбуцыі *і* (у новых закрытых складах). 4. У абсалютным пачатку слова у словах кніжнага паходжання назіраецца нейтралізацыя з *ы* (непаслядоўна) галоснага *е*, а часам таксама *і*. 5. Адначасова са звужэннем дыстрыбуцыі *і* гэты галосны перастаў ужывацца пасля цвёрдых зычных, г. зн. у той пазіцыі, у якой ужываецца *ы*. 6. На месцы праславянскага *і* ў гэтай гаворцы паслядоўна выступае *ы*, а галосны *і* з'яўляецца рэфлексам іншых галосных (*ѣ, о*).

Галоўнае адрозненне старога тыпу сіманавіцкай гаворкі ад яе сучаснага тыпу — наяўнасць асноўнага (не факультатыўнага) варыянта мадэлі «цвёрды зычны + + націскны *і*», якая ўжываецца адначасова з мадэллю «цвёрды зычны + націскны *ы*». Перад *і* ў гэтай пазіцыі ўжываюцца як мяккія, так і цвёрдыя губныя. Таму ў старой сіманавіцкай гаворцы галосныя *ы* і *і*, цвёрдыя і мяккія губныя з'яўляюцца асобнымі фанемамі, а для гаворкі характэрна тэмбравая карэляцыя.

У сучаснай сіманавіцкай гаворцы мадэль «цвёрды зычны + *і*» як асноўны, не факультатыўны варыянт фактычна не існуе. У выніку гэтага галосныя *і* і *ы* перасталі ўжывацца ў адной і той пазіцыі. Здавалася, галосны *і* па гэтай прычыне павінен быць не асобнай фанемай, а камбінаторным варыянтам фанемы *ы*. Аднак у сістэме гаворкі захавалася бінарнае супроцьпастаўленне мадэлей «цвёрды губны + *ы*» і «мяккі губны + *і*». Такім чынам, у вырашэнні пытання інтэрпрэтацыі фанематычнага статусу мяккіх губных *б', м', п'* і галоснага *і* існуе магчымасць дваістасці рашэнняў (45, *152*; 89, *55—138*).

Першы варыянт. Мяккія губныя засталіся асобнымі фанемамі. У такім выпадку галосны *і* ў мадэлі «мяккі губны + *і*» знаходзіцца не ў аднолькавай пазіцыі з галосным *ы* ў мадэлі «цвёрды губны + *ы*», таму галосны *і* з'яўляецца камбінаторным варыянтам галоснага *ы*. У гаворцы адбыліся змены ў дыстрыбуцыі *і*, а ў мадэлі «цвёрды губны + *і*» — у яго якасці, змен жа ў дыстрыбуцыі і якасці мяккіх губных амаль не адбылося. Таму і змены ў фанематычным статусе павінны датычыцца перш за ўсё *і*, а не мяккіх губных.

Другі варыянт. Поруч з пераходам у адной з пазіцый *і>ы*, звужэннем дыстрыбуцыі *і* адбываліся і іншыя змены ў гаворцы: некаторае расшырэнне дыстрыбуцыі мяккіх шыпячых, *ц'* і інш., у тым ліку частковае расшырэнне дыстрыбуцыі *і*. Значыць, на фанемны склад гаворкі павінны зрабіць уплыў змены не толькі ў мадэлі «цвёрды губны + *і*», але і ва ўсёй яе сістэме. Зараз у мове часткі носьбітаў сіманавіцкай гаворкі, у тым ліку школьнікаў, у некалькіх словах захоўваецца мадэль «цвёрды *р* + *і*», г. зн. мадэль «цвёрды зычны + *і*» канчаткова не знікла. А ў бінарных супроцьпастаўленнях *б'і — бы, м'і — мы, п'і — пы* функцыянальная нагрузка аднаго галоснага *і* такая ж, як і трох разам узятых зычных — *б', м', п'*. Значыць, і фаналагічная значнасць *і* большая, чым фаналагічная значнасць кожнага ўзятага асобна мяккага губнога *б', м'* або *п'*. Тады пастаўленае намі пытанне, якія гукі неабходна лічыць асобнымі фанемамі, адзін галосны або тры зычных, каму з іх даць перавагу, патрэбна вырашаць на карысць галоснага *і*.

Заслугоўвае ўвагі трэці варыянт вырашэння пытання,

які, на нашу думку, найбольш адпавядае рэчаіснасці. У сіманавіцкай гаворцы зычныя *б', м' п'* і галосны *і* ў адрозненне ад звычайных фанем самастойна, без мадэльных складовых спалучэнняў «зычны + галосны» бінарна супроцьпастаўляцца іншым гукам не могуць, а ў адрозненне ад камбінаторных варыянтаў фанем у такога тыпу спалучэннях бінарна супроцьпастаўляюцца мяккія губныя *б', м', п'* цвёрдым губным *б, м, п,* а галосны *і* галоснаму *ы.* Таму ў сучаснай сіманавіцкай гаворцы фанематычны статус гукаў *б', м', п'* і мы вызначаем як пераходны ад статусу фанем да статусу камбінаторных варыянтаў фанем. Для самой жа гаворкі вызначаем наяўнасць пераходнага становішча ад тэмбравай карэляцыі да палатальнага рада: краспалатальныя *д', т', з', с', н'* у гаворцы захаваліся, мяккія губныя *б', м', п'* перасталі быць звычайнымі фанемамі, часткова (аднак не поўнасцю) страцілі фаналагічную значнасць, аднак не ператварыліся і ў камбінаторныя варыянты адпаведных цвёрдых губных.

Фанемны склад сучаснай
і старой сіманавіцкай гаворкі
(агульная схема)

Умоўныя абазначэнні: 1. Без адпаведнага абазначэння — шырокая дыстрыбуцыя; 2. * — фанемы і іх камбінаторныя варыянты з абмежаванай дыстрыбуцыяй; 3. (перах.) — гукі з пераходным фанематычным статусам; 4. Узяты ў дужкі камбінаторныя варыянты фанем. Факультатыўныя варыянты гукаў не прыводзяцца.

Старая сіманавіцкая гаворка

Галосныя: *а, о, у, е, ы, і.*

Зычныя: *б, б'*, в, в'*, м, м'*, п, п'*, д, д', т, т', з, з', с, с', н, н', й, л, л', р, р'*, ц, ц', дз*(дз'*), ж, ж'*, ч, ч'*, ш, ш'*, дж* (дж'*), к, х, г, г*.*

Сучасная сіманавіцкая гаворка

Галосныя: *а, о, у, е, ы, і* (перах.).

Зычныя: *б, б'** (перах.), *в, в'*, м, м'** (перах.), *п, п'** (перах.), *ф(ф'*), д, д', т, т', з, з', с, с', н, н', й, л, л', р, р'*, ц*, ц', дз*, дз'*, ж, ж'*, ч, ч'*, ш, ш'*, дж*(дж'*), к(к'*), х(х'*), г(г'*), г*(г'*).*

ГАВОРКА ВЕСКІ ПАПІНА

Вакалізм

Галосныя фанемы. Склад галосных фанем папінскай гаворкі такі ж, як і ў старой сіманавіцкай гаворцы, г. зн. у ёй існуе 6 галосных фанем: *а, о, у, е, ы, і.* Прыводзім прыклады бінарных супроцьпастаўленняў галосных гаворкі в. Папіна, якія пэўным чынам адрозніваюцца ад адпаведных супроцьпастаўленняў гаворкі старой сіманавіцкай: *а — е: горá — горé* (часцей *горéт'*); *о — е: гóнде* (і *гóнд'е*) — *гéнде* (і *гéнд'е*); *і — ы: тік — тык, лій* 'лой' — *лый* (загадны лад), *зірно — зы́рнув.*

Дыстрыбуцыя галосных. Дыстрыбуцыя галосных, іх шырокая ўжывальнасць або тая ці іншая абмежаванасць ці адсутнасць ужывання ў пэўных пазіцыях у гаворцы в. Папіна ў аснове такая ж, як і ў гаворцы в. Сіманавічы. Адзначым у гэтай галіне вакалізму тыя асаблівасці, якія адрозніваюць папінскую гаворку ад сіманавіцкай.

1. Як і ў старой сіманавіцкай гаворцы, ужываецца галосны *і* ў націскным становішчы пасля цвёрдых зычных, які, аднак, абмежаваны пазіцыямі пасля *д, т, з, с, н, л (годівл'а, стіл, зірно, сіл', ніс, лій)* і не ўжываецца як асноўны варыянт гука пасля іншых цвёрдых зычных.

2. Абмежавана ўжыванне *і* пасля цвёрдых заднеязычных (*к, х*) і фарынгальнага *г* у націскных і паслянаціскных складах. Сіманавіцкай гаворцы (у мове пераважнай большасці яе носьбітаў) уласціва мадэль «цвёрды заднеязычны і фарынгальны + *ы*» ва ўсіх пазіцыях. У папінскай гаворцы такая мадэль характэрна для пераднаціскных і адкрытых націскных і паслянаціскных складоў: *хытáйіц'ц'а, хылы́тыс', кышéн'а, нóгы, вынкы́, хы́трый.* У націскных і паслянаціскных закрытых складах на месцы спалучэнняў *гы, кы, хы* назіраем паралельнае ўжыванне мадэлей «мяккі, слаба палаталізаваны або цвёрды заднеязычны і фарынгальны + *і*», «цвёрды заднеязычны і фарынгальны + *ы*»: *дóвг'ій* — *дóвг'ій* — *дóвгій* — *дóвгый.* Перад *і* з *о* ў новых закрытых націскных складах заднеязычныя і фарынгальны ў папінскай гаворцы паслядоўна мяккія: *к'ін', г'ірко, тх'ір.*

3. Найбольш тыповая асаблівасць, якая адрозніває папінскую гаворку ад сіманавіцкай і якую мы прымаем за дамініруючую рысу пры адмежаванні паўднёвазага-

родскіх і тараканскіх гаворак ад іншых загародскіх,— адсутнасць пасля мяккіх зычных у націскных складах гука *а*, якому ў адрозненне ад сярэдне- і паўночна-ўсходніх загародскіх гаворак і літаратурных усходнеславянскіх моў паслядоўна адпавядае галосны *е*: *с(')в'е́то, чырв'е́к, д'е́куваты, т'е́шко, з'ет', вс'е́к'ій, помын'е́ты, йе́ма, гл'е́ну, гр'е́тка, р'е́ма, ц'е́ц'ка, ж'е́ба, кач'е́ло, душ'е́*. Выключэнне складаюць асобныя словы кніжнага паходжання, пазіцыя ў абсалютным канцы слова ў родным склоне зборных назоўнікаў сярэдняга роду (*гол'л'а́, бут'т'а́*). Характэрна таксама паралельнае ўжыванне ў адзначанай пазіцыі *е* і *а* (у тым ліку прадстаўнікамі старэйшага пакалення), што выклікана ўплывам суседніх гаворак і літаратурных моў:

4. Як і ў старой сіманавіцкай гаворцы, зычныя *н, л, ц, ж, ч, ш* цвёрдыя перад націскным *е* ў формах назоўнікаў тыпу *коне́м, рубле́м, кравце́м, корже́м, ноже́м, корче́м, душе́йу, мыже́йу*.

5. У пераднаціскных складах не выяўлена мадэль «мяккі *в', д', л'+і*» (сіманавіцкім *д'ідо́к, л'іса́к, з(')в'іро́к* адпавядаюць *дыдо́к, лысо́к, звыро́к*).

6. Не выяўлена ўжыванне мяккіх шыпячых у ненаціскных складах.

7. Больш абмежавана ўжыванне галоснага *е* ў паслянаціскных складах (параўн. сіманавіцкія *глы́бей, де́вет', ка́мен', хло́пец', горо́дец', де́сет', па́лец', ко́рен', гы́цел', ры́жец' го́гер, вы́грыбе, вы́лызе, вы́нысе, ко́ле, пор'іже, хо́че* — адпаведныя папінскія *глы́бый, де́выт', ка́мын', хло́пыц', горо́дыц', де́сыт', па́лыц', ко́рын', гы́цыл', ры́жыц', го́гыр, вы́грыбе* і *вы́грыбыт', вы́лызе* і *вы́лызыт', вы́нысе* і *вы́нысыт', ко́ле* і *ко́лыт', пор'іже* і *пор'іжыт', хо́че* і *хо́чыт'*).

8. У паслянаціскных адкрытых складах адсутнічае мадэль «мяккі *ц'+і*» (ёй адпавядае мадэль «цвёрды *ц+ы*»: до *молоды́цы, на гу́лыцы, хло́пцы*).

9. Пераважае ўжыванне цвёрдых *л, н, с* перад *е, ы* ў словах і формах: *вылы́кый, мале́н'кый, б'ілын'кый, коне́м, рубле́м, зымне́йу, пысе́н', карто́плы, в кышэ́ны*, в *Дорогы́чыны, в клу́ны*.

10. У паслянаціскных канцавых закрытых складах не выяўлены словы і формы з галосным *у* пасля зычных *в, л* і з галосным *е* пасля зычнага *ц*. Адзначана ўжыванне галоснага *ы* пасля зычнага *г* (*го́гыр*).

11. Не выяўлены націскны *е* пасля *дж*.

Такім чынам, структура вакалізму папінскай гаворкі адрозніваецца ад структуры вакалізму сіманавіцкай гаворкі ўжываннем пасля цвёрдых зычных галоснага *і* ў значнай колькасці слоў і адсутнасцю ў націскным становішчы пасля мяккіх зычных галоснага *а*, якому паслядоўна адпавядае *е*. У выніку гэтага гаворцы ўласціва шырокая дыстрыбуцыя галоснага *е*.

Структура вакалізму гаворкі в. Папіна паказана ў табл. 5.

Фізічная рэалізацыя галосных фанем. Асаблівасці папінскай гаворкі, якія адрозніваюць яе ад гаворкі сіманавіцкай:

1. Галосны *ы* некалькі больш нізкі і больш шырокі, чым *ы* ў сіманавіцкай гаворцы (аднак папінскі *ы* мы не інтэрпрэтуем як *ы(е)*).

2. Некалькі меншая розніца паміж націскнымі і не-

Табліца 5

Агульная структура вакалізму гаворкі в. Папіна

Пазіцыі	Абсалютны пачатак слова	Пасля цвёрдых зычных	Пасля мяккіх зычных
1-ы і 2-і пераднаціскныя склады	*і*** *у*** *ы** *е*** *о* *а**	*у* *ы* *о* *а*	*і*** *у*** *о*** *а***
Націскныя склады	*і*** *у*** *ы*** *е*** *о*** *а***	*і* *у* *ы* *е* *о* *а*	*і* *у** *е* *о** *а***
Паслянаціскныя неканцавыя склады	—	*у* *ы* *о* *а*	*і** *у*** *о* *а*
Паслянаціскныя канцавыя закрытыя склады	—	*у* *ы* *о* *а*	*і** *у* *е* *о*** *а*
Паслянаціскныя канцавыя адкрытыя склады	—	*у* *ы* *е* *о** *а*	*і* *у* *е* *о*** *а*

націскнымі складамі па працягласці, інтэнсіўнасці і напружанасці вымаўлення. Відаць, у выніку гэтага ў моўным патоку націскныя і канцавыя ненаціскныя склады часткова набываюць асаблівасці ненаціскных неканцавых складоў і наадварот. Прывядзём некалькі прыкладаў. Так, схільныя да рэдукцыі галосныя *ы*, у меншай меры *е* могуць часткова рэдуцыравацца і пад націскам, а ў выніку гэтага губляць уласны тэмбр і набываць якасці іншага роднаснага гука. Таму націскны *ы* нярэдка вымаўляецца як *ы(е)* (*ты́(е)хый, чы́(е)сто*), націскны *е* часам вымаўляецца як *е(а)* (*росте́(а), ге́(а)то, пыре́(а)йдут'*). Праўда, у мове многіх носьбітаў гаворкі гукі *ы(е), е(а)* як факультатыўныя варыянты гукаў *ы, е* ўжываюцца вельмі рэдка. Нясхільны да рэдукцыі галосны *у* не пад націскам значна радзей набывае адценне гука *о*. (У папінскай гаворцы адзначана слова *су(о)с'ід.*) У паслянаціскных канцавых закрытых складах нейтралізацыя *е—ы* ў гуку *ы* больш шырокая, чым у сіманавіцкай гаворцы: у назоўніках мужчынскага роду назоўнага склону ў сіманавіцкай гаворцы захоўваецца *е*, у папінскай гаворцы *е* нейтралізуецца з *ы* ў гуку *ы*; нейтралізацыя ж *е — ы* ў гуку *ы* ўласціва абедзвюм гаворкам для ненаціскных неканцавых складоў. Галосны *ы(е)* як факультатыўны варыянт ненаціскнога *ы* ўжываецца часта (*жы(е)ве́, сы(е)ды́(е)т', ты(е)пе́р, вы(е)с'іл'л'е*). Галосныя *о(у), у(о)* як факультатыўныя варыянты ненаціскнога *о* ўжываюцца некалькі часцей, чым у сіманавіцкай гаворцы. Галосныя *і, і(ы), ы(і)* як факультатыўныя варыянты *ы* ў націскных складах ужываюцца рэдка (*мужік, чы́(і)сто*), у ненаціскных — часта (*мін'і, штыры кла́сі(ы), в бід'і, вы́рів, за вішн'е́мы(е), зміл'ý, де́віт', пир'істій*). Галосны *ы(о)* як факультатыўны варыянт *ы* ў націскным становішчы не выяўлены. У паслянаціскных складах пасля заднеязычных і фарынгальных пры частым ужыванні *і(ы), ы, ы(і)* пераважае *і*.

Факультатыўныя варыянты галосных папінскай гаворкі паказаны ў табліцы 4.

Кансанантызм

Зычныя фанемы. У папінскай гаворцы існуе 46 асноўных варыянтаў зычных гукаў. Гэта тыя ж зычныя гукі, якія характэрны для сіманавіцкай гаворкі: *б, б', в, в', м, м', п, п', ф, ф', д, д', т, т', з, з', с, с', н, н', й, л, л', р, р', ц, ц', дз, дз', ж, ж', ч, ч', ш, ш', дж, дж', к, к', х, х', г, г', ґ, ґ'*, і, акрамя іх, зычны *ѡ* (губна-губны, фрыкатыўны, шумны, звонкі, цвёрды, не мае мяккага і глухога адпаведнікаў).

У папінскай гаворцы самастойнымі фанемамі і іх камбінаторнымі варыянтамі з'яўляюцца тыя гукі, што і ў сучаснай сіманавіцкай гаворцы. Але ў мадэлях *бы, б'і, мы, м'і, пы, п'і* галосныя *і* і *ы* выступаюць як самастойныя фанемы, таму мяккія губныя *б', м', п'* з'яўляюцца камбінаторнымі варыянтамі адпаведных цвёрдых губных *б, м, п*. А зычны *ѡ* ужываецца ў пазіцыі пасля галоснага, перад зычным або як прыназоўнік. У гэтых пазіцыях не ўжываецца зычны *в*. Значыць, *ѡ* з'яўляецца камбінаторным варыянтам фанемы *в*. Да таго ж у папінскай гаворцы больш шырокая дыстрыбуцыя зычных *ц, к', х', г'*.

Такім чынам, фанемны склад зычных сучаснай папінскай гаворкі наступны: *б(б'*), в(ѡ*), в'*, м(м'*), п(п'*), ф*(ф'*), д, д', т, т', з, з', с, с', н, н', й, л, л', р, р'*, ц, ц', дз*, дз'*, ж, ж'*, ч, ч'*, ш, ш'*, дж*(дж'*), к(к'*), х(х'*), г(г'*), ґ*(ґ'*)*.

Старая папінская гаворка (мова найбольш старэйшых яе прадстаўнікоў) адрозніваецца ад старой сіманавіцкай гаворкі, акрамя наяўнасці зычнага *ѡ* як факультатыўнага варыянта *в*, тым, што ў ёй зычныя *к', х', г'* з'яўляюцца не факультатыўнымі, а камбінаторнымі варыянтамі адпаведных цвёрдых зычных (*к, х, г*), а таксама больш шырокай ужывальнасцю цвёрдага *ц*.

Для папінскай гаворкі характэрны палатальны рад: наяўнасць краепалатальных *д', т', з', с', н'* — адсутнасць (акрамя *в'*) мяккіх губных фанем.

Дыстрыбуцыя зычных. Адменнасці ў дыстрыбуцыі зычных папінскай і сіманавіцкай гаворак у пазіцыі перад галоснымі фактычна разглядаліся ў папярэднім раздзеле пры аналізе дыстрыбуцыі галосных папінскай гаворкі. У адрозненне ад сіманавіцкай у папінскай гаворцы перад зычнымі, пасля галосных і ў канцы слоў адсутнічае зычны *в*; яму адпавядае ў гэтых пазіцыях *ѡ*. Выяўлены спалучэнні зычных *ѡг (до́ѡго), ѡг' (до́ѡг'ій), ѡк' (ло́ѡк'ій), мк' (лы́мк'ій), пц (хло́пцы), пк' (лы́пк'ій), тк' (коро́тк'ій), с'к' (ба́т'ковс'к'ій), нк' (то́н-*

к'ій), н'к' (мал'ён'к'ій), йк' (бо́йк'ій), рк' (г'ірк'ій), рг' (шмырг'іт'), цл (гы́цлы), кк' (л'о́кк'ій).

Фізічная рэалізацыя зычных. Асаблівасці папінскай гаворкі, што адрозніваюць яе ад сіманавіцкай: 1. Зычны *ў* у мове некаторых носьбітаў вельмі часта, у часткі носьбітаў рэдка мае факультатыўны варыянт *й*, рэдка, часцей у прадстаўнікоў малодшага пакалення — факультатыўны варыянт *в*. 2. Мяккія шыпячыя *(ж', ч', ш', дж')* характарызуюцца меншай ступенню мяккасці, чым адпаведныя мяккія шыпячыя ў сіманавіцкай гаворцы. Па артыкуляцыйных і акустычных рысах яны блізкія да адпаведных мяккіх шыпячых ва ўкраінскай літаратурнай мове. Зрэдку носьбіты папінскай гаворкі (не ўсе ў аднолькавай меры) ужываюць мяккія шыпячыя тыпу сіманавіцкіх (асабліва *ж'*). 3. У канцы слоў звонкія зычныя цалкам захоўваюць сваю якасць, г. зн. для іх у данай пазіцыі адсутнічае нават слабае аглушэнне. 4. У сіманавіцкай гаворцы выяўлены толькі асобныя выпадкі ўжывання цвёрдых зычных перад этымалагічна цвёрдымі зычнымі *(одв'ів)*. У папінскай гаворцы цвёрдыя зычныя, якія стаяць перад этымалагічна цвёрдымі зычнымі, пазней стаўшых мяккімі, у адрозненне ад цвёрдых зычных, якія стаяць перад зычнымі этымалагічна мяккімі, захоўваюць цвёрдасць: *з(')б'іглос' — зб'ірн'а, д(')в'і — дв'ір, одв'ів, с(')в'іт — св'ій, вс(')п'ійу — сп'ід, пры шыт(')в'і — тв'ій.*

ГАВОРКА ВЁСКІ ЗАЯЛЕННЕ

Вакалізм

Галосныя фанемы. У заяленскай гаворцы, як у папінскай і старой сіманавіцкай, 6 асноўных варыянтаў галосных гукаў і 6 галосных фанем: *а, о, у, е, ы, і*. Іх фанемны статус вызначаецца на аснове бінарных супроць-пастаўленняў: *а — о: знав — знов; а — у: да́ты — ду́ты; а — е: гора́ — горе́; а — ы: мав — мыв, ла́пне — лы́пне; о — у: вко́сыт' — вку́сыт'; о — е: го́нде — ге́нде, те́рныца — то́рба; о — ы: поло́в — полы́в; у — е: нысу́ — нысе́, рабу́йу — рабе́йу; у — ы: бу́ты — бы́ты, лу́пыт' — лы́пыт'; е — ы: жіне́ — жіны́; і — а: крів — крав, жіты — жа́ты; і — о: крів — кров, жірна — жо́рна; і — у: крік — крук, грів — груз, рів* 'рыў' — *рув* 'роў'; *і — е: горі — горе́, пычі — пыче́; і — ы: носів — носы́в (с'ім носів* 'сем насоў', *вун носы́в дро́ва), возів — возы́в (с'ім возів, вун возы́в с'іно).*

Дыстрыбуцыя галосных. У заяленскай гаворцы, як і ў папінскай, дыстрыбуцыя галосных у аснове такая ж, як і ў гаворцы сіманавіцкай. Адзначым асаблівасці дыстрыбуцыі галосных заяленскай гаворкі, якія адрозніваюць яе ад гаворкі сіманавіцкай.

1. Вельмі характэрнай асаблівасцю, якую мы прымаем за дамініруючую пры адмежаванні паўночна-ўсходніх загародскіх гаворак ад іншых загародскіх, з'яўляецца рэфлекс *о>у* ў новых закрытых націскных складах: *вуз, вун, бул'ш, пу́йдыш, муй, году́вл'а, стул* 'стол', *стуг, сул', сук* 'сок', *зу́рно, пырісу́л, гнуй, нуч, луй, голу́вка, жу́нка, руй, ру́дный, сыстру́нка, хору́ш, кут, кун', гу́рк'е, тхур, т'у́тка, прын'у́с, повйу́з, прівйу́з, л'уд* 'лёд'. Аднак выяўлена некаторая колькасць выпадкаў, дзе ў разглядаемай пазіцыі ўжываецца *і*, у той час як у больш паўночных гаворках паўночна-ўсходняга загародскага тыпу (поўдзень Бярозаўскага раёна) вымаўляецца *у: грім, корівка, зачіпка, л'іг спаты, с'ім рубл'ів, нас'ік* і інш. Акрамя таго, у заяленскай гаворцы, як і ў многіх іншых паўночна-ўсходніх загародскіх гаворках, наслядоўна выступае *і* (часам *ы*) адпаведна *о* ў закрытых складах у канчатках назоўнікаў тыпу: *островы́в, возів, носів, хло́пців, л'ісів.*

2. Амаль адсутнічае мадэль «цвёрды *г, к, х+ы, е*»: *заг'іна́ты, но́г'і, стог'і, до́вг'е, коро́тк'е, ты́х'е, вынк'і, дывк'і, х'ітрій, х'іта́йіцца, к'ішен'а* і г. д. (аднак *гето*).

3. Адсутнічае мадэль «цвёрды *р, ц, дз, ж, ч, ш, дж+ +ы*», ёй адпавядае наслядоўна «цвёрды *р, ц, дз, ж, ч, ш, дж + і*». Адсутнічае мадэль «цвёрды *б, м, п, д, т, н, л + +і*». Галосныя як *ы*, так і *і* могуць ужывацца толькі пасля цвёрдых *з, с, в: носыв с'іно — с'ім носів; возы́в дрова — с'ім возів; віно́к, відро́, квітк'і, вы́вітрілос' — высна́, выду́*. Пасля цвёрдага *в* ужываецца ў ненаціскных складах *і*, які паходзіць з *ѣ*.

4. Адсутнічаюць мяккія зычныя *р', ж', ч', ш', дж'*, а таксама этымалагічна мяккія *ц', дз'*, якія ацвярдзелі ва ўсіх пазіцыях. У выніку гэтага ўзнікае больш шырокая ў параўнанні з сіманавіцкай гаворкай дыстрыбуцыя адпаведных цвёрдых зычных.

5. Не выяўлены націскныя *е* пасля *дж* і *д'*, *у* — пасля *дж*.

6. Не ўжываецца *е* пасля цвёрдага *г* (апошні перад *е* змякчаецца).

Такім чынам, структура вакалізму заяленскай гаворкі адрозніваецца ад структуры вакалізму сіманавіцкай гаворкі наяўнасцю і шырокай дыстрыбуцыяй галоснага *і* пасля цвёрдых зычных ва ўсіх пазіцыях адносна націску.

Структура вакалізму гаворкі в. Заяленне паказана ў табл. 6.

Фізічная рэалізацыя галосных фанем. Галосныя гукі заяленскай гаворкі па артыкуляцыйных і акустычных якасцях у асноўным такія ж, як і адпаведныя галосныя сіманавіцкай гаворкі. Адменнасці ў фізічнай рэалізацыі галосных фанем абедзвюх гаворак назіраюцца ў якасці і асабліва ў частасці ўжывання факультатыўных варыянтаў галосных гукаў.

Табліца 6

Агульная структура вакалізму гаворкі в. Заяленне

Пазіцыі	Абсалютны пачатак слова	Пасля цвёрдых зычных	Пасля мяккіх зычных
1-ы і 2-і пераднаціскныя склады	*і*** *у*** *ы** *е*** *о* *а**	*і* *у* *ы* *о* *а*	*і*** *у*** *о*** *а***
Націскныя склады	*і*** *у*** *ы*** *е*** *о*** *а***	*і* *у* *ы* *е* *о* *а*	*і* *у** *е** *о** *а*
Паслянаціскныя неканцавыя склады	—	*і* *у* *ы* *о* *а*	*і** *у*** *о*** *а*
Паслянаціскныя канцавыя закрытыя склады	—	*і* *у* *ы* *е* *о* *а*	*і** *у* *е* *о*** *а**
Паслянаціскныя канцавыя адкрытыя склады	—	*і* *у* *ы* *е* *ɔ** *а*	*і* *у* *е* *о*** *а*

1. Часта ўжываюцца галосныя *ы(і)*, *і(ы)*, *і* як факультатыўныя варыянты галоснага *ы* і галосныя *і(ы)*, *ы(і)* як факультатыўныя варыянты *і*. Гэта, відаць, з'яўляецца вынікам шырокай дыстрыбуцыі пасля цвёрдых зычных як *ы*, так і *і*, вельмі блізкіх артыкуляцыйна і акустычна гукаў, да таго ж слаба супроцьпастаўленых фаналагічна, у выніку чаго ў моўным патоку адбываецца «ўзаемаўплыў» паміж імі.

2. У націскным становішчы ўжываецца *у(о)* (на месцы *о* ў новых закрытых складах) як факультатыўны варыянт *у*.

3. Ненацiскны *о* радзей набывае адценне *у*.

4. Ненацiскны *у* радзей набывае адценне *о*.

5. Галосны *ы(о)* як факультатыўны варыянт *ы* ў націскным становішчы не выяўлены.

Факультатыўныя варыянты галосных гукаў гаворкі в. Заяленне паказаны ў табл. 4.

Кансанантызм

Зычныя фанемы. У заяленскай гаворцы 40 асноўных варыянтаў зычных гукаў: *б, б', в, в', м, м', п, п', ф, ф', д, д', т, т', з, з', с, с', н, н', й, л, л', р, ц, ц', дз, дз', ж, ч, ш, дж, к, к', х, х', г, г', ґ, ґ'*. У адрозненне ад сіманавіцкай гаворкі ў ёй адсутнічаюць мяккія шыпячыя і *р'*.

У фанемным складзе зычных заяленскай гаворкі ёсць некаторыя асаблівасці, што адрозніваюць яе ад гаворкі сіманавіцкай. Галосныя *і* і *ы* з'яўляюцца самастойнымі фанемамі, а мяккія *б', м', п'* абмежаваны амаль выключна пазіцыяй перад націскным *і*, перад якім не могуць ужывацца цвёрдыя губныя, таму мяккія *б', м', п'* з'яўляюцца камбінаторнымі варыянтамі адпаведных цвёрдых зычных (*б, м, п*). Мяккія *г', к', х'*, хоць і маюць шырокую дыстрыбуцыю, аднак, ужываюцца толькі перад галоснымі *е, і*, перад якімі не ўжываюцца адпаведныя цвёрдыя зычныя (*г, к, х*), таму першыя з'яўляюцца камбінаторнымі варыянтамі апошніх. Мяккі *ц'*, за рэдкімі выключэннямі, ужываецца толькі на месцы этымалагічнага мяккага *т'* у пазіцыі пасля мяккага *с'*; мяккі *дз'*, за рэдкімі выключэннямі, вымаўляецца толькі на месцы *д'* пасля мяккага *з'*. Паралельна з мяккімі *ц'* і *дз'* у адных і тых словах аднымі і тымі асобамі ўжываюцца мяккія *т', д'*. Таму *ц'* і *дз'* у заялен-

скай гаворцы з'яўляюцца камбінаторнымі варыянтамі зычных *т'* і *д'*.

Такім чынам, фанемны склад зычных заяленскай гаворкі наступны: *б(б'*), в, в'*, м(м'*), п(п'*), ф(ф'*), д, д', т, т', з, з', с, с', н, н', й, л, л', р, ц(ц'*), дз* (дз'*), ж, ч, ш, дж*, к(к'), х(х'), г(г'), г*(г'*)*.

Для заяленскай гаворкі характэрны палатальны рад: наяўнасць краепалатальных *д', т', з', с', н'* — адсутнасць (акрамя *в'*) мяккіх губных фанем.

Дыстрыбуцыя зычных. Адзначым адрозненні дыстрыбуцыі зычных заяленскай гаворкі ад сіманавіцкай.

Выяўлены спалучэнні зычных *бг'* (*обг'ідывс'а*), *вк'* (*лóвк'ій*), *вх'* (*повх'і*), *вг'* (*дóвг'ій*), *мк'* (*лымк'ій*), *пц* (*хлóпці*), *пк'* (*рýпк'і*), *дг'* (*одг'інáты*), *тк'* (*отк'інув*), *тх'* (*отх'іл'уйіцца*), *зг'* (*зг'інув*), *нк'* (*тóнк'ій*), *йк'* (*бóйк'ій*), *лк'* (*голк'і*), *л'к'* (*пóл'к'і*), *л'х'* (*гол'х'івка*), *рк'* (*гурк'і*), *рх'* (*вырх'і*), *рг'* (*шмырг'іт'*), *ждж* (*прійіжджáйе*), *чк'* (*качк'і*), *шк'* (*дошк'і*), *хк'* (*л'óхк'ій*), *нс* (*кýнск'ій*).

Адсутнічаюць спалучэнні *бр', бж', вр', вж', вч', вш', мж', мч', мш', пр', пц', пч', пш', др', тр', зр', рц', рж', рч', рш', ц'к, ц'ц', джд', шч', пр', кр', хр'*. Спалучэнне *с'к* выяўлена толькі ў слове *бус'кó*, спалучэнне *с'к'* — у слове *бус'к'і*.

Не выяўлена бінарнае супроцьпастаўленне *дз — дж*.

Фізічная рэалізацыя зычных. Адрозненні ў фізічнай рэалізацыі зычных гаворкі в. Заяленне ад гаворкі в. Сіманавічы заключаюцца ў асноўным у характары іх велярызацыі. У заяленскай гаворцы паслядоўна невелярызаваны цвёрдыя шыпячыя. Ва ўсіх пазіцыях цвёрдыя шыпячыя маюць «паўмяккія» (слаба велярызаваныя) факультатыўныя варыянты: *жóвтый, чогó, пошóв, нуч, п'іч, чýйу* і г. д.

Невелярызаваны цвёрдыя *р, ц, дз*, аб чым сведчыць паслядоўная (за рэдкімі выключэннямі) адсутнасць пасля іх галоснага *ы*, якому ўсюды адпавядае галосны *і*.

Зычныя *д, т, з, с, н, л, б, в, м, п* выступаюць пераважна з такой жа ступенню велярызацыі, як і ў сіманавіцкай гаворцы, аднак часта набываюць характар вельмі аслабленай велярызацыі; асабліва лёгка гэта заўважыць у пазіцыі перад *е*.

Для цвёрдых *г, к, х* характэрна не меншая схільнасць да аслаблення велярызацыі, чым для губных і пярэднеязычных.

ГАВОРКА ВЁСКІ СУБАТЫ

Вакалізм

Галосныя фанемы. У субацкай гаворцы 7 асноўных варыянтаў галосных гукаў: *а, о, у, е, е* звужанае, *і, і* кароткае, а таксама нескладовы *й*. З іх асобнымі фанемамі з'яўляюцца *а, о, у, е, і*, што ўстанаўліваецца пры аналізе бінарных супроцьпастаўленняў па ўзроўні словаформы і мадэлі: *а — о: лáвка — лóвка, знав — знов, мáжіт' — мóжіт'*; *а — у: дáте — дýте, нісý — нісá, жну — жна*; *а — е: гол'л'á — гол'л'é, спан(')н'á — спан(')н'é*; *а — е* звужанае: *мав — мев, лáте — лéте*; *о — у: тóпчіт' — тýпчіт', кóсіт' — вкýсіт'*; *о — е* звужанае: *кров — крев, жóрна — жéрна*; *у — е* звужанае: *був — бев, лýпіт' — лéпіт', візý — візе*; *е — е* звужанае: бінарныя супроцьпастаўленні адсутнічаюць (*е* ўжываецца толькі пасля мяккіх зычных — у пазіцыі, дзе не ўжываецца *е* звужанае); *і — а: ніс — нас, тік — так, м'ій — май*; *і — о: тік — вток, стій — той*; *і — у: тік — тук, сік — сук, дій — дýй, п'іп — пуп*; *і — е* звужанае: *тік — тек, лій — лей, м'ій — мей, зірно — зéрнув, стіл — потéліца*; *і — і* кароткае: бінарныя супроцьпастаўленні адсутнічаюць (*і* кароткае ўжываецца ў ненаціскных складах пасля цвёрдых зычных — у пазіцыі, дзе не ўжываецца *і*).

Бінарныя супроцьпастаўленні *і* з галоснымі *а, о, у, е* існуюць у складах ненаціскных: *сіло́ — салнéй, чогó — чігýн, зум'івс' — зімá, гóле — гóлі*. Бінарныя супроцьпастаўленні *е* з галоснымі *а, о, у, і* існуюць толькі пасля мяккіх зычных: *гол'л'é — гол'л'á, вс'ýде — с'éду, віл'éкуйіт' — дал'óко, л'éснув — л'іс, мн'éсо — н'іс*.

Структура фанемнага складу гаворкі в. Субаты (у дужках прыведзены камбінаторныя варыянты адпаведных фанем) *:



Дыстрыбуцыя галосных. Дыстрыбуцыя галосных субацкай гаворкі вызначаецца шэрагам спецыфічных асаблівасцей, якія адрозніваюць яе ад гаворак сіманавіцкай, папінскай, заяленскай.

---

* *і* (к.) — *і* кароткае, *е* (зв.) — *е* звужанае.

1. Найбольш характэрнай асаблівасцю гаворкі в. Субаты, якую мы прымаем за дамініруючую рысу пры адмежаванні гаворак тараканскага тыпу ад іншых загародскіх, з'яўляецца пераход *е(<е, ь)>а* пад націскам пасля цвёрдых зычных ва ўсіх пазіцыях і ў канцавых адкрытых складах не пад націскам у форме дзеясловаў адзіночнага ліку загаднага ладу: *ба́руг, ва́чур, па́рші, вмар, іда́, та́рте, за́мн'у, са́рце, на́бо, ала́, ца́рква, тра́ба, вжа, ча́ріво, шарс'ц', ка́нд'ух, га́то, тіха́н'ко, ґа́рґайіт', зроб'іта.*

2. Галоснаму *ы* ў сіманавіцкай і папінскай гаворках, галосным *ы, і* пасля цвёрдых зычных у заяленскай гаворцы адпавядаюць: а) у націскных і канцавых адкрытых ненаціскных складах — *е* звужанае: *бев, ве́сіпав, ме́те, пе́лка, ходе́в, те, возе́, косе́в, гоне́в, столе́, ре́ба, же́то, ше́те, че́сто, з ноге́, біз руке́, хе́трі, ше́бе, до коро́ве, ла́пе, са́ме* 'самі', *німа погоде, на моро́зе, ко́се, загоне, карто́пле, хло́пце, го́ре* 'горы', *ле́же* 'лыжы', *го́че, ме́ше* 'мышы', *но́ге, ру́ке, му́хе, шпа́ге.* На Драгічыншчыне сярод загародскіх гаворак, акрамя тараканскіх (20 вёсак), такая асаблівасць характэрна для некаторых мяжуючых з гэтай групай гаворак паўднёвазагародскага тыпу (Акропна, Віры), а таксама для гаворак крайняга поўдня раёна (Радастава, Сварынь, Гаравіца, Ражное); б) у ненаціскных складах, акрамя канцавых адкрытых,— *і* кароткае: *біра́зіна, вісна́, до міна́, дірівена, піта́йіцца, до тіба́, сіло́, німа́, лісова́я доро́га, ціде́лок, чіса́те, жіва́, пе́шіт';* в) у канцавых ненаціскных адкрытых складах прыметнікаў мужчынскага роду адзіночнага ліку — *і* кароткае (як і ў закрытых складах): *чо́рні, б'і́лі, ре́жі, чірво́ні.* Відаць, гэта звязана з тым, што ў адзначаных прыметнікавых формах нярэдка выступае пасля канцавога і кароткага *і* нескладовы *й,* утвараючы закрыты склад: *чо́рній, но́вій.*

3. Як і ў папінскай гаворцы, у націскных складах пасля мяккіх зычных паслядоўна на месцы *а* выступае *е* (за выключэннем канчаткаў роднага склону).

4. У значнай колькасці выпадкаў на месцы ненаціскнога *о (<о, е)* вымаўляецца *у: пушо́в, пушла́, брудо́к, ба́руг, ва́чур, Хва́дур, Не́кун, кумпа́н'йа.*

5. Пераход *ы>о* выяўлены ў займенніку *мо* 'мы'.

6. У новых націскных закрытых складах на месцы *о,* як у папінскай гаворцы, паслядоўна вымаўляецца *і.*

У сувязі з пералічанымі асаблівасцямі для субацкай гаворкі ў адрозненне ад іншых даследуемых намі гаворак характэрна: 1. Значна больш шырокая дыстрыбуцыя *а* ў націскным становішчы, у тым ліку шырокаўжывальны *а,* і пасля цвёрдых шыпячых. 2. Адсутнасць у націскным становішчы: *е* пасля цвёрдых зычных, *а* (за некаторымі выключэннямі) пасля мяккіх зычных. 3. Шырокая дыстрыбуцыя *е* ў націскным становішчы пасля мяккіх зычных, як і ў папінскай гаворцы. 4. Галосны *е* звужанае (артыкуляцыйна і акустычна вельмі блізкі да *е*) адпавядае ў сіманавіцкай (і папінскай) гаворцы націскному *ы* (акрамя *ы* з *о* ў новых закрытых складах), а таксама *ы* ў канцавых ненаціскных адкрытых складах. 5. Шырокая дыстрыбуцыя галоснага *і* кароткага, ён у пераважнай большасці пазіцый адпавядае ненаціскному *ы* ў сіманавіцкай і асабліва папінскай гаворках. 6. Адсутнасць, за рэдкімі выключэннямі, мадэлі «мяккі *ц'*+ненаціскны галосны», а таксама «мяккі *ц'*+націскныя *а, о, у*». 7. У канцавых паслянаціскных закрытых складах у назоўніках мужчынскага роду і лічэбніках галоснаму *е* ў сіманавіцкай і заяленскай гаворках адпавядаюць *і* кароткае, *і* (у папінскай гаворцы ім адпавядае *ы*): *хло́піц, па́л'іц, ко́мін, ка́мін', да́віт'* 'дзевяць', *да́с'іт'* 'дзесяць'. 8. У канчатках прыметнікаў мужчынскага роду адзіночнага ліку выступае мадэль «мяккі *г', к', х'*+*і*»: *до́вг'і, коро́тк'і, те́х'і.* Яе факультатыўны варыянт — «паўмяккі (слаба палаталізаваны) *г', к', х'*+*і*» (рэдка «цвёрды *г, к, х*+*і*»). 9. Не выяўлены націскны *а* пасля *дж.* 10. У канчатках назоўнікаў мужчынскага і жаночага роду ў творным склоне адзіночнага ліку пад націскам выступае *а* з папярэднім цвёрдым *н, л, ц, ж, ч, ш: кона́м, рубла́м, кравца́м, ножа́м, корча́м, міша́йу.* 11. Ужываюцца паралельна пачатковыя (у слове) і як прыназоўнікі *ў* і *у.* 12. Не выяўлена ўжыванне мяккіх шыпячых у ненаціскных складах. 13. Не выяўлена ўжыванне галоснага *у* пасля *в, л* у канцавых ненаціскных закрытых складах. 14. Не выяўлена ўжыванне націскнога *о* пасля мяккага *ц'* і пасля цвёрдага *м.* 15. Не выяўлена *о* пасля мяккіх *с', л'* у паслянаціскных адкрытых неканцавых складах. 16. Галосны *е* ў канцавых складах ужываецца пасля тых жа зычных, што і ў сіманавіцкай гаворцы, выключэнне складае зычны *г.* 17. Нескладовы *й* ужываецца ў канчатках прыметні-

каў мужчынскага роду адзіночнага ліку пасля націскнога *е: рабéй, сліпéй, старéй, лухéй, злей.*

Структура вакалізму гаворкі в. Субаты паказана ў табл. 7.

Фізічная рэалізацыя галосных. Галоўныя асаблівасці фізічнай рэалізацыі галосных субацкай гаворкі, якія адрозніваюць яе ад сіманавіцкай, а таксама заяленскай і папінскай гаворак.

1. Значна большая інтэнсіўнасць і тэмп мовы, а ў сувязі з гэтым большая напружанасць у вымаўленні галосных і большая іх рэдукцыя.

2. Пасля цвёрдых зычных пад націскам назіраецца «схільнасць» да вымаўлення галосных з больш шырокім раскрыццём, чым у іншых даследуемых намі гаворках (*а* адпаведна *е*; *е* адпаведна *ы*), і як бы ў якасці «кампенсацыі» пасля цвёрдых зычных не пад націскам (акрамя канцавых адкрытых складоў) процілеглая «схільнасць» да больш вузкага вымаўлення галосных (*і* адпаведна *ы*, у якім у сваю чаргу нейтралізаваліся *ы, е, і*).

Канцавыя ненаціскныя адкрытыя склады (як і ў гаворках сіманавіцкай, заяленскай, папінскай) маюць адзнакі націскных складоў, у тым ліку *ы* перайшоў у *е*

Табліца 7

Агульная структура вакалізму гаворкі в. Субаты

Пазіцыі	Абсалютны пачатак слова	Пасля цвёрдых зычных	Пасля мяккіх зычных
1-ы і 2-і пераднаціскныя склады	*і** *у*** *е*** *о* *а**	*і*(к.) *у* *о* *а*	*і*** *у*** *о*** *а***
Націскныя склады	*і*** *у*** *е*** *о*** *а***	*і* *у* *е*(зв.) *о* *а*	*і* *у** *е* *о** *а***
Паслянаціскныя неканцавыя склады	—	*і*(к.) *у* *о* *а*	*і** *у*** *о** *а*
Паслянаціскныя канцавыя закрытыя склады	—	*і*(к.) *у* *е*(зв.) *о* *а*	*і** *у* *е* *о*** *а**
Паслянаціскныя канцавыя адкрытыя склады	—	*і* *у* *е*(зв.) *о** *а*	*і* *у* *е* *о*** *а*

звужанае (*ы* перайшоў у *і* ў канчатках прыметнікаў), часткова ў *а* перайшоў *е* (загадны лад, множны лік, 2-я асоба), у астатніх выпадках *е* пасля цвёрдых зычных зліўся з *е* звужаным.

Галосныя *а, о, у, е, і* артыкуляцыйна і акустычна такія ж, як і адпаведныя галосныя ў іншых даследуемых гаворках, націскны *а* і *а* з *е* ў канцавых адкрытых ненаціскных складах часам набывае рысы *е*.

Галосны *е* звужанае — гук пярэдняга (пярэдне-сярэдняга) рада, сярэдне-верхняга пад'ёму, абніжаны ў напрамку да сярэдняга пад'ёму, сярэдні паміж *е* і *ы*, блізкі да *е*, але больш вузкі.

Галосны *і* кароткае выступае ў ненаціскной пазіцыі пасля цвёрдых зычных. У моўным патоку ў сувязі з вялікай схільнасцю гаворкі да рэдукцыі гэты гук часцей вымаўляецца як вельмі рэдуцыраваны, з нявызначаным тэмбрам, часам з некаторым паніжэннем у бок артыкуляцыі *е*. Такім чынам, галосны *і* кароткае рэалізуецца пераважна як *ъ* або *і*(*ъ*), зрэдку як *і*(*е*) ці *і*.

Пад націскам пасля цвёрдых зычных *і* ўжываецца толькі на месцы *о* ў новых закрытых складах. Гэты гук у данай пазіцыі часам рэдуцыруецца або набывае якасці галоснага *ы*.

Факультатыўныя варыянты галосных гаворкі в. Субаты прыведзены ў табл. 4.

Кансанантызм

Зычныя фанемы. У субацкай гаворцы 46 асноўных варыянтаў зычных гукаў: *б, б', в, в', ѡ, м, м', п, п', ф, ф', д, д', т, т', з, з', с, с', н, н', й, л, л', р, р', ц, ц', дз, дз', ж, ж', ч, ч', ш, ш', дж, дж', х, х', к, к', г, г', ґ, ґ'*. Ад сіманавіцкай гаворкі субацкая гаворка па складу зычных адрозніваецца наяўнасцю гука *ѡ*, які адпавядае (як і ў папінскай гаворцы) сіманавіцкаму *в* у пазіцыі пасля галосных перад зычнымі і як прыназоўнік. У субацкай гаворцы мяккія губныя *б', м', п'* бінарна не супроцьпастаўляюцца адпаведным цвёрдым губным ні на ўзроўні словаформы, ні на ўзроўні мадэлі, ні ў спалучэнні з галосным. Таму яны з'яўляюцца камбінаторнымі варыянтамі адпаведных цвёрдых губных. Мяккае *ц'* абмежавана пазіцыямі перад націскнымі *і, е* і пасля *с'*, бінарных

супроцьпастаўленняў *ц* і *ц'* пры іх шырокай дыстрыбуцыі не выяўлена. Таму мяккае *ц'* з'яўляецца факультатыўным варыянтам *ц* цвёрдага. Гаворку в. Субаты адрозніваe ад сіманавіцкай гаворкі і значна больш шырокая дыстрыбуцыя мяккіх *к', х', г'*, якія, аднак, не з'яўляюцца асобнымі фанемамі.

Дыстрыбуцыя зычных. Адменнасці субацкай гаворкі ад сіманавіцкай у дыстрыбуцыі зычных перад галоснымі фактычна разгледжаны намі вышэй пры аналізе дыстрыбуцыі галосных. Адзначым, акрамя таго, што перад націскным *і з о* ў новых закрытых складах, як і ў папінскай гаворцы, асноўнымі (не факультатыўнымі) варыянтамі гукаў выступаюць толькі *д, т, з, с, н, л*. Перад зычнымі, пасля галосных і ў канцы слоў адсутнічае губна-зубны *в*, якому адпавядае губна-губны *ѡ*. Выяўлены наступныя спалучэнні зычных: *ѡг' (дóѡг'і), ѡк' (лóѡк'і), мк' (лéмк'і), пц (хлóпце), пк' (лéпк'і), тк' (корóтк'і), нк' (тóнк'і), н'к' (мал'éн'к'і), йк' (бóйк'і), рк' (г'ірк'і), рг' (шміг'іт'), хк' (л'óхк'і), шк' (шк'ідліві)*.

Фізічная рэалізацыя зычных. Якасць зычных гукаў субацкай гаворкі ў аснове такая ж, як і гаворак сіманавіцкай, папінскай, заяленскай. Па складу асноўных варыянтаў зычных гукаў субацкая гаворка адрозніваецца ад сіманавіцкай (як і папінская) наяўнасцю гука *ѡ*. Зычны *ѡ* у субацкай гаворцы губна-губны (білабіяльны), вымаўляецца пры ўдзеле верхняй і ніжняй губы, часам скарачаецца да ступені прыгука, нагадваючы пры гэтым гук гашэння свечкі. У адрозненне ад *ѡ* у папінскай гаворцы зычны *ѡ* у субацкай гаворцы фактычна не мае факультатыўнага варыянта *ў*.

Заслугоўвае ўвагі разгляд у галіне кансанантызму характару велярызацыі зычных і іх варыятыўнасці.

Цвёрдыя зычныя ў субацкай гаворцы характарызуюцца слабай велярызацыяй або яе адсутнасцю. Гэта можна вызначыць пры параўнанні вымаўлення цвёрдых зычных у мове носьбітаў субацкай гаворкі і ў мове носьбітаў драгічынскіх гаворак тыпу сіманавіцкай ці папінскай. У першай яны гучаць больш «мякка» (хоць мы іх не інтэрпрэтуем як «паўмяккія» — слаба палаталізаваныя). Асабліва лёгка гэта заўважаецца ў пазіцыі перад *е, і*, а для губных на канцы слоў. Сведчаннем слабай велярызацыі цвёрдых зычных у субацкай гаворцы з'яўляецца шырокая дыстрыбуцыя ў ёй галоснага *і* пасля цвёрдых зычных, а таксама адсутнасць як асноўнага варыянта гука *ы*.

Выпадкі варыятыўнасці зычных (у адных і тых словах, у мове адных і тых асоб) у субацкай гаворцы праяўляюцца больш шырока, чым у іншых трох даследуемых намі гаворках. Адзначым асноўныя з іх.

1. Перад ненаціскным *і* (з *і, ы, е, ѣ*), пасля якога стаіць краспалатальны або *л'*, губныя вымаўляюцца пераважна цвёрда, нярэдка мякка, часам «паўмякка» (са слабай палаталізацыяй): *кýпіт'—кýп'іт'—кýп·іт', свін'é—св'ін'é—св·ін'é, л'ýбіт'—л'ýб'іт'— л'ýб·іт', побіл'ів—поб'іл'ів — поб·іл'ів, пін'óк — п'ін'óк — п·ін'óк, п'івін'—п'ів'ін'—п'ів·ін', у бід'і — у б'ід'і — у б·ід'і, віл'ік'і—в'іл'ік'і—в·іл'ік'і*.

2. Перад націскным *і* з *о* ў новых закрытых складах губныя, шыпячыя, *р—р'*, заднеязычныя, фарынгальныя вымаўляюцца пераважна мякка, нярэдка цвёрда, зрэдку «паўмякка». Адначасова пасля стаўшых цвёрдымі губных замест *і* вымаўляюцца *ы(і), ы* (апошнія рэдуцыруюцца). Пасля цвёрдага *р* часам рэдуцыруецца галосны *і*. Прыводзім прыклады: *в'ін—він—вы(і)н—вын—вън—в·ін; б'іл'ш—біл'ш—бы(і)л'ш—был'ш — б·іл'ш; ж'інка — ж·інка—жінка; р'ід—рід—ръд; к'ін'—кін'—к·ін'*.

3. Зрэдку і ў іншых пазіцыях перад *і* ў губных, вібрантаў, шыпячых і заднеязычных выступаюць як факультатыўныя варыянты іх «паўмяккія», цвёрдыя (для мяккіх зычных), мяккія (для цвёрдых зычных) адпаведнікі.

Прыведзеныя даныя варыятыўнасці зычных у субацкай гаворцы і назіранні над гэтай варыятыўнасцю даюць падставы зрабіць вывад, што пераадоленню «мяжы» паміж мяккасцю і цвёрдасцю зычных гукаў у даследуемай гаворцы спрыяе падаўжэнне галосных пры вымаўленні перад імі мяккіх зычных замест цвёрдых; адсутнасць велярызацыі ў многіх цвёрдых і палатальнасці (не палаталізацыі!) у некаторых мяккіх зычных (артыкуляцыйна-акустычная розніца паміж невелярызаванымі цвёрдымі і палаталізаванымі мяккімі зычнымі намнога меншая, чым паміж зычнымі цвёрдымі велярызаванымі і мяккімі палатальнымі); рэдукцыя галосных пры вымаўленні на месцы папярэдніх мяккіх зычных іх цвёрдых адпаведнікаў. Вымаўленню *ы* на месцы *і* пасля цвёрдага зычнага спрыяе іх скарачэнне і рэдук-

цыя. У паралельных вымаўленнях тыпу *п'івін'—п'ів'ін'* адзначаны ўплыў наступнага палатальнага на папярэдні галосны *і*, які ў выніку гэтага ўплыву набывае схільнасць да падаўжэння. У сваю чаргу падоўжаны *і* ўплывае на папярэдні зычны і спрыяе яго змякчэнню.

У субацкай гаворцы, як і ў папінскай, цвёрдыя зычныя поўнасцю захоўваюць цвёрдасць перад тымі мяккімі зычнымі, якія этымалагічна ўзыходзяць да цвёрдых зычных, параўн.: *з(')б'іглос'—зб'ірн'а, д(')в'і—дв'ір, одв'ів, с(')в'іт—св'ій, вс(')п'ійу—сп'ід, прі шіт(')в'і—тв'ій.*

Фанемны склад зычных субацкай гаворкі: *б(б'*), в(ѡ*), в'*, м(м'*), п(п'*), ф*(ф'*), д, д', т, т', з, з', с, с', н, н', й, л, л', р, р'*, ц(ц'), дз*, дз'*, ж, ж'*, ч, ч'*, ш, ш'*, дж*(дж'*), к(к'*), х(х'*), г(г'*), ґ*(ґ'*).*

Для субацкай гаворкі характэрны палатальны рад: наяўнасць краепалатальных *д', т', з', с', н'* — адсутнасць (акрамя *в'*) мяккіх губных фанем.

ЗАЎВАГІ АБ ФАНЕМНЫМ СКЛАДЗЕ ІНШЫХ ЗАГАРОДСКІХ ГАВОРАК

Фанемны склад асобных тыпаў загародскіх гаворак у асноўным адпавядае фанемнаму складу даследуемых чатырох гаворак. Назіраюцца наступныя адрозненні ў фанематычным статусе асобных гукаў тых ці іншых гаворак.

Галосны *і* з'яўляецца асобнай фанемай у гаворках тараканскіх, большасці паўднёва- і сярэднезагародскіх і асобных паўночна-ўсходніх загародскіх (Хомск, Заяленне, Здзітава і інш.). Галосны *і* з'яўляецца камбінаторным варыянтам фанемы *ы* ў большасці паўночна-ўсходніх загародскіх гаворак, у тых сярэдне- і паўднёвазагародскіх гаворках, у якіх на месцы *о* ў новых закрытых складах вымаўляецца *і(ю)*.

Галосны *і(ю)* з'яўляецца асобнай фанемай у тых загародскіх гаворках, у якіх ён паслядоўна выступае. Ён бінарна супроцьпастаўляецца галосным *ы (к'і(ю)н'—кын', м'і(ю)й—мый, р'і(ю)й—рый)* і *і (р'і(ю)д—р'ідын'ко)*.

Для мяккіх губных зычных і галоснага *і* характэрны пераходны фанематычны статус ад фанем да іх камбінаторных варыянтаў у тых сярэднезагародскіх гаворках, у якіх на месцы *о* ў новых закрытых складах пад націскам выступае *ы*.

Мяккае *р'* з'яўляецца асобнай фанемай у гаворках тараканскіх, паўднёвазагародскіх, большасці сярэднезагародскіх і асобных паўночна-ўсходніх загародскіх (у тых гаворках, дзе ён ужываецца перад *'е* або *'а* ў націскных складах).

Мяккія шыпячыя *ж', ч', ш'* з'яўляюцца асобнымі фанемамі ў гаворках тараканскіх, паўднёвазагародскіх і асобных сярэднезагародскіх (у тым ліку ў гаворцы в. Сіманавічы).

Мяккае *ц'* з'яўляецца асобнай фанемай у тых загародскіх гаворках, для якіх характэрна яго шырокая дыстрыбуцыя. Мяккае *ц'* — камбінаторны варыянт *ц* цвёрдага ў гаворках, дзе ўжыванне яго абмежавана пэўнымі пазіцыямі.

ПАРАЎНАЛЬНА-ГІСТАРЫЧНАЯ ХАРАКТАРЫСТЫКА АСНОЎНЫХ РЫС ЗАГАРОДСКІХ ГАВОРАК

ВАКАЛІЗМ

Старажытнаруская мова атрымала ад агульнаславянскай галосныя *а, о, у, е, ы, ы* кароткае, *і, і* кароткае, *ǫ, ę, ѣ, ъ, ь*. Разгледзім іх рэалізацыю ў даследуемых гаворках [1].

Рэфлексы галосных *ы, і*. Старажытнарускія *ы, і* ў продкаў чатырох даследуемых гаворак, як паказвае іх сучасны стан, зліліся ў адным гуку. Рэалізацыя *ы, і* ў гэтых гаворках паказана ў табл. 8.

Акрамя таго, адзначаны наступныя рэалізацыі *ы*: *ы>у* ў дзеяслове *бýты (бýте)* 'быць' і вытворных ад яго словах ва ўсіх даследуемых гаворках; *ы>о* ў займеннику *мо* 'мы' ў субацкай гаворцы. Ва ўсіх даследуемых гаворках кароткія *ы, і* ў слабай пазіцыі выпалі, у моцнай рэалізаваліся ў звычайныя *ы, і*.

Рэфлексы галосных *е, ь*. Як паказвае сучасны стан даследуемых гаворак, галосныя *е, ь* (моцная пазіцыя) у іх продкаў зліліся ў адным гуку. Рэалізацыя *е, ь* у гэтых гаворках паказана ў табл. 9.

Акрамя таго, выяўлены наступныя рэфлексацыі:

Рэфлекс *е, ь>а* ў субацкай гаворцы. Рэфлекс *е>а* пад націскам: *бáруг, бáруст, вáпрук, вáчур, вáрус, вс'і вáсне, чітвáр, мад, мáжій, смарт', пáрші, дáрںво, дáвіт', дáвітіро, дáс'іт', дáсітіро, одáжа, зáлін', в зáмн'у, вс'і сáмн'і, нáбо, нáвуд, з зімнáйу, лáтайіт', алá, трáба, врáмн'е, цáбір, в'ін жáніцца, чáріво, чáсані, вічáра, вічáрате, пічáн'а*. Рэфлекс *ь>а* пад націскам: *жірібáц, овáчка, вáрбе, двáре, кравáц, варх, вáрхн'і, напáрсток, скопáц, чіпáц, сліпáц, пáкло, дан', дáнішні, тас'ц', тáшча, стáліт', зáрн'а, сáрце, косáц, конáц, вінáц, жнац, цáрква, чáрве, чáрпайу, шáпчіт', шарс'ц'*. Рэфлекс *е>а* ў формах загаднага ладу: *зроб'іта, прініс'іта, зажін'іта*.

У гаворцы в. Заяленне ў новых націскных закрытых складах *е>о>'у: л'уд, т'ýтка, прін'ýс, прівýв*. У іншых гаворках у гэтай пазіцыі *е>о>'і: л'ід* (См, Пп, Сб), *т'ітка* (См, Пп, Сб), *прын'іс* (См, Пп), *прін'іс* (Сб), *прыв'ів* (См, Пп), *прів'ів* (Сб).

У націскным становішчы перад цвёрдымі пасля мяккіх (ці «паўмяккіх») *в, з, с, л, д* (у гаворцы в. Заяленне таксама пасля *н*) *е>о: с'ім в'орст* (См, Пп, Зл, Сб), *оз'óра* (См, Пп, Зл, Сб), *с'óстры* (См, Пп), *с'óстрі* (Зл), *с'óстре* (Сб), *выс'óлый* (См, Пп, Зл), *віс'óлі* (Сб), *дал'óко* (См, Пп, Зл, Сб), *д'óшово* (См, Пп, Зл, Сб), *кон'óм* (Зл.).

Табліца 8

Рэфлексы *ы, і*

Вёскі	*ы*	*і*	*е*
Заяленне	Пасля ўсіх зычных, акрамя шыпячых, заднеязычных, *ц, р (ходыты)*	Пасля шыпячых, заднеязычных, *ц, р (ріба, чісто, цібул'а, рук'і)*	—
Сіманавічы	Ва ўсіх пазіцыях *(ходыты, рыба, чысто, рукы)*	—	—
Папіна	Ва ўсіх пазіцыях *(ходыты, рыба, чысто, рукы)*	У асобных выпадках пасля заднеязычных *(коротк'ій)*	—
Субаты	—	У ненаціскным становішчы, акрамя канцавых адкрытых складоў *(дімок, ходіт')*	Пад націскам і ў канцавых адкрытых складах* *(ходете, сен)*

* Выключэнне складае пазіцыя ў канцавых паслянаціскных складах у прыметніках мужчынскага роду адзіночнага ліку назоўнага склону, дзе вымаўляецца *і*: *сені, чорні*.

[1] Далей прыняты наступныя скарачэнні: Зл — в. Заяленне, Пп — в. Папіна, Сб — в. Субаты, См — в. Сіманавічы.

Табліца 9

Рефлексы *е*, *ь*

Вёскі	*е*	*ы*	*і*
Заяленне	Націскныя і канцавыя пасляна-ціскныя склады (*ден'*, *поле*, *хлопец*)	Ненаціскныя склады (акрамя канцавых) пасля ўсіх зычных, за выключэннем шыпячых, заднеязычных, *ц*, *р* (*сыло*, *дын'ок*)	Ненаціскныя склады (акрамя канцавых) пасля шыпячых, заднеязычных, *ц*, *р* (*вырітыно*, *шіптав*)
Сіманавічы	Націскныя і канцавыя пасляна-ціскныя склады (*ден'*, *поле*, *хлопец'*)	Ненаціскныя склады, акрамя канцавых (*сыло*, *дын'ок*)	Новыя націскныя закрытыя склады (*т'ітка*)
Папіна	Націскныя і канцавыя адкры-тыя пасляпаціскныя склады (*ден'*, *поле*)	Ненаціскныя склады, акрамя канцавых адкрытых (*сыло*, *дын'ок*, *хлопыц'*)	Новыя націскныя закрытыя склады (*т'ітка*)
Субаты	Канцавыя ненаціскныя склады (акрамя закрытых) у канчатках назоўніка ў назоўнага склону (*поле*)	—	Ненаціскныя склады, акрамя канцавых адкрытых, націскныя закрытыя склады (*сіло*, *дін'ок*, *т'ітка*)

Табліца 10

Рэфлексы *ѣ*

Вёскі	*і*	*'і*	*ы*
Заяленне	Пасля *в*, *р*, *ц* (*відро*, *ріка*, *цівк'і*)	Націскныя склады (*сн'іг*, *л'іто*), частковa нераднаціскныя склады	Ненаціскныя склады (*стына*, *ходыт'*)*
Сіманавічы	—		
Папіна	—		
Субаты	Ненаціскныя склады (*відро*, *стіна*, *ходіт'*)		—

* Пераход *ѣ* > *ы* не пад націскам непаслядоўны: *дыдок* (См, Пп, Зл), *дідок* (Сб) і *д'ідок* (См, Зл, Сб), *звырок* (См, Пп, Зл), *звірок* (Сб) і *зв'ірок* (См, Зл, Сб), *лысок* (См, Пп), *лісок* (Сб) і *л'ісок* (См, Пп, Зл, Сб), *сн'іжок* (См, Пп, Зл Сб).

Пасля шыпячых і *й* перад цвёрдымі зычнымі незалежна ад націску *е*>*о*: *жóвтый* (См, Пп, Зл), *жóвті* (Сб), *чогó* (См, Пп, Зл, Сб), *чолов'ік* (См, Пп, Зл, Сб), *йогó* (См, Пп, Зл, Сб).

Галосны *ь* у суседстве з *л*, часам з губнымі, перайшоў у *ъ*, апошні ў моцнай пазіцыі даў *о*: *вóвна* (См, Пп, Зл, Сб), *пóвный* (См, Пп, Зл), *пóвні* (Сб), *вовк* (См, Пп, Зл, Сб).

Рэфлексы *ѣ* паказаны ў табл. 10.

У гаворках на поўнач ад Камянца (Дзмітравічы, Камянюкі і інш.) пашыраны рэфлекс *ѣ*>*ы* пад націскам (акрамя пазіцыі пасля *л*): *бы́лый*, *дыд*, *ты́ло*, *зы́л'л'е*, *л'іс*. Такі ж рэфлекс уласцівы гаворкам вв. Айрэнай-2 і Гейсішкес-2 Вільнюскага раёна Літоўскай ССР, дзе з 1904 г. жывуць перасяленцы з Брэсцкага павета і іх патомкі: *ды́вчына*, *сы́но*, *зы́л'л'е*, *лы́то*, *хлыб*.

Рэфлексы галосных *а*, *ę*. У гаворках вв. Сіманавічы і Заяленне этымалагічны *а* захаваўся ва ўсіх пазіцыях, у гаворках вв. Папіна і Субаты — ва ўсіх пазіцыях, акрамя націскных складоў пасля мяккіх зычных, дзе *а* перайшоў у *е*.

У старажытнарускай мове і, відаць, у асноўных усходнеславянскіх дыялектах праславянскі галосны *ę*

поўнасцю супаў з галосным *а*. Сучасныя загародскія гаворкі не пацвярджаюць палажэння, што ў іх продкаў у старажытнарускую пару адбылося канчатковае зліццё *а* і *ę* ў паслянаціскных складах, таму што ў гэтай пазіцыі *ę* і *а* часцей за ўсё даюць розныя рэфлексы. Так, у паслянаціскных закрытых складах ва ўсіх чатырох даследуемых гаворках *ę* ў некаторых выпадках перайшоў у *'а: с'ім тыс'ач* (См, Пп, Зл), *с'ім тёс'ач* (Сб), *м'іс'ац'* (См, Пп), *м'іс'ац* (Сб, Зл). У большасці выпадкаў у данай пазіцыі галосны *ę* ў гаворках вв. Сіманавічы і Заяленне перайшоў у *е*, у гаворцы в. Папіна — у *ы* (<*е*), у гаворцы в. Субаты — у *і* (<*е*): *пáмет'* (См, Зл), *пáмыт'* (Пп), *пáміт'* (Сб), *дёсет'* (См, Зл), *дёсыт'* (Пп), *дáс'іт'* (Сб), *дёвет'* (См, Зл), *дёвыт'* (Пп), *дáвіт'* (Сб).

У ненаціскных адкрытых неканцавых складах ва ўсіх гаворках пры змене форм слоў *а* з *ę* захоўваецца, *е* з *ę* ў гаворках вв. Сіманавічы і Заяленне змяняецца на *ы*: *тыс'ача* (См, Пп, Зл, Сб), *нымá м'іс'ац'а* (См, Пп), *нымá м'іс'аца* (Зл), *німá м'іс'аца* (Сб), *дысыт'і* (См, Зл, Пп), *дісіт'і* (Сб), *пáмыты* (См, Пп, Зл), *пáміте* (Сб), *з'ат'кó* (См, Зл, Пп, Сб).

У паслянаціскных канцавых адкрытых складах ва ўсіх гаворках *ę* даў *е*: *вымн'е* (См, Пп, Зл), *вёмн'е* (Сб), *с'імн'е* (См, Пп, Зл, Сб), *т'імн'е* (См, Пп, Зл, Сб), *ймён'н'е* (См, Пп, Зл), *ймáн'н'е* (Сб), *врёмн'е* (См, Пп, Зл), *врáмн'е* (Сб).

У націскных складах пасля мяккіх зычных этымалагічныя *а* і *ę* ў асноўных дыялектных тыпах загародскіх гаворак далі аднолькавы рэфлекс: у сярэдне- і паўночна-ўсходніх загародскіх (у тым ліку ў гаворках вв. Сіманавічы і Заяленне) — *а*, у паўднёвазагародскіх і тараканскіх (у тым ліку ў гаворках вв. Папіна і Субаты) — *е*. У пазіцыі пад націскам пасля мяккіх зычных у гаворках заходніх абласцей УССР адбыўся пераход *а, ę*>*е*. Гэта з'ява даследавана А. М. Залескім (37—39). А. М. Залескі для заходнеўкраінскіх, аўтары працы «Утварэнне паўночнарускага дыялекта і сярэднерускіх гаворак» для паўночнавелікарускіх гаворак прамежкавым звяном пры пераходзе *'а, ę*>*е* лічаць галосны, блізкі да *а(е)* (38, *39—50;* 87, *19—22*). Цікавым, на наш погляд, з'яўляецца меркаванне аўтараў названай працы аб тым, што гук, блізкі да *а(е)*, пасля мяккіх

зычных (і перад мяккімі зычнымі) існаваў у многіх тых паўночнавелікарускіх гаворках, у якіх у данай пазіцыі зараз выступае не галосны *е*, а галосны *а*, г. зн. што перадумовы паўночнавелікарускага пераходу *'а, ę*>*е* існавалі ў свой час на значна больш шырокай тэрыторыі, чым тая, дзе гэта з'ява адбываецца зараз. Таксама, на думку Л. Э. Калнынь, ва ўсходнеславянскіх дыялектах *ę* змяніўся першапачаткова ў *а(е)*, а затым у *а* (47, *20*). Можна дапусціць, што тое самае адбылося і ў загародскіх гаворках. У пацвярджэнне прывядзём такі факт. У гаворцы в. Дзмітравічы Камянецкага раёна на месцы *ę, 'а* ў націскным становішчы пасля мяккіх зычных выступае *а*. Аднак некаторыя найбольш старэйшыя носьбіты гэтай гаворкі ў данай пазіцыі вымаўляюць галосны *а(е)* (у час экскурсіі яго вымаўленне набліжаецца да *е*, у час рэкурсіі — да *а*): *з'á(е)т'а, одган'á(е)тымут, н'á(е)н'чыте, гл'á(е)нула, Омыл'á(е)н, купл'á(е)йе, зымл'á(е), ныйá(е)ка, пр'á(е)мо, ж'á(е)ла, прыйіжджá(е)йе, ч'а(е)с, ч'á(е)сом, обуч'á(е)л'і*. Прыкладна такую ж з'яву назірала Т. В. Назарава ў гаворцы в. Пяскі Кобрынскага раёна (76, *100*).

Рэалізацыя *'а, ę*>*'е* ў загародскіх гаворках прадстаўлена трыма тыпамі: 1. Тараканскія і большасць паўднёвазагародскіх гаворак — *'е*<*'а, ę* пад націскам выступае пасля ўсіх мяккіх зычных. 2. Гаворкі поўдня Брэсцкага раёна — *'е*<*'а, ę* пад націскам выступае пасля ўсіх мяккіх зычных, акрамя *й*. 3. Некаторыя гаворкі паўночнага захаду Жабінкаўскага раёна (напр., в. Дзяменічы Хмялёўскага сельсавета) — *'е*<*'а, ę* пад націскам выступае толькі пасля шыпячых: *ш'éпка, ж'éты, вынч'éтыс', лыж'éв, ж'éба, ч'ес, кач'éйу, душ'é*, але *вз'ав, с'áду, зн'ав, д'áкуйу, т'áшко, л'áжу, гр'ад*.

Рэфлексы галосных *о, ъ*. Праславянскі *ъ* ў старажытнарускую эпоху ў моцнай пазіцыі супаў з галосным *о*. У сучасных загародскіх гаворках адлюстравана такое супадзенне: у моцнай пазіцыі на месцы *ъ* заўсёды выступае *о*. Этымалагічны *о* ў даследуемых гаворках у большасці пазіцый захаваўся. У новых закрытых складах пад націскам на месцы *о* выступаюць: у гаворках вв. Папіна і Субаты *і*, у гаворцы в. Сіманавічы *ы*, рэдка *і*, у гаворцы в. Заяленне *у*, рэдка *і* або *ы*.

У многіх сярэднезагародскіх (і некаторых паўднёвазагародскіх) гаворках на месцы *о* ў новых закрытых

складах выступае *і(ю)*. Галосны *і(ю)* у гэтай пазіцыі ўяўляе адну з апошніх ступеней пераходу *о>і* (87; 88). На Брэстчыне пераход *і(ю)>і* — жывая з'ява нашага часу. Нярэдка ў адных і тых гаворках у разглядаемай пазіцыі на месцы *о* ўжываюцца гукі *і(ю)* і *і*, прычым малодшае пакаленне гук *і* ўжывае часцей, чым старэйшае. Часам у мове старэйшага пакалення пераважае *і(ю)*, а ў мове малодшага пакалення — *і* або наогул ужываецца амаль выключна *і*, а *і(ю)* сустракаецца толькі спарадычна.

Пераход *о>і* ў адрозненне ад іншых рэалізацый галосных у гаворках Брэсцка-Пінскага Палесся (*а>е*, *е>а*, *ѣ>і*, *ѣ>е*, *о>у* і інш.) характарызуецца наступным. У адзначаных рэфлексацыях, акрамя *о>і*, адбываліся пераходы блізкіх па месцы ўтварэння гукаў, напрыклад гукаў пярэдняга рада сярэдняга пад'ёму і пярэдняга рада верхняга пад'ёму. Гукі ж *о* і *і* далёкія па месцы ўтварэння: першы — сярэдняга пад'ёму задняга рада, другі — верхняга пад'ёму пярэдняга рада. Таму пераход *о>і*, безумоўна, быў намнога цяжэйшым і больш складаным, чым пераходы *ѣ>і*, *е>а* і інш. Гэта дае падставы меркаваць, што рэфлекс *о>і* ва ўсходнеславянскіх гаворках з'яўлясцца субстратнай з'явай, прычым субстратам маглі быць славянскія гаворкі, якія рана і трывала адасобіліся ад асноўнага славянскага арэала, або іншыя індаеўрапейскія ці нават не індаеўрапейскія дыялекты.

У пераважнай большасці паўднёва- і сярэднезагародскіх гаворак у разглядаемай пазіцыі перад *і* з *о* губныя зычныя мяккія, у некаторых гаворках цвёрдыя.

Завяршальны этап пераходу *о>ы* ў разглядаемай пазіцыі выяўлены намі ў гаворцы в. Сіманавічы, а таксама ў гаворцы в. Дзмітравічы Камянецкага раёна. У гаворцы в. Дзмітравічы сярэдняе і малодшае пакаленне на месцы *о* ў новых закрытых складах пад націскам ужывае *ы*, сярэдняе пакаленне — зрэдку дыфтонг *і(ю)ы*, а таксама *і*, у мове старэйшага пакалення ў адных асоб ужываецца пераважна *і(ю)ы*, зрэдку *і(ю)*, *і*, у некаторых асоб — паралельна *і(ю)ы*, *і(ю)*, зрэдку *і*.

У сіманавіцкай гаворцы папярэднікам *ы* на месцы *о* ў новых закрытых націскных складах, як ужо гаварылася, з'яўляўся галосны *і*. Галоўнымі прычынамі пераходу *і>ы* ў разглядаемай пазіцыі ў сіманавіцкай гаворцы, на наш погляд, з'яўляюцца наступныя асаблівасці і тэндэнцыі гаворкі: уздзеянне на *і* папярэдніх цвёрдых зычных; тэндэнцыя да выраўноўвання блізкіх па артыкуляцыйных адзнаках гукаў *ы* і *і*; вялікая частотнасць гука *ы*: на месцы этымалагічных *ы* (*бычо́к, дым*), *і* (*робы́ты, зыма́*), *е* (*высна́, сыстра́*), *ь* (*дын'о́к, вырба́*), *ѣ* (*вынок, выдро́*); паслядоўнасць, за выключэннем пазіцыі перад *і*, велярызацыі цвёрдых зычных; паслядоўнасць, за рэдкімі выключэннямі, у старой сіманавіцкай гаворцы цвёрдага вымаўлення зычных перад *і* з *о*; тэндэнцыя да разбурэння ў гаворцы тэмбравай карэляцыі і ўстанаўлення ў ёй, як у большасці загародскіх гаворак, палатальнага рада, паколькі дзякуючы пераходу *і>ы* пасля цвёрдых зычных мяккія губныя замест статусу асобных фанем набылі статус камбінаторных варыянтаў фанем. Аб ролі фанематычнага статусу мяккіх губных у процілпастаўленні «палатальны рад — тэмбравая карэляцыя» (117; 127; 142) і пераходзе *і>ы* можа сведчыць становішча ў суседняй з сіманавіцкай гаворцы в. Вулька Сімапаўская (мова пераважнай часткі старэйшага пакалення). У гэтай гаворцы губныя ацвярдзелі амаль паўсюдна, у тым ліку перад рэфлексамі *ѣ* ў націскным становішчы (*собы́ — собйі, ны вйі́ду* 'не ведаю', *вйі́т'ор, пйі́рйе, тобы́ — тобйі, в т'урмы́, ны мн'і́йу* 'не ўмею'), чаго амаль не назіраецца ў іншых драгічынскіх гаворках.

Прамежкавай ступенню пры пераходзе *о>у* ў славянскіх гаворках, на думку даследчыкаў, з'яўляліся *уо*, *о* закрытае або *о* вузкае (34, *49—50;* 78, *39—51;* 79, *67—91;* 114, *26—27;* 140, *86—99;* 141). На перыферыі загародскіх гаворак на месцы *о* ў новых закрытых складах можа ўжывацца *о* закрытае, рэдка *уо*.

У новых закрытых націскных складах у аналізуемых намі чатырох гаворках і ў пераважнай большасці іншых загародскіх гаворак *о* захоўваецца: *в конц'і* (См, Пп, Сб), *в конці́* (Зл), *ра́дос'ц'* (См, Пп, Зл, Сб), *мосткы́* (См, Пп), *мостк'і* (Зл).

У ненаціскным становішчы ў вывучаемых гаворках этымалагічны *о* захаваўся. У якасці выключэння можна адзначыць:

1. Пераход *о>у* ў прыстаўцы-прыназоўніку *пуд-* (*<под-*): *пудн'а́в* (См, Зл), *пудн'е́в* (Пп, Сб), *пудыйты́* (См, Пп, Зл), *пудійте́* (Сб), *пуд столо́м* (См, Пп, Зл,

Сб), *пудлóга* (См, Пп, Зл, Сб), *пýдбыгом* (См, Пп, Зл), але *п'ідбыгом* (Сб). Прыстаўка-прыназоўнік *пыд-* (*п'ід-*) характэрна для гаворкі в. Спорава Бярозаўскага раёна (*пыдн'áты, пыдлóга, пыд столóм*), в. Парэ Пінскага, а таксама паўночнабрэсцкім гаворкам поўдня Івацэвіцкага раёнаў (в. Горталь і інш.), паўднёвацеляханскім, некаторым верхняясельдскім (в. Ткачы і інш.) і сярэднепагарынскім (в. Струга і інш.) гаворкам.

2. Пераход *о>у* ў асобных лексемах у іншых выпадках: *кумáр* (См, Пп, Зл, Сб), *кумар'і* (См, Пп, Сб), *кувáты* 'аб зязюлі' (См, Пп, Зл), *кувáте* (Сб).

3. У гаворцы в. Субаты, як і ў іншых тараканскіх гаворках, значна больш выпадкаў пераходу *о>у* і *о(<е)>у* не пад націскам: *бáруг, вáчур, Нéкун, Хвáдур, сáл'уг, пушлá, пушóв, кумпáн'ійа, брудóк, спувáте, вáл'ун.*

Даследуемыя гаворкі адносяцца да окаючых. Для некаторых загародскіх гаворак характэрна уканне (16; 33, карта *2*). У Драгічынскім раёне да укаючых адносяцца гаворкі Радастаўскага сельсавета і гаворка в. Ялочча. Аканне характэрна для гаворкі в. Вулька Радавецкая Драгічынскага раёна (па агульнай структуры гэта гаворка адносіцца да паўднёвазагародскага тыпу).

Рэфлексы галосных *у, ǫ*. У даследуемых гаворках этымалагічны *у* паслядоўна захаваўся, а этымалагічны *ǫ* супаў з *у*: *плуг* (См, Пп, Зл, Сб), *плугы* (См, Пп), *плугé* (Сб), *плуг'і* (Зл), *гус'* (См, Пп, Зл, Сб), *гус'áчый* (См), *гус'áчій* (Зл), *гус'éчый* (Пп), *гус'éчі* (Сб).

КАНСАНАНТЫЗМ

У старажытнарускай мове пачатковага перыяду (да пачатку XI ст.) зычныя гукі падзяліліся на цвёрдыя і мяккія; цвёрдыя перад галоснымі пярэдняга рада з'яўляліся «паўмяккімі» (3, *238—241;* 34, *60;* 44, *123—284;* 47; 50, *271—273;* 51; 105, *110—112;* 119, *302—312;* 124, *92—94*). Назва «паўмяккія» для старажытнарускай і агульнаславянскай моў некалькі ўмоўная, таму што характар «паўмяккіх» зычных у старажытных моўных сістэмах канчаткова не вызначаны. Яны маглі быць слаба палаталізаваныя, цвёрдыя невелярызаваныя, мяккія палаталізаваныя (у адрозненне ад палатальных), акрамя таго, маглі адрозніваццa ў пэўных пазіцыях у залежнасці ад мовы, гаворкі і эпохі.

Для даследуемых гаворак характэрна шырокая дыстрыбуцыя цвёрдых зычных. Таму ніжэй адзначым толькі тыя пазіцыі, дзе мяккія зычныя ўжываюцца на месцы «паўмяккіх» і мяккіх.

Мяккія губныя. 1. Перад націскным *і<ѣ: б'ілый, п'іс'н'а.* Цвёрдыя губныя ў гэтай пазіцыі ў многіх гаворках Камянецкага раёна (*бы́лый, пы́сня*), гаворках в. Гарадное на Століншчыне (*бы́лый*) і в. Вулька Сіманаўская на Драгічыншчыне (*бі́лый, тобі́, тобы́*). 2. У тараканскіх гаворках толькі як факультатыўныя варыянты цвёрдых губных перад *і* рознага паходжання, пасля якога стаіць палатальны зычны. 3. У асобных лексемах перад іншымі зычнымі (галоўным чынам губны *в'*). 4. У дзеясловах 1-й асобы адзіночнага ліку адбылося расшчапленне мяккіх *б', в', п'* на цвёрдыя губныя і *л'* або *й: робл'ý — робйý, ловл'ý — ловйý, лупл'ý — лупйý.* Расшчапленне мяккіх губных на мадэль «цвёрды губны +*й*» характэрна для гаворак поўдня Беларусі (33, карты *7, 29, 50*).

Мяккія пярэднеязычныя. 1. Перад націскным *і<ѣ: д'ід, с'іно, з'іл'л'е.* У многіх гаворках Камянецкага раёна і ў гаворцы в. Гарадное на Століншчыне пярэднеязычныя (акрамя *л*) у гэтай пазіцыі цвёрдыя: *дыд, сы́но, зы́л'л'е.* 2. Перад рэфлексамі *ę*. 3. Ва ўсіх пазіцыях перад былым «выпаўшым» галосным пярэдняга рада. 4. У гаворках вв. Сіманавічы, Заяленне, Субаты адзначаны мяккі зычны *л'* у слове *вы́л'ікый (вы́л'ік'ій, віл'ікі)*. У загародскіх гаворках ізаглоса мяккага *л'* перад *е, і* адхіляецца ад агульнай ізаглосы цвёрдых-мяккіх пярэднеязычных у гэтай пазіцыі на поўдзень ад Высокага, Камянца, Гарадзечны; на поўдзень ад Малечы, Машковіч; на поўдзень ад Лагішына, Багданаўкі; на паўднёвы захад ад г. Століна (на поўнач ад Глінкі і Гарадной). 5. Этымалагічныя мяккія *з', с'* захаваліся: *на ноз'і, блохá — блос'і*, але *мýха — мýсы.* У гаворцы в. Заяленне ацвярдзеў зычны *с'* у суфіксу *-ск-*. 6. Мяккі губны *м'* перайшоў у *мн': мн'áсо, помн'áв* (См, Зл), *мн'éсо, пом'нéв* (Пп, Сб).

Іншыя рэалізацыі пярэднеязычных. 1. Мяккі *т'* пасля мяккага *с'* і мяккі *д'* пасля мяккага *з'* пераважна вымаўляюцца як *ц'* (*<т'*) і *дз'* (*<д'*), пры паралельным

вымаўленні іх — як *т'* і *д'*, у апошнім выпадку папярэднія *с* і *з* вымаўляюцца пераважна цвёрда. У гаворцы в. Сварынь Драгічынскага раёна адбыўся пераход *т'>ц', д'>дз'*, акрамя пазіцый перад *е, і*. У гаворках вв. Радаства, Гаравіца, Ражное Драгічынскага раёна адбыўся пераход *т'>к': т'ітка>к'ітка, т'іл'ко>к'іл'ко, т'істо>к'істо, т'ітра́д'>к'ітра́д'*. У перасяленскіх гаворках, якія размешчаны ў межах загародскага арэала, але адносяцца да іншых груп, *д', т'* перайшлі ў *дз', ц'* (вв. Калоднае Столінскага, Нямержа Драгічынскага раёнаў) або захаваліся (д. Гнілец Драгічынскага раёна). 2. Нескладовы *л* перайшоў у *в* або *ŵ*. Губна-зубны *в* у пазіцыі пасля галосных перад зычнымі і на канцы слоў характэрны для большасці загародскіх гаворак (33, карта *40*). 3. У гаворках вв. Папіна і Субаты адны і тыя зычныя ў адной і той пазіцыі перад мяккімі зычнымі вымаўляюцца або мякка (і зрэдку паралельна цвёрда і «паўмякка»), або толькі цвёрда: *д(')в'і — дв'ір*.

Мяккі *р'*. Этымалагічна мяккі *р'* у сіманавіцкай, папінскай і субацкай гаворках захаваў мяккасць у націскных складах перад рэфлексамі *ѣ, 'а, ę*. Мяккі *р'* на месцы цвёрдага ў гэтых гаворках ужываецца перад *і<о* ў новых націскных закрытых складах. Адзначаны характар ужывання *р'*, уласцівы сярэдне- і паўднёвазагародскім, тараканскім і некаторым (у Камянецкім, Маларыцкім, Кобрынскім раёнах) паўночна-ўсходнім загародскім гаворкам. У многіх сярэднезагародскіх гаворках усходняй часткі Пінскага і заходняй часткі Столінскага раёнаў (вв. Ласіцк, Рухча і інш.) *р* цвёрды перад націскным *а*.

Мяккі *ц'*. Этымалагічны *ц'* пераважна захаваў мяккасць у гаворках вв. Сіманавічы і Папіна. Этымалагічны *ц'* мяккі толькі ў націскных складах перад рэфлексамі *ѣ, 'а, ę* ў гаворцы в. Субаты. У гаворцы в. Заяленне этымалагічны *ц'* паслядоўна дыспалаталізаваўся, як і ў многіх паўночна-ўсходніх загародскіх гаворках.

Найбольш шырокая дыстрыбуцыя мяккага *ц'* у гаворках Камянецкага раёна. Такая ж дыстрыбуцыя гэтага гука ў падляшскіх гаворках (147). У большасці паўночна-ўсходніх загародскіх гаворак мяккі *ц'* ужываецца перад *і, 'а* ў націскных складах.

Мяккія шыпячыя. Шыпячыя захавалі мяккасць: 1. Перад націскным *і<ѣ* ў гаворках вв. Сіманавічы, Папіна, Субаты, як у іншых тараканскіх сярэдне- і паўднёвазагародскіх, некаторых паўночна-ўсходніх загародскіх (у Камянецкім, Маларыцкім, Кобрынскім раёнах) гаворках. 2. Перад рэфлексамі націскных *а, ę* ў гаворках вв. Сіманавічы, Папіна, Субаты, як у большасці сярэднезагародскіх гаворак (заходнезагародская зона, Іванаўскі раён, некаторыя гаворкі Пінскага раёна), у гаворках паўднёвазагародскіх і тараканскіх. У сярэднезагародскіх гаворках Пінскага і Столінскага раёнаў у гэтай пазіцыі мяккія шыпячыя ўжываюцца спарадычна, хоць у мінулым іх дыстрыбуцыя ў гэтых гаворках была шырэй (108, *24*). 3. Перад рэфлексамі націскнога *о* ў новых закрытых складах у гаворках вв. Папіна, Субаты, як у іншых гаворках тараканскіх, паўднёвазагародскіх, большасці сярэднезагародскіх.

Мяккія заднеязычныя ўжываюцца ў гаворцы в. Заяленне паслядоўна перад галоснымі пярэдняга рада; у гаворках вв. Папіна і Субаты перад *і* ў асобных пазіцыях.

Этымалагічныя *й, і* нескладовае. Праславянскім *й* і *і* нескладоваму ў даследуемых гаворках адпавядае пераважна *й*. У субацкай гаворцы ў адной з пазіцый ужываецца *і* нескладовае (пасля націскнога галоснага ў канчатках прыметнікаў мужчынскага роду). Шырокая ўжывальнасць *і* нескладовага на месцы *й* і *і* нескладовага, у тым ліку перад галоснымі, уласціва гаворкам, размешчаным на поўнач ад Брэсцка-Пінскага Палесся, напрыклад у Баранавіцкім, Ляхавіцкім, Івацэвіцкім раёнах.

НЕКАТОРЫЯ ПЫТАННІ ГЕНЕЗІСУ ГАВОРАК БРЭСЦКА-ПІНСКАГА ПАЛЕССЯ

Дыялектны ландшафт Брэсцка-Пінскага Палесся складаны. На яго фарміраванне аказалі ўплыў многія фактары. Аб некаторых з іх мы можам гаварыць на аснове прааналізаванага матэрыялу і дадатковых экстралінгвістычных крыніц.

Адзін з такіх фактараў — гэта міграцыйныя рухі розных эпох пачынаючы з канца праславянскага часу (116). Відаць, аб уплыве міграцыйных рухаў на фарміраванне асобных дыялектных адзінак Брэсцка-Пінскага Палесся ў пэўнай меры сведчаць сувязі асобных груп даследуемага рэгіёна з гаворкамі іншых славянскіх абласцей, адсутнасць у гаворках гэтай зоны для часткі рыс так званай лінгвістычнай бесперапыннасці, сепаратныя адносіны адных груп паміж сабой і супроцьпастаўленне іх другім групам і г. д. Аднак, гаворачы пра міграцыі, мы лічым найбольш верагодным, што разгледжаныя намі дыялектныя тыпы сфарміраваліся ў самім Брэсцка-Пінскім Палессі, а не «мігрыравалі» аднекуль у «гатовым» выглядзе. Гэта пацвярджаецца фактам, што нідзе за межамі даследуемай вобласці мы не знаходзім тых дыялектных фанетычных структур, якія ў ёй пашыраны. Зараз намі выяўлены ў розных славянскіх абласцях толькі комплексы асобных рыс, характэрных для пэўных дыялектных тыпаў Брэсцка-Пінскага Палесся.

Разгледжаны матэрыял дае падставы меркаваць, што дыялектныя тыпы Брэсцка-Пінскага Палесся сфарміраваліся ў выніку ўзаемадзеяння некалькіх кампанентаў. Палескі кампанент з'яўляецца састаўной часткай усіх даследуемых дыялектных тыпаў. Аднак у паўночна-ўсходніх загародскіх гаворках у параўнанні з

гаворкамі сярэднезагародскімі і тараканскімі ён праяўляецца значна больш. Уплыў паўднёвых кампанентаў на паўночна-ўсходнія загародскія гаворкі меншы, чым на сярэднезагародскія і тараканскія. На фарміраванне тараканскіх гаворак, відаць, значны ўплыў аказаў кампанент верхняпрыпяцкі (ці верхняпрыпяцка-ўсходнекарпацкі), на фарміраванне сярэднезагародскіх гаворак, магчыма, кампанент паўднёва-ўсходні славянскі. Сярэднебеларускі кампанент адыграў пэўную ролю ў фарміраванні загародскіх гаворак наогул (пераход *е>о* і інш.). Акрамя таго, назіраюцца «сепаратныя» сувязі гэтага кампанента з асобнымі іх адзінкамі: паўночна-ўсходнімі загародскімі і тараканскімі гаворкамі, усходнезагародскай зонай, паўночна-ўсходняй і паўночна-заходняй мікразонамі. Верхняпрыпяцка-ўсходнекарпацкі кампанент, магчыма, сфарміраваўся ў выніку ўзаемадзеяння кампанентаў паўднёва-заходняга славянскага і паўднёва-ўсходняга славянскага.

Другі важны фактар, які, відавочна, аказаў істотны ўплыў на фарміраванне дыялектнага ландшафту Брэсцка-Пінскага Палесся, — гэта раздзяленне яго тэрыторыі ў розныя перыяды межамі племянных саюзаў, дзяржаў, феадальных княстваў, зямель і інш. Так, у вывучаемай вобласці прыкладна супадаюць арэалы асноўных масіваў сучасных дыялектных адзінак і сярэдневяковых плямёнаў: сярэдне- і паўднёвазагародскія гаворкі — валыняне; паўночна-ўсходнія загародскія гаворкі — драўляне; паўночнабрэсцкія і тураўскія гаворкі — дрыгавічы. Большасць паўднёвазагародскіх гаворак па агульнай структуры адрозніваецца ад сярэднезагародскіх толькі наяўнасцю асобных тараканскіх рыс, таму правамерна супастаўленне абедзвюх груп з адным племянным арэалам. Тараканскія гаворкі ўтвараюць усяго некалькі астравоў. Як гаварылася вышэй, іх фарміраванне, відаць, адбывалася пры ўдзеле верхняпрыпяцка-ўсходнекарпацкага кампанента. Гэты кампанент хутчэй за ўсё ўяўляў старадаўнюю славянскую моўна-этнічную адзінку, якая потым увайшла ў склад іншых адзінак, прычым найбольшым яе ўплыў аказаўся на гаворкі рада астравоў і масіваў, размешчаных у верхняпрыпяцка-ўсходнекарпацкай зоне. Цікава, што ўсходняя мяжа гэтай зоны (па рр. Гарынь і Збруч) прыблізна супадае з граніцай паміж лужыцка-высоцкай і скіфска-неўрскай

культурнымі абласцямі ў I тыс. да н. э. (97, *104—168, 185—228)*, а заходняя мяжа — гэта сучасная ўсходнеславянска-польская моўна-этнічная граніца.

Адзначаны вышэй племянны падзел насельніцтва Брэсцка-Пінскага Палесся нельга лічыць «спрадвечным». Гоцкі гісторык VI ст. Іардан пісаў пра славян, што «іх назвы... мяняюцца адпаведна розным родам і мясцовасцям» (46, *71—72*). У старадаўнім славянскім кантыніуме, відавочна, існавалі дыялектныя зоны (118), хоць адносна характару блізкасці паміж старажытнымі славянскімі дыялектамі выказваюцца супрацьлеглыя думкі (59, *22*; 119, *30—32, 86*). У V—VII стст. славянскае насельніцтва басейна Прыпяці, відаць, уяўляла пэўнае адзінства (10, *91—93, 133, 134, 142;* 103, *198—203)*, якое хутчэй за ўсё з'яўлялася драўлянска-раннедрыгавіцкім. У VIII ст. частка насельніцтва Заходняга Палесся, на захад ад р. Стыр, г. Пінска і сярэдняй Ясельды, увайшла ў валынянскі саюз (4, *140—142;* 63, *30, 42—43;* 64, табліца *2-а*), які першапачаткова абмяжоўваўся толькі паўднёвай Валынню (10, *97—99, 136—140)*. Паводле археалагічных даных (102; 104, *82—84,* рыс. *18)*, раён кампактнага рассялення дрыгавічоў на ўсходзе Заходняга Палесся ў IX—X стст. абмяжоўваўся парэччам нізоўяў р. Гарынь. Насельніцтва ж рэгіёна паміж нізоўямі Гарыні і сярэднім цячэннем Ясельды, відавочна, спачатку не ўваходзіла ні ў валынянскі, ні ў дрыгавіцкі саюзы, а заставалася драўлянскім. Межы паміж племяннымі саюзамі не былі выразнымі. Так, у раёне Бярэсця і Камянца жылі валыняне, дрыгавічы, ятвягі (101, *115, 119, 271;* 104, рыс. *18*). У вобласці рассялення драўлян сустракаліся пасяленні дрыгавічоў (101, рыс. *118)*, а ў раёнах, дзе пераважалі дрыгавічы, жылі асобныя групы валынян ці драўлян (101, *115, 119, 121*).

Сярод сярэдневяковых меж патрабуе пэўных каментарыяў граніца паміж Берасцейскай і Пінскай валасцямі ў XI—XIV стст. У навуковай літаратуры яе звычайна атаясамліваюць з заходняй граніцай Пінскага княства ў XV—XVI стст. (70, *21)*, хоць апошняя ў XIV—XV стст. мянялася (174). У XI—XIII стст. на ўсходзе Берасцейскай воласці знаходзіўся г. Здзітаў, які быў размешчаны ў межах сучаснай в. Старамлынне Драгічынскага раёна (111), непадалёку ад сучасных меж

з Бярозаўскім і Іванаўскім раёнамі. Усходняя граніца Берасцейскай воласці ў той час, на нашу думку, праходзіла на ўсход ад акругі г. Здзітава, г. зн. тых сельскіх паселішчаў, якія непасрэдна былі звязаны з гэтым горадам. Акруга Здзітава, як відаць з яго размяшчэння, уключала значную частку сучаснага Драгічынскага і Бярозаўскага, а таксама заходнія ўскраіны Іванаўскага раёнаў.

Вызначаная мяжа паміж Берасцейскай і Пінскай валасцямі супадае з сучаснай мяжой паміж заходне- і ўсходнезагародскай дыялектнымі зонамі.

Адзначым супадзенні іншых меж: а) паўночная мяжа паўночна-брэсцкіх гаворак — граніца Берасцейскай зямлі і Пінскага княства з Чорнай Руссю і Клецкім княствам у XII—XIV стст., Берасцейскага ваяводства з Навагрудскім у XVI—XVIII стст.; б) паўночная мяжа радастаўскай мікразоны — участак паўночна-ўсходняй граніцы Холмскай зямлі ў XIV—XVIII стст.; в) паўночная мяжа сярэднепагарынскіх гаворак — паўночная граніца Дубровіцкага княства ў XII—XV стст.; г) паўднёва-ўсходняя мяжа загародскіх гаворак — граніца Пінскага княства з княствамі Гарадзецкім і Дубровіцкім; д) усходняя мяжа брэсцка-кобрынскай мікразоны — усходняя граніца Кобрынскага княства ў XV—XVI стст.

На фарміраванне дыялектных мікразон, відаць, найбольш істотны ўплыў аказалі такія фактары, як падзел у мінулым вывучаемай вобласці паміж феадальнымі і адміністрацыйнымі адзінкамі, сферамі ўплыву гарадоў і мястэчак, адасабленне асобных рэгіёнаў лясными ці балотнымі масівамі, мікраміграцыйныя рухі розных эпох, сувязі асобных рэгіёнаў з суседнімі абласцямі.

Прыведзеныя супадзенні племянных, феадальных і адміністрацыйных граніц з сучаснымі дыялектнымі межамі і пучкамі ізаглос, відавочна, не выпадковыя. Нягледзячы на розныя міграцыйныя рухі і ўплывы, працэсы моўнай інтэграцыі і дыферэнцыяцыі, гэтыя межы не сцёрліся канчаткова, яны хутчэй за ўсё адлюстроўваюць факты моўнай гісторыі даследуемага краю.

Сучасныя загародскія гаворкі з'яўляюцца вынікам шматвяковага гістарычнага развіцця. На іх фарміраванне аказала значны ўплыў развіццё гэтых гаворак як

пэўных сістэм, што адносіцца да заканамернасцей унутранага развіцця моўна-дыялектных адзінак, узаемасувязь паміж асобнымі групамі даследуемага кантыніума, сувязь з гаворкамі іншых абласцей, у першую чаргу суседніх, міграцыйныя рухі розных эпох, уваходжанне частак Брэсцка-Пінскага Палесся ў склад розных племянных саюзаў, княстваў, дзяржаў, зямель, адміністрацыйных адзінак, уплыў старадаўніх гарадоў і буйных мястэчак як эканамічных цэнтраў, наяўнасць у некаторых месцах прыродных рубяжоў тыпу лясных і балотных масіваў.

Даследаванне загародскіх гаворак Палесся паказвае складанасць іх унутранай структуры. Яны перш за ўсё характарызуюцца ўнутраным адзінствам. Характэрныя іх асаблівасці ў рознай ступені пашыраны ў гаворках суседніх абласцей, а таксама ў іншых славянскіх дыялектах.

ЛІТАРАТУРА

1. Аляхновіч М. М. З лексікі вёскі Валішча Пінскага раёна.— У кн.: Народная лексіка. Мн.: Навука і тэхніка, 1977.

2. Арашонкава Г. У. З дзеяслоўнай лексікі гаворак брэсцка-пінскага арэала.— У кн.: З народнага слоўніка. Мн.: Навука і тэхніка, 1975.

3. Бернштейн С. Б. Очерк сравнительной грамматики славянских языков.— М.: Изд-во АН СССР, 1961.

4. Бируля И. В. Северная граница распространения «парных» курганов.— У кн.: Археологические открытия 1965 г. М.: Наука, 1966.

5. Бірыла М. В. Вынікі пераходу *е(<е, ь)* у *о* і з'явы, звязаныя з ім у беларускай мове.— Prace filologiczne. Warszawa, 1964, t. 18, cz. 2.

6. Бірыла М. В. Парныя па цвёрдасці-мяккасці *д—дз'(д')*, *т—ц'(т')* у беларускіх гаворках.— У кн.: Працы Інстытута мовазнаўства АН БССР. Мн.: Выд-ва АН БССР, 1960, вып. VII.

7. Бірыла М. В. Рэфлексы агульнаславянскіх *о, ъ, ь, е, ѣ* ў беларускіх гаворках.— У кн.: Працы Інстытута мовазнаўства АН БССР. Мн.: Выд-ва АН БССР, 1959, вып. VI.

8. Бірыла М. В. Этымалагічна мяккія губныя зычныя ў беларускіх народных гаворках.— У кн.: Працы Інстытута мовазнаўства АН БССР. Мн.: Выд-ва АН БССР, 1957, вып. III.

9. Бобровский П. О. Гродненская губерния.— Материалы для географии и статистики России, собранные офицерами генерального штаба. СПб, 1863, ч. I, II.

10. Брайчевський М. Ю. Походження Русі.— Київ: Наукова думка, 1968.

11. Брок О. Очерк физиологии славянской речи.— Энциклопедия славянской филологии. СПб, 1910, вып. 5.2.

12. Булгаковский Д. Г. Пинчуки. Этнографический сборник.— Записки Русского географического общества по отделению этнографии. СПб, 1890, т. 13, вып. 3.

13. Быковский В. Свадебные обряды и песни в Пинском уезде Минской губернии. О празднике купалы. Праздник куста.— Памятная книжка Виленского генерал-губернаторства на 1868 год. СПб, 1868.

14. Бычков И. Материалы по народному говору Кобринского уезда Гродненской губернии.— РФВ, 1908, т. 59, № 1—2.

15. Бычко-Машко И. Е. Сборник народных песен, запи-

санных в поселке Калюга-Комарно Рогозняиской волости Кобринского уезда Гродненской губернии.— Сб. ОРЯС, СПб, 1911, т. 89, № 4.

16. Вайтовіч Н. Т. Ненаціскны вакалізм народных гаворак Беларусі.— Мн.: Навука і тэхніка, 1968.

17. Вештарт Г. Ф. Лінгвагеаграфічная дыферэнцыяцыя Прыпяцкага Палесся (на матэрыяле назваў ежы): Дыс. канд. філал. навук.— Мн., 1969.

18. Вештарт Г. Ф., Выгонная Л. Ц., Лучыц-Федарэц І. І., Мартынаў В. У. Лексіка Палесся ў прасторы і часе.— Мн.: Навука і тэхніка, 1971.

19. Войтович Н. Т. Ненаголошений вокалізм брестсько-пінських говірок.— У кн.: XII Республіканська діалектологічна нарада. Тези доповідей. Київ: Наукова думка, 1965.

20. Выгонная Л. Ц. Палеская земляробчая лексіка (тыпалагічная і арэальная дыферэнцыяцыя): Дыс. канд. філал. навук.— Мн., 1969.

21. Выгонная Л. Ц., Лучыц-Федарэц І. І. Некаторыя аспекты вывучэння лексікі брэсцка-пінскіх гаворак.— У кн.: Беларуская мова і літаратура ў ВНУ: Тэз. Рэспубліканскай навукова-метадычнай канферэнцыі. Брэст, 1971.

22. Гапанович П. Н., Мацкевич Ю. Ф. О классификации белорусских диалектов.— ВЯ, 1959, № 6.

23. Гапановіч П. М., Мацкевіч Ю. Ф. Пытанні класіфікацыі сучасных беларускіх гаворак.— У кн.: Працы Інстытута мовазнаўства АН БССР. Мн.: Выд-ва АН БССР, 1959, вып. VI.

24. Гильтебрандт П. Сборник памятников народного творчества в Северо-Западном крае.— Вильна, 1866, вып. I.

25. Говори української мови (збірник текстів).— Київ: Наукова думка, 1977.

26. Груцо О. П. Про лексичні особливості поліських говірок (на матеріалах «Дыялекталагічнага атласа беларускай мовы»).— У кн.: Праці XII Республіканської діалектологічної наради. Київ: Наукова думка, 1971.

27. Дзендзелівський Й. О. Конспект лекцій з курсу української діалектології.— Ужгород: Вид-во Ужг. ун-ту, 1965, ч. I.

28. Дзендзелівський Й. О. Українсько-західнослов'янські лексичні паралелі.— Київ: Наукова думка, 1969.

29. Діалектологічний атлас української мови, т. I, II (у друку).

30. Дмитриев М. А. Собрание песен, сказок, обрядов и обычаев крестьян Северо-Западного края.— Вильна, 1869.

31. Довнар-Запольский М. В. Песни пинчуков. С приложением карты северной части уезда и статьи о говоре.— Белорусское Полесье. Сборник этнографических материалов. Киев, 1895, 1896, вып. 1, № 1, 2, 4, 6, 9.

32. Дурново Н. Н., Соколов Н. Н., Ушаков Д. Н. Опыт диалектологической карты русского языка в Европе с приложением очерка русской диалектологии.— РФВ. М., 1915, т. 34, вып. 4.

33. Дыялекталагічны атлас беларускай мовы.— Мн.: Выд-ва АН БССР, 1963.

34. Дэже Л. Очерки по истории закарпатских говоров.— Будапешт: Изд-во Академии наук Венгрии, 1967.

35. Жилко Ф. Т. Нариси з діалектології української мови.— Київ: Радянська школа, 1966.

36. Жывое слова.— Мн.: Навука і тэхніка, 1978.

37. Залеський А. М. Вокалізм південно-західних говорів української мови.— Київ: Наукова думка, 1973.

38. Залеський А. М. Континуанти праслов'янських *ę та *ǫ (після м'яких приголосних) у говорах української мови.— Мовознавство, 1970, № 3.

39. Залеський А. М. Розрізнення *а—е* після середньоязикового *й* у південно-західних говорах української мови.— Мовознавство, 1971, № 4.

40. Зеленин Д. К. Описание рукописей ученого архива императорского Русского географического общества.— Пг., 1914—1916, вып. 1—3.

41. Зданцевич И. К. Народные песни местечка Селец Пружанского уезда Полесского воеводства (Западная Белоруссия).— Труды Государственного института музыкальной культуры. М.: Государственное музыкальное издательство, 1931.

42. З народнага слоўніка.— Мн.: Навука і тэхніка, 1975.

43. Зянько І. І. Важнейшыя асаблівасці фанетычнай сістэмы і граматычнага ладу гаворак Пружанскага раёна Брэсцкай вобласці.— У кн.: Працы Інстытута мовазнаўства АН БССР. Мн.: Выд-ва АН БССР, 1957, вып. III.

44. Иванов В. В. Историческая фонология русского языка.— М.: Просвещение, 1968.

45. Иванов В. В. Теория фонологических различительных признаков.— У кн.: Новое в лингвистике. М.: Изд-во иностр. лит-ры, 1962, вып. II.

46. Иордан. О происхождении и деяниях гетов. Getica.— М.: Изд-во восточной лит-ры, 1960.

47. Калнынь Л. Э. Развитие корреляции твердых и мягких согласных фонем в славянских языках.— М.: Изд-во АН СССР, 1961.

48. Карпинский М. Говор пинчуков.— РФВ. Варшава, 1888, вып. 12, № 1—2.

49. Карский Е. Ф. Белорусы. Введение к изучению языка и народной словесности.— Виленский временник. Вильна, 1904, книга I.

50. Карский Е. Ф. Белорусы. Язык белорусского племени.— М.: Изд-во АН СССР, 1955, вып. 1.

51. Карский Е. Ф. К вопросу об отвердении звуков *е* и *і* в малорусском наречии.— У кн.: Изборник Киевский, посвященный Т. Флоринскому. Киев, 1904.

52. Карский Е. Ф. Некоторые редкие особенности белорусского наречия в Сокольском уезде Гродненской губернии.— У кн.: Труды по белорусскому и другим славянским языкам. М.: Изд-во АН СССР, 1962.

53. Карский Е. Ф. Обзор звуков и форм белорусской речи.— М., 1885.

54. Карский Е. Ф. Отчет о поездке в Белоруссию в течение летних месяцев 1903 года.— У кн.: Труды по белорусскому и другим славянским языкам. М.: Изд-во АН СССР, 1962.

55. Карский Е. Ф. Этнографическая карта белорусского племени.— Труды комиссии по изучению племенного состава населения России. Пг., 1917, вып. 2.

56. Климчук Ф. Д. До питання про зони рефлексації *е, ь, ъ>а* після твердих приголосних в слов'янських діалектах.— У кн.: Культура та побут населення українських Карпат (Матеріали Республіканської наукової конференції). Ужгород: Вид-во Ужг. ун-ту, 1973.

57. Климчук Ф. Д. Песенная традиция западнополесского села Симоновичи.— У кн.: Славянский и балканский фольклор. М.: Наука, 1978.

58. Крачковский Ю. Ф. Быт западнорусского селянина.— Чтения в имп. Московском обществе истории и древностей российских при Московском ун-те. М., 1873, кн. 4.

59. Крывіцкі А. А. Наша родная мова. Выданне трэцяе, дапрацаванае.— Мн.: Народная асвета, 1973.

60. Кузнецова А. М. Изменения гласных под влиянием соседних мягких согласных.— М.: Наука, 1965.

61. Куриленко В. М. Животноводческая лексика Полесья в ареальном аспекте.— У кн.: Полесский этнографический сборник. М.: Наука (у друку).

62. Кухаренко Ю. В. Могильник Брест-Тришин.— М.: Наука, 1980.

63. Кухаренко Ю. В. Полесье и его место в процессе этногенеза славян.— У кн.: Полесье. М.: Наука, 1968.

64. Кухаренко Ю. В. Средневековые памятники Полесья.— Свод археологических источников. М.: Изд-во АН СССР, 1961, вып. Е I — 57.

65. Лексика Полесья. Материалы для полесского диалектного словаря.— М.: Наука, 1968.

66. Лизанець П. М. Особливості граматичної будови говірок двох населених пунктів Пінського району Брестської області БРСР.— У кн.: Тези доповідей V міжвузівської Республіканської славістичної конференції 25—30 вересня 1962 р. Ужгород: Вид-во Ужг. ун-ту, 1962.

67. Лінгвістычная геаграфія і групоўка беларускіх гаворак.— Мн.: Навука і тэхніка, 1968, 1969.

68. Лучыц-Федарэц І. І. Адказы на 3, 4, 8, 10, 11 пытанні «Анкеты».— У кн.: Беларуска-ўкраінскія ізалексы. Мн., 1971.

69. Лучыц-Федарэц І. І. Лінгвагеаграфічнае размеркаванне і рэканструкцыя адной групы лексікі Палесся (жыллё і гаспадарчыя будынкі): Дыс. канд. філал. навук.— Мн., 1973.

70. Лысенко П. Ф. Города Туровской земли.— Мн.: Наука и техника, 1974.

71. Матеріали з антропології України.— Київ: Вид-во АН УРСР, 1960, вып. 1.

72. Мацкевіч Ю. Ф. Марфалогія дзеяслова ў беларускай мове.— Мн.: Выд-ва АН БССР, 1959.

73. Міхайлаў П. А. Аб адной фанетычнай асаблівасці паўночналагішынскіх гаворак.— У кн.: Тыпалогія і ўзаемадзеянне славянскіх моў і літаратур. Мн.: Выд-ва БДУ, 1973.

74. Михальчук К. П. Наречия, поднаречия и говоры Южной России в связи с наречиями Галичины.— У кн.: Труды этнографическо-статистической экспедиции в Западно-Русский край. Юго-западный отдел. СПб, 1872, т. 7.

75. Мяцельская Е. С., Камароўскі Я. М. Беларуская дыялекталогія. Хрэстаматыя.— Мн.: Выд-ва БДУ, 1979.

76. Назарова Т. В. З вокалізму брестського ареалу.— У кн.: Праці XII Республіканської діалектологічної наради.— Київ: Наукова думка, 1971.

77. Назарова Т. В. Из наблюдений над междиалектными контактами (к понятию сопротивления системы).— У кн.: Общеславянский лингвистический атлас. Материалы и исследования. 1973. М.: Наука, 1975.

78. Назарова Т. В. К проблеме украинского икавизма.— ВЯ, 1971, № 2.

79. Назарова Т. В. Некоторые особенности вокализма украинских правобережнополесских говоров.— У кн.: Полесье. М.: Наука, 1968.

80. Назарова Т. В. Связи говоров юго-западной Брестчины с соседними ареалами.— У кн.: Совещание по Общеславянскому лингвистическому атласу (Саратов, 28—31 мая 1968 г.): Тез. докл. М., 1968.

81. Народнае слова.— Мн.: Навука і тэхніка, 1976.

82. Народная лексіка.— Мн.: Навука і тэхніка, 1977.

83. Народная словатворчасць.— Мн.: Навука і тэхніка, 1979.

84. Нарысы па беларускай дыялекталогіі.— Мн.: Навука і тэхніка, 1964.

85. Нидерле Л. Славянские древности.— М.: Изд-во иностр. лит-ры, 1956.

